Протоколы допросов репатриантов сотрудниками МВД и МГБ по месту жительства (г. Минск и Минская область) являются документами, фиксирующими прибытие репатриированного гражданина к месту проживания. Они составлялись во время второго этапа проверки репатриантов, после прохождения которого они могли получить вид на жительство [7, с. 126]. Протоколы допросов содержат самые разнообразные, зачастую уникальные сведения о положении мирного населения на оккупированных территориях СССР, об условиях проживания остарбайтеров в Германии, о характере выполняемых ими работ, взаимоотношениях с партизанами, подпольщиками, немцами и др. Следует отметить, что некоторые граждане допрашивались неоднократно, и в каждом последующем протоколе допроса могли содержаться показания, опровергающие информацию из предыдущих протоколов. В качестве исторического, историко-биографического, генеалогического источников эти документы возможно использовать с учетом того обстоятельства, что в своих показаниях репатрианты иногда пытались скрыть или изменить некоторые факты своей биографии. В таких случаях к фильтрационному делу часто прилагались допросы сотрудниками органов госбезопасности граждан, знакомых с репатриантом и могущих уточнить, подтвердить или опровергнуть его показания.

Следует отметить, что на репатриантов — бывших военнопленных в фильтрационном деле заводился особый «Опросный лист», заполнявшийся сотрудником отдела контрразведки «Смерш», в котором фиксировались, помимо информации о личности гражданина, также сведения о прохождении службы в Красной Армии, обстоятельства, время и место попадания в плен опрашиваемого гражданина, подробные обстоятельства пребывания в плену (в каком лагере и сколько времени содержался, допрашивался ли немецкими спецслужбами, служил ли в вооруженных формированиях и административно-хозяйственных органах противника, кто может подтвердить показания и т. п.). На гражданских лиц такие опросные листы не заводились.

В рамках контрразведывательной работы все репатриированные граждане опрашивались также на предмет любых контактов со спецслужбами нацистской Германии и западных государств, т. е. подвергались ли они каким-либо задержаниям, арестам, допросам со стороны немецкой полиции, гестапо, СД, органов оккупационной администрации союзных государств на территории Германии и государств Европы. Соответствующие опросные пункты присутствуют как в анкетах и регистрационных листах, так и в протоколах допросов. Информация о том, войсками какого союзного государства (Франции, Англии, США) был освобожден опрашиваемый, подчеркивалась в анкетах, листах и протоколах допросов цветными карандашами. Для изучения организации работы органов государственной безопасности БССР и СССР интерес представляют особые пометы на фильтрационных делах, сообщающие о постановке на оперативно-справочный учет граждан, побывавших в американской, французской и английской зонах оккупации Германии. Граждане, находящиеся на оперативно-справочном учете органов госбезопасности, в соответствии с этими пометами могли быть ограничены в правах выезда за границу, устройстве на работу в некоторые учреждения и предприятия [1, с. 42]. Данная категория граждан рассматривалась как возможные агенты иностранных разведслужб. На некоторых фильтрационных делах стоят также дополнительные пометы о снятии граждан с оперативно-справочного учета.

Особенность фонда 1717 — наличие в фильтрационных делах большого количества подлинных личных документов, выдававшихся гражданам на оккупированных территориях СССР или на месте принудительных работ в европейских государствах. Это удостоверения личности, рабочие карты, справки, пропуска на предприятия. Эти документы подшивались в качестве приложений к фильтрационным делам во время составления регистрационных листов и являются ценным источником по вопросам правового и социального статуса населения оккупированных нацистами территорий СССР, принудительных миграций населения и экономической политики нацистской Германии. Рабочие книжки остарбайтеров позволяют установить профиль предприятия, на котором он трудился, его трудовую специальность, перио-

дичность его перемещения между различными предприятиями и государствами.

Еще одной особенностью фонда 1717 является наличие во многих фильтрационных делах переписки органов государственной безопасности Республики Беларусь с гражданами, государственными архивами, Белорусским республиканским фондом «Взаимопонимание и примирение» по вопросам, связанным с выплатами компенсаций жертвам нацистских репрессий, узникам нацистских концлагерей, тюрем, трудовых лагерей, гетто и других мест принудительного содержания и принудительного труда, расположенных как на территории нацистской Германии и ее союзников, так и на территории оккупированных нацистами государств Европы. Эти документы, относящиеся к 1990-м — 2000-м гг., также являются важными источниками по изучению последствий Великой Отечественной войны, ее влиянии на международные отношения и гуманитарно-компенсационную деятельность во второй половине XX — начале XXI в.

В названии фонда 1717 отражено наличие в нем трофейных документов — личных карточек военнослужащих Красной Армии, заводившихся на них в немецких лагерях военнопленных. Всего в фонде в наличии 96 ед. хр. с карточками на 10 225 бывших военнопленных (15 285 карточек) [8]. Здесь собраны карточки военнопленных, либо проживавших до войны на территории г. Минска и Минской области, либо имевших там близких родственников. Вместе с карточками, многие из которых снабжены фотоснимками, в делах подшита текущая переписка органов госбезопасности БССР по вопросам постановки на оперативный учет и снятия с него граждан, бывших в плену у немцев. Из переписки видно, что карточки, как и фильтрационные дела, активно использовались органами госбезопасности республики для оперативно-розыскной и контрразведывательной работы. Если в фонде были фильтрационное дело и карточка военнопленного, относящиеся к одному и тому же лицу, сотрудники органов госбезопасности подшивали карточку в фильтрационное дело в качестве приложения, сопровождая эти перемещения соответствующими документами. В период активной разработки (1940 — 1950-е гг.) все карточки для удобства оперативной работы были снабжены переводом на русский язык.

Карточки военнопленных, содержащаяся в них информация и перспективы ее изучения были достаточно подробно рассмотрены в 2004 г. (в период их хранения в архиве КГБ) Е. В. Казаковой [9]. Отметим, что хотя эти карточки еще до передачи в ГАМО были изучены и отсканированы сотрудниками архива КГБ, а информация из них была использована для создания базы данных «Советские военнопленные», которая сейчас находится в открытом доступе на Интернет-сайте Объединения «Саксонские мемориалы» [10], данный документальный комплекс по-прежнему остается уникальным источником генеалогической информации, а также представляет большую историко-

иллюстративную (музейную, демонстрационную) ценность, т. е. важен как объект выставочной деятельности.

Важно подчеркнуть, что в отношении к документам фонда 1717 можно одновременно применять определения «уникальный» и «массовый». Один и тот же документ, например регистрационный лист или анкета, может являться уникальным источником для изучения отраженного в нем факта или судьбы конкретного человека, и одновременно быть одним из многих массовых источников (регистрационных листов или анкет) при изучении такого явления, как массовые депортации мирного населения в годы Второй мировой войны и их последствия [7, с. 124]. Как к массовому источнику к фильтрационным делам применимы формализованные методы исследования с использованием методик демографии, статистики, социологии.

Потенциальные методы обработки документов фонда 1717 можно разделить на две группы — с выработанным и строго определенным формуляром (регистрационные листы, анкеты, карточки военнопленных) и без формуляра — протоколы допросов репатриантов и другие документы. Информация анкет и регистрационных листов из фонда 1717, как документов, имеющих определенный формуляр, легко может быть формализована и исследована с применением количественных и информационных методов исторического исследования. Применение этих методов к столь большому количеству анкет и листов (несколько десятков тысяч) позволит получить репрезентативные результаты, которые могут быть использованы при обобщающих исследованиях в масштабах Беларуси и стран бывшего Советского Союза. Качество (достоверность) информации, содержащейся в регистрационных листах и анкетах, следует оценивать как высокое, т. к. она подвергалась тщательной и многоступенчатой проверке со стороны сотрудников органов госбезопасности. Относительно карточек военнопленных следует отметить, что обработка их с использованием современных информационных технологий уже была успешно осуществлена сотрудниками архива КГБ в рамках соглашения с Объединением «Саксонские мемориалы» [9, 10].

Таким образом, фильтрационные дела фонда 1717 имеют большой потенциал для историков и исследователей. Следует учитывать, что важным фактором при работе с данным фондом является необходимость соблюдения требований «Инструкции о порядке доступа к архивным документам, содержащим сведения, относящиеся к личной тайне граждан», утвержденной постановлением Минюста Республики Беларусь № 132 от 24 мая 2012 г. 75-летний срок с даты создания большинства документов фонда 1717 еще не истек, что налагает определенные ограничения на использование данных документов в исторических исследованиях.

Источники и литература


1. Ковальский, М. П., Ченцов, В. В. «Фільтраційні справи» — невідомі джерела державних архівів / М. П. Ковальский, В. В. Ченцов // Архіви України. — 1993. — № 1/3. — С. 35—44;
2. Король, О. Фільтраційні справи та листи примусових робітників Третього рейху у Держархіві Київської області : коротка довідка / О. Король // Архіви України. — 2005. — № 1—3. — С. 401—402; Карпова А. Документи з фільтраційних справ остарбайтерів Херсонщини / А. Карпова, Л. Виноградова // Архіви України. — 2005. — № 1—3. — С. 431—437 и др.
3. Тимонова, А. В. О пребывании белорусских крестьян на принудительных работах в рейхе (по материалам регистрационных списков репатриированных советских граждан: январь—май 1945) / А. В. Тимонова // Беларусь і Германія: гісторыя і сучаснасць: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Мінск 17 красавіка 2009 г. / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.), С. Я. Новікаў (нам. гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: МДЛУ, 2010. — Вып. 8. — С. 114—118.
4. Государственный архив Минской области (ГАМО). — Фонд 1717. — Оп. 1. Историко-архивная справка к фонду.
5. Полян, П. М. Жертвы двух диктатур. Советские военнопленные и остарбайтеры в Третьем рейхе и их репатриация / П. М. Полян. — М., 1996. — 442 с.; Белорусские остарбайтеры. Историко-аналитическое исследование / авторы: Г. Д. Кнатько, В. И. Адамушко, Н. А. Бондаренко, В. Д. Селеменев; под ред. Г. Д. Кнатько. — Минск, 2001. — 336 с.
6. Карапузова, А. Из истории формирования архивных фондов Государственного архива Брестской области /А. Карапузова // Архивы и делопроизводство. — 2012. — № 2. — С. 97—104.
7. Меляков, А. В. Фильтрационные дела Государственного архива Харьковской области как массовый исторический источник / А. В. Меляков // Актуальні проблеми вітчизняної та всесвітньої історії: Збірник наукових праць молодих вчених. — Харків, 1998. — С. 124 — 127.
8. Карточки военнопленных // Государственный архив Минской области (ГАМО). — Фонд 1717. — Оп. 1. — Д. 1768, 9932, 9933, 54820.
9. Казакова, Е. В. Электронная база данных «Советские военнослужащие»: новые возможности исследования / Е. В. Казакова // Советские и немецкие военнопленные в годы Второй мировой войны. Дрезден; Минск, 2004. — С. 126-161.
10. База данных «Военнопленные» // Центр документации при Объединении «Саксонские мемориалы» в память жертвам политического террора [Электронный ресурс]. — 2012. — Режим доступа: http://www.dokst.ru/node/1118. — Дата доступа: 19.09.2012.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.10.2012*

**А. М. Таратута,**
*выкладчык спецыяльных дысцыплін*
*УА «Навапольскі дзяржаўны*
*аграрна-эканамічны каледж»,*
*аспірант гістарычнага факультэта БДУ,*
*магістр гістарычных навук;*
e-mail: liolikmolo(g),mail.ru

# СПРАВАВОДСТВА МЯСЦОВЫХ СУДОВЫХ І ПРАКУРОРСКІХ ОРГАНАЎ, ЯКІЯ ДЗЕЙНІЧАЛІ НА ТЭРЫТОРЫІ ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ Ў 1921—1939 гг.

Згодна з другім артыкулам Рыжскага дагавора ад 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адышла амаль палова сучаснай тэрыторыі Беларусі. Каб захаваць на далучаных тэрыторыях непарушнасць рэжыму, польскія ўлады пачалі ствараць карна-надзорныя (дзяржаўную паліцыю) і судовыя органы.

Паліцыя (створаная на падставе ўхвалы Рэспублікі Польшчы ад 24 ліпеня 1919 г.) з'яўлялася дзяржаўным органам службы бяспекі, які займаўся аховай грамадскага парадку і бяспекі, а таксама барацьбой з рэвалюцыйнымі і антыўрадавымі элементамі. Аднак дзейнасць паліцыі была б няпоўнай і нерэзультатыўнай без існавання пракурорскіх і судовых органаў, якія складалі трэцюю галіну ўлады (судовую).

Такім чынам, мэтай дадзенага даследавання з'яўляецца характарыстыка асобных відаў дакументаў, якія ствараліся ў дзейнасці судовых органаў і пракуратуры, устанаўленне нормаў і патрабаванняў да іх афармлення, а таксама аналіз спецыфікі працы канцылярскай службы судовых органаў і пракуратуры, найбольш значных напрамкаў яе дзейнасці.

Асноўным дакументам судовага справаводства Польшчы ў 20-х — 30-х гг. XX ст. з'яўляўся пратакол. Існавала некалькі відаў пратаколаў, кожны з якіх меў свае асаблівасці. У той жа час, усе віды пратакола мелі аднолькавую ўніфікаваную і стандартызаваную будову, што дазваляла без цяжкасцей адрозніваць іх адзін ад другога нават пры адсутнасці таго ці іншага рэквізіту. Такім чынам, на падставе аналізу архіўных дакументаў можна выдзеліць наступныя віды пратакола, акрамя звычайнага:

пратакол прыняцця вуснага паведамлення пра злачынства;

пратакол допыту сведак;

пратакол агляду;

пратакол судовага разбору справы.

Тэкст пратаколаў, як і звычайна, дзяліўся на дзве часткі: уводную і асноўную. У першай частцы, як правіла, указвалася наступнае:

дата і месца напісання пратакола;

папярэджанне аб адказнасці за ілжывыя звесткі ці абвінавачванні;

даныя пра асобу, што падае заяву (іск) у суд ці пракуратуру.

Большасць пратаколаў пачыналася наступным чынам: «Dnia 21 lipca 1933 a godzinie 20 do lokalu … zgłosił się …» [1]. Далей ішла поўная падача звестак аб асобе, што звярнулася да суда, з указаннем прычын і мэт яе звароту. У далейшым гэта інфармацыя магла выкарыстоўвацца для пэўнага аналізу дзейнасці суда ці пракуратуры за нейкі перыяд часу.

Асноўная частка пратакола ўтрымлівала тэкст звароту грамадзяніна, што звярнуўся ў суд, з указаннем усіх абставін здзейсненага супраць яго злачынства [2]. Тэкст запісваўся са слоў пацярпеўшага, таму ўсе даныя захоўваліся ажно да судовага пасяджэння ў першапачатковым стане. Гэта акалічнасць нярэдка дапамагала пазбегнуць суровага пакарання ці ўвогуле адхіліць судовы іск і прыцягнуць да адказнасці таго, хто гэты іск падаваў.

Пасля таго, як зварот да суда быў поўнасцю запісаны, у пратаколе адводзілася месца для абмеркавання заявы. Завяршаўся ж пратакол наступным выразам: «Na tem protokuł zakończyłem i przed podpisaniem odczytałem» [3]. Затым злева ставіўся рэгістрацыйны штамп, які вызначаў дату падання заявы, дату складання пратакола і нумар справы, да якой гэты пратакол падшываўся, а таксама подпіс супрацоўніка суда, які прыняў заяву [4]. Справа ставіўся подпіс заявадаўцы і іншых прысутных пры паданні заявы асоб. Рэгістрацыйны штамп гродскага суда меў наступнае афармленне [5]:

Sekretariat Sądu Grodzkiego
w Mołodecznie
Wpłyneło dnia_____ 193_ r.
Nr. sprawy______________

Разгледжанае вышэй афармленне і склад рэквізітаў пратакола прыняцця вуснага паведамлення пра злачынства было найбольш тыповым і для астатніх відаў, акрамя пратакола судовага разбору справы. Такія дакументы вяліся спецыяльна прызначанай асобай (пратакулянтам) і мелі строга вызначаны склад рэквізітаў і аднолькавае афармленне незалежна ад разглядаемай справы. Гэта надавала такім пратаколам статус ідэальнага дакумента, які ў наш час з'яўляецца самай каштоўнай крыніцай інфармацыі. Можна выдзеліць наступныя асаблівасці пратакола разбору судовай справы.

Па-першае, пратакол складаўся спецыяльна прызначаным для гэтага сакратаром-пратакулянтам, аднак не на аснове рукапісных ці стэнаграфічных запісаў, а непасрэдна падчас судовага працэсу [6]. Сакратары з'яўляліся дзяржаўнымі служачымі, мелі вышэйшую юрыдычную адукацыю і былі прымацаваны толькі да аднаго суда. Па-другое, такі пратакол падлягаў абавязковаму завярэнню суддзёй, які вёў справу, а таксама свой подпіс на дакуменце ставіў сам складальнік (сакратар-пратакулянт) [7]. Дапускалася прастаўленне на пратаколе судовага разбору справы подпісаў тых асоб, што прысутнічалі пры яго складанні (як правіла, сведкі здарэнняў ці правапарушэнняў) [8]. І, нарэшце, трэцяй асаблівасцю пратакола судовага разбору справы была яго будова. Гэты дакумент, у адрозненні ад пратакола «грамадзянскага», утрымліваў

толькі асобныя, спецыфічныя рэквізіты, характэрныя для такога дакумента. Гэта тлумачыцца тым, што асноўнай мэтай судовага пратакола было засведчанне і апісанне падзеі (злачынства) як з пункту погляду непасрэдна пацярпеўшага, так і з пунктаў погляду самога злачынцы і органа правасуддзя, прычым апошні якраз і вырашаў лёс першых двух [9].

Акрама пратаколаў падчас дзеяння судовых органаў ствараліся і такія дакументы, як пастанова, распараджэнне і прысуд (прыгавор). Апошні са згаданых дакументаў з'яўляецца спецыфічным судовым дакументам, якія будуць разгледжаны ніжэй. Пастанова і распараджэнне — асноўныя распарадчыя дакументы судовых органаў.

Пастановы выдаваліся толькі на ўзроўні акруговых судоў. Для судоў гродскіх распарадчым дакументам кшталту пастановы з'яўлялася распараджэнне. Такім чынам стваралася пэўная іерархія распарадчай дакументацыі, якая была выклікана падначаленасцю судоў адзін аднаму (пастанова мела большую юрыдычную сілу ў гродскіх судах, а распараджэнне — у павятовых). Як і пастанова, распараджэнне мела некалькі асноўных агульнапрынятых для распарадчай дакументацыі рэквізітаў, а таксама асаблівую будову тэксту, характэрную толькі для ўстаноў судовай улады Польшчы.

Так, асноўнымі рэквізітамі пастановы былі [10]:

найменне ўстановы, якая выдае дакумент;

назва віду і нумар дакумента;

тэкст;

месца і дата выдання;

подпіс.

Тэкст канстатуючай часткі пастановы, як ужо адзначалася, меў асаблівую будову і складаўся з некалькіх частак-пунктаў [11]. Кожны пункт утрымліваў факты, якія служылі асновай для яго выдзялення. Калі той ці іншы пункт выдаваўся на аснове распарадчага дакумента, то ён абавязкова ўтрымліваў спасылку на гэты дакумент з указаннем яго нумара і даты выдання, а таксама загалоўка [12].

Распарадчая частка пастановы ўтрымлівала некалькі ўказанняў для вырашэння таго ці іншага пытання. Звычайна як канстатуючая, так і распарадчая часткі былі выкладзены прытрымліваючыся пэўных правілаў і ўтрымлівалі толькі самую неабходную для прыняцця адпаведнага рашэння інфармацыю. Калі іх параўнаць з сучаснымі дакументамі, то можна сказаць, што гэта былі вельмі грунтоўныя і састаўленыя ў адпаведнасці з усімі нормамі справаводства распарадчыя дакументы. Трэба таксама адзначыць, што кантроль за выкананнем таго ці іншага пункта пастановы ажыццяўляў менавіта сам начальнік (падпракуратар ці пракуратар), які выдаў загад, што, магчыма, прыводзіла да дакладнага і тэрміновага выканання распарадчых рашэнняў.

Указанне на дату і месца складання дакумента, як і ў іншых судовых дакументах, састаўлялася па пастаянным шаблоне (Dnia______19__r. Podprokurator X rejonu Sądu Okręgowego w Wilnie) [13].

Падпісвалася кожная пастанова асабіста начальнікам суда (пракуратарам ці падпракуратарам) [14].

Зразумела, што ў сваёй дзейнасці судам і пракуратуры ў мэтах выканання распарадчых рашэнняў, а таксама для больш хуткага і дакладнага выканання сваіх абавязкаў прыходзілася весці перапіску з іншымі арганізацыямі і дзяржаўнымі органамі. У залежнасці ад спосабу перадачы інфармацыі (кур'ерам ці па тэлефоне) вылучаюцца пісьмы, тэлеграмы і тэлефанаграмы. Паколькі суды, пракуратура і натарыят працавалі менавіта з грамадзянамі, то нельга не ўспомніць тыя дакументы, што ствараліся падчас такой працы. Звароты грамадзян у судовыя органы падзяляюцца на наступныя віды: заявы, просьбы, іскі, скаргі, абгрунтаванні. У афармленні гэтых відаў дакументаў вялікіх адрозненняў не назіралася, за выключэннем спецыфічнай падачы тэксту, што было звязана з асаблівасцямі працэсу судовай вытворчасці.

Такім чынам, дакументы судовых органаў і пракуратуры мелі пэўныя асаблівасці ў сваім афармленні, што тлумачыцца перш за ўсё спецыфікай вядзення судовага справаводства, дзе падчас немагчыма стварыць звычайны дакумент. Адметным з'яўляецца і той факт, што ў судовых органах распаўсюджанай практыкай было выкарыстанне трафарэтнага (друкарскага) тэксту. Гэта дазваляла значна сэканоміць час і сродкі на выданне дакументаў, таму што адпадала неабходнасць складання кожнага дакумента нанова рукапісным спосабам ці на пішучай машынцы.

Пракуратура Польшчы ў 20-я — 30-я гг. XX ст. на тэрыторыі Заходняй Беларусі мела наступныя функцыі:

1. ажыццяўленне аператыўна-пошукавай дзейнасці асоб, якія абвінавачваліся ў супрацьуладных дзеяннях на акупаванай тэрыторыі;

2. правядзенне дазнання і першапачатковага следства;

3. нагляд за адпаведнасцю закону выканання судовых пастаноў;

4. удзел у разглядзе судамі крымінальных і грамадзянскіх спраў, падтрымка дзяржаўнага абвінавачвання.

Нягледзячы на тое, што пракуратура ажыццяўляла сваю дзейнасць на акупаванай тэрыторыі, прынцыпы яе працы заставаліся нязменнымі і былі накіраваны перш за ўсё на забеспячэнне правапарадку на падначаленых тэрыторыях. Пракурорскія супрацоўнікі заўсёды дзейнічалі адкрыта. Грамадзянін, які лічыў, што рашэннем пракуратуры яго інтарэсы ці законныя правы былі парушаны, мог у поўнай меры абскардзіць такое рашэнне ў вышэйстаячых органах суда ці пракуратуры [15].

Акрамя таго, неабходна зазначыць, што патрабаванні пракуратуры падлягалі абавязковаму выкананню ў абазначаны тэрмін незалежна ад грамадзянскага і палітычнага стану асобы, да якой такія патрабаванні прад'яўляліся.

Тыя грамадзяне, прысутнасць якіх была неабходнай для разгледжання справы, абавязаны былі неадкладна з’явіцца ў пракуратуру. І калі такое патрабаванне не выконвалася, то пракуратура мела права прыцягнуць парушальніка да адказнасці і даставіць яго ў прымусовым парадку з дапамогай паліцэйскіх органаў [16].

Пракурорскія і судовыя справы маюць значнае адрозненне ад спраў звычайных. Нават назва пракурорскай справы гучыць інакш (напрыклад, назіральная вытворчасць, ці назіральны працэс) [17]. Каб працэдура фарміравання такіх спраў была больш зразумелай, разгледзім яе на прыкладзе назіральнай вытворчасці па справе аб парушэнні спіртавой манаполіі, якую вёў і фарміраваў віцэ-пракуратар Пракуратуры 10-га раёна ў Маладзечне [18].

Кожная пракурорская справа мела восем асноўных дакументаў і дадаткаў да іх у выглядзе прадстаўленых у пракуратуру разнастайных матэрыялаў і дакументаў па разглядаемай справе, якія збіраліся асабіста істцом:

*Заява да павятовай паліцыі.* Дакумент складаўся самім істцом ад рукі і ўтрымліваў асноўныя кароткія звесткі пра злачынства, якія дазвалялі паліцыі выехаць на месца злачынства і распачаць паліцэйскае следства [19].

*Пратакол прыняцця вуснага паведамлення пра злачынства.* Пасля таго, як пацярпеўшы звяртаўся ў паліцыю, дзе было праведзена першапачатковае следства, зроблены агляд месца злачынства і сабраны матэрыялы па справе, усё гэта перадавалася непасрэдна істцу. Затым пацярпеўшы звяртаўся ў пракуратуру, прадстаўляючы туды ўсе вышэйадзначаныя дакументы. Яго зварот запісваўся сакратаром пракуратуры ў пратакол прыняцця паведамлення пра злачынства і на наступны ці ў гэты ж дзень перадаваўся адказнаму за разгляд дадзенай справы супрацоўніку. У пратаколе ўтрымліваліся звесткі пра пацярпеўшага, а таксама яго асабісты погляд на здзейсненае супраць яго злачынства. Таксама ў гэтым дакуменце ісцец распісваўся ў папярэджанні аб адказнасці за ілжывыя звесткі [20].

*Запіс па допыце.* У адрозненні ад пратакола прыняцця паведамлення пра злачынства, гэты дакумент складаўся не сакратаром, а непасрэдна следчым пракуратуры, які вёў справу. Запіс па допыце быў падобны да сучаснай анкеты і ўтрымліваў пытанні следчага (як правіла, надрукаваныя тыпаграфскім спосабам) і адказы пацярпеўшага. У кожнай справе было некалькі запісаў па допыце. Колькасць такіх дакументаў залежала ад колькасці асоб, якія былі ўцягнуты ў справу, прычым дакументы былі пададзены ў строгім парадку: спачатку допыт пацярпеўшага, затым допыты сведак і, нарэшце, допыт злачынцы [21].

*Пастанова аб пачатку судовай вытворчасці.* Наяўнасць такога дакумента ў справе сведчыла аб тым, што справа перадаецца ў суд і па ёй абавязкова будзе вынесены прысуд. Такая пастанова афармлялася згодна з правіламі афармлення распарадчай дакументацыі ў дзяржаўных установах. Адзначаецца наяўнасць усіх неабходных рэквізітаў, подпісу, пячаткі [22].

*Пратакол допыту сведак* — яшчэ адзін дакумент, дзе запісваліся паказанні асоб, што былі прыцягнуты да справы. Яго адрозненне ад папярэдніх заключалася ў тым, што гэты пратакол быў афіцыйным судовым дакументам (складаўся непасрэдна супрацоўнікамі суда ці суддзёй, які прыняў справу ад пракуратуры) і ўтрымліваў толькі паказанні сведак. Таксама ў дакуменце адзначаецца наяўнасць тыпаграфскага друку і пэўных шаблонаў, якія распрацоўваліся і ўніфікаваліся спецыяльна для дакументацыі такога характару [23].

*Пратакол агляду.* Гэты дакумент адпавядае сучаснаму ордэру на вобыск. Пратакол агляду па сваёй структуры і ўжыванні мала чым адрозніваецца ад пратакола допыту сведак. Неабходна адзначыць, што, як і пратакол агляду, пратакол допыту сведак утрымліваў абавязковую рэзалюцыю суддзі, якая дазваляла допыт якой-небудзь асобы ці вобыск пэўнага месца. Зразумела, што без такой рэзалюцыі-дазволу сведка або ўласнік аглядаемай маёмасці мелі поўнае права адмовіць супрацоўнікам пракуратуры ў іх дзеяннях [24].

*Заключэнне аб спыненні следства.* Гэты дакумент выдаваўся пракурорам у тым выпадку, калі ўсе следчыя дзеянні былі завершаны і справа падлягала разгляду ў судзе. У заключэнні ў адпаведным парадку пракурор абгрунтоўваў заканчэнне следчых дзеянняў і падаваў прашэнне аб вынясенні прыгавору ў адносінах да абвінавачванай асобы [25].

*Рашэнне суда.* Апошні ў пракурорскай справе дакумент, які адначасова яе завяршаў і пачынаў новую судовую справу ці не пачынаў ніякай, калі суддзя палічыў доказы недастатковымі для пачатку судовай вытворчасці. Рашэнне заўсёды афармлялася ў адпаведным парадку і завяралася пракурорам і суддзёй, якія вялі справу [26].

У пачатку кожнага новага месяца сакратар пракуратуры складаў статыстычны дакумент, які насіў назву справаздачы. Гэты дакумент завяраўся пячаткай пракуратуры і подпісам віцэ-пракуратара раёна і накіроўваўся ў Віленскую акруговую пракуратуру. На месцах захоўваліся копіі справаздач за кожны месяц, якія складаліся ў асобныя справы і перадаваліся ў архіў.

Справаздача складалася ў выглядзе табліцы. Радкі табліцы адпавядалі грамадзянскім, крымінальным, следчым справам і справам, звязаным з прэсай. У вертыкальных радках падаваліся прыкметы, па якіх вёўся ўлік спраў у пракуратуры. Сярод іх адзначаюцца такія, як колькасць спраў у мінулым і справаздачным месяцы, колькасць завершаных спраў, колькасць асоб, якія былі арыштаваны, і інш.[27].

Як і ў наш час, адной з немалаважных асоб для грамадзян, што звярталіся ў паліцыю, суд і пракуратуру, быў натарыус. У Польшчы натарыус адыгрываў вельмі значную ролю ў судовай і пракурорскай (назіральнай) вытворчасці. Натарыус не толькі мог даць пэўныя рэкамендацыі, дапамагчы ў састаўленні правільнага звароту ў органы судовай улады, але і з'яўляўся адвакатам абвінавачваемай асобы ў судзе [28]. Да натарыуса таксама звярталіся грамадзяне, якім было неабходна скласці дакумент, што пацвярджаў перадачу

уласнасці ў спадчыну ці ў распараджэнне іншай асобы (дэкларацыю), або дакумент, які дазваляў адной асобе дзейнічаць (выступаць у судзе, напрыклад) ад імя другой (паўнамоцтва) [29].

Трэба адзначыць, што пасада натарыуса была вельмі каштоўнай для кожнага мястэчка, дзе знаходзілася пракуратура і быў суд. Тым больш што на пасаду натарыуса запрашалі толькі людзей адукаваных, якія вельмі добра валодалі ўсімі хітрасплянненнямі юрыдычнай навукі. Што і казаць, натарыус быў запатрабаваны ўсюды, таму тыя, хто меў такую пасаду, мелі таксама значны грашовы прыбытак і людскую павагу.

У кожным павеце меўся гродскі суд, які з'яўляўся судом першай інстанцыі, а таксама павятовая пракуратура, дзе вёўся першасны разгляд крымінальных спраў. У пракуратуру падаваліся іскавыя заявы, пракуратура ж вяла допыт сведак і абвінавачаных у злачынствах асоб. Затым справа пры неабходнасці накіроўвалася ў суд [31].

У склад праўлення гродскага суда ўваходзілі [32]:

пракуратар гродскі;

віцэ-пракуратар;

падпракуратар;

сакратар суда.

Справы ў судах разглядаліся калегіяльна ці аднаасобна ў наступных выпадках:

у складзе аднаго суддзі (пракуратара) і адказнага сакратара — грамадзянскія справы. Грамадзянскімі лічыліся справы аб незаконных дзеяннях суддзі ці пракурора, аб правах уласнасці на зямлю, аб спадчыне, аб нявыплаце грашовых пазык, аб высяленні з кватэры [33];

у складзе калегіі з трох суддзяў (пракуратар, віцэ-пракуратар, падпракуратар) і адказнага сакратара — крымінальныя справы. Крымінальнымі лічыліся справы аб крадзяжы, аб праездзе без білета, аб незаконным прысваенні ўласнасці, аб нанясенні цялесных пашкоджанняў, аб падмане і хуліганстве, аб парушэнні спіртавой манаполіі, аб непадпарадкоўванні ўладам і аб абразе асобы [34].

Такім чынам, у судах існавала два тыпы спраў: крымінальныя і грамадзянскія. Шэраг дакументаў, якія стваралі ў сваёй сукупнасці цэлую, завершаную справу, адрозніваліся ў крымінальнай і грамадзянскай вытворчасці. Таму больш падрабязна спынімся на кожнай з вышэйназваных спраў для іх характарыстыкі і агляду дакументаў, якія стваралі справу.

Крымінальная справа (Akta w sprawie karnej) была вельмі распаўсюджанай у судовай дзейнасці і мела найбольшую колькасць дакументаў. У розных справах такія дакументы маглі мяняцца месцамі, замяняцца іншымі ці ўвогуле адсутнічаць, аднак пэўны шэраг дакументаў, якія былі дададзены да справы ў пэўным парадку, вылучыць удалося:

*Інфармацыйная картка.* Статыстычны дакумент, у якім падаваліся ўсе найважнейшыя звесткі аб дадзенай справе, яе ўдзельніках, дакументах, якія былі выдадзены падчас дасудовага разбору працы і інш. Уся інфармацыя ў такой карце дзялілася на тры інфармацыйныя часткі. У першай частцы (A) утрымлівалася інфармацыя па выкананні распараджэнняў, якія былі атрыманы падчас галоўнага разбору справы. У другой (B) — па выкананні іншых распараджэнняў суда па дадзенай справе. І, нарэшце, у трэцяй частцы (C) была пададзена ўся інфармацыя па выкананні прысуду [35].

*Акт абвінавачвання.* Гэты дакумент мог быць як рукапісным, так і друкаваным. Ствараўся такі акт найчасцей у паліцэйскіх пастарунках — першай інстанцыі па расследаванні справы. Замест акта абвінавачвання вельмі часта ўжываліся іншыя дакументы такога ж тыпу. Звычайна гэта былі запісы следчых дзеянняў ці пратаколы прыняцця вуснага паведамлення пра злачынства, якія складаліся ў пракуратуры [36].

*Дадзеныя аб асобе абвінавачванага.* У гэтым дакуменце, які выглядаў як анкета, падаваліся ўсе даныя пра абвінавачванага. Дакумент складаўся непасрэдна ў судзе адказным сакратаром і завяраўся судовай пячаткай і подпісамі абвінавачванага і сакратара. Здараліся выпадкі, калі такі дакумент адсутнічаў, тады замест яго ў справу ўкладаліся пратаколы допыту сведак, у якіх былі запісаны ўсе неабходныя даныя [37].

*Запыт пра пакаранне.* Гэты дакумент па сутнасці сваёй з'яўляецца звычайным пісьмом, якое накіроўвалася ў Міністэрства юстыцыі з мэтай даведацца пра мінулае абвінавачванага (ці быў яму яшчэ калі-небудзь вынесены прысуд у судах краіны). Дакумент заўсёды афармляўся на тыпаграфскім бланку, завяраўся пячаткай суда і подпісам віцэ-пракуратара. Нярэдка замест запыту пра пакаранне выкарыстоўваўся іншы дакумент, які называўся карным загадам, выдаваўся Міністэрствам юстыцыі і таксама ўтрымліваў звесткі пра папярэдні ўдзел абвінавачванага ў судовых разборах, дзе яму быў вынесены пэўны прысуд [38].

*Пратакол галоўнага разбору ці пратакол пасяджэння суда.* Гэты дакумент ствараўся адказным сакратаром падчас правядзення судовага пасяджэння, на якім разглядалася тая ці іншая справа. Дакумент складаўся таксама на тыпаграфскім бланку, завяраўся пячаткай і подпісамі суддзяў (ці суддзі), сакратара, абвінавачванага і пацярпеўшага, а таксама сведак і іншых асоб, што непасрэдна ўдзельнічалі ў разборы справы [39].

*Сентэнцыя прысуду.* Дакумент, які, як і папярэдні, складаўся адказным сакратаром на тыпаграфскім бланку, аднак завяраўся толькі подпісам галоўнага суддзі (пракуратара) і судовай пячаткай. Сутнасць гэтага дакумента была ў папярэднім абвінавачванні і вынясенні прысуду. Затым прызначаўся трохдзённы перапынак у пасяджэнні суда, падчас якога абвінавачваны мог прад'явіць звесткі аб сваёй невінаватасці, а пацярпеўшы — прасіць больш суровага пакарання для абвінавачванага. Пасля гэтага перапынку следства ізноў аднаў-

лялася. Як правіла, папярэдняе абвінавачванне заставалася нязменным і ў такім выглядзе пераходзіла да наступнага дакумента ў справе [40].

*Прысуд*. Назва гэтага дакумента гаворыць сама за сябе. Аднак прысуд не быў апошнім дакументам у справе, які вырашаў лёс пацярпеўшага і абвінавачванага. Гэта тлумачыцца тым, што вельмі часта абвінавачваны з дапамогай нанятага натарыуса-адваката падаваў скаргу-апеляцыю, што адкладвала канчатковае вынясенне прысуду не менш як на дваццаць дзён і дазваляла яшчэ раз паспрабаваць даказаць сваю невінаватасць. Трэба адзначыць, што прысуд быў самым галоўным ва ўсёй справе дакументам. Таму ён падлягаў дакладнаму афармленню. Тым не менш, ніякіх значных адрозненняў у яго афармленні не існавала. Прысуд складаўся сакратаром на гербавым тыпаграфскім бланку ад рукі ці на пішучай машынцы, завяраўся дзяржаўнай пячаткай і подпісамі суддзі і сакратара [41].

*Апеляцыйная скарга*. Такі дакумент складаўся натарыусам-адвакатам пацярпеўшага і быў прызначаны для абскарджання вынесенага прысуду. Як правіла, апеляцыі друкаваліся на пішучай машынцы на звычайнай паперы і завяраліся подпісамі натарыуса і абвінавачванага. У судзе на такіх скаргах ставіўся рэгістрацыйны штамп і судовая пячатка, калі такі дакумент падлягаў далучэнню да справы [42].

*Пастанова суда*. Гэта апошні дакумент, якім завяршаліся ўсе крымінальныя справы. Пастановы афармляліся на звычайных лістах паперы фармату А5, завяраліся судовай пячаткай і подпісам суддзі. Рашэнне, вынесенае ў пастанове, ужо было канчатковым. Апеляцыю на такое рашэнне можна было падаваць толькі ў суды другой інстанцыі (акруговыя, ваяводскія, галоўны дзяржаўны суды). Звычайна для жыхароў Заходняй Беларусі судом другой і апошняй інстанцыі быў Віленскі акруговы суд [43].

Акрамя вышэйадзначаных дакументаў да крымінальнай справы маглі дадавацца і іншыя. Гэта разнастайныя заявы, пісьмы, прашэнні, звароты, пратаколы допытаў, пратаколы разбораў, распараджэнні і інш. Нязменным у крымінальнай справе было толькі яе завяршэнне (заўсёды справа завяршалася пастановай суда) і пачатак (справа пачыналася з інфармацыйнай карткі, якая ўтрымлівала ўсе неабходныя звесткі).

І калі сітуацыя з крымінальнымі справамі больш-менш зразумелая, то такога нельга сказаць пра справы грамадзянскія. Тут агульнай заканамернасці ў афармленні спраў не назіраецца. Аднак існуюць заканамернасці для кожнага віду спраў: аб правах уласнасці, аб спадчыне і аб высяленні з кватэры. Тым не менш, нягледзячы на такую адсутнасць пэўных агульных правілаў, прынамсі існуе шэраг дакументаў, якія сустракаюцца ў кожнай з вышэйназваных спраў на розных месцах, што ўсё ж-такі дазваляе разгледзіць іх стварэнне і афармленне агульна.

Іск па грамадзянскай справе быў платны. Кошт такога іску складаў ад пяцідзясяці да трохсот польскіх злотых [44]. Таму ў залежнасці ад самой спра-

вы, яе складанасці і кошту іска адбываецца разыходжанне і ў афармленні справы і складзе дакументаў, якія да яе дадаваліся.

Разгледжаныя вышэй дакументы не з'яўляюцца поўным спісам усіх тых дакументаў, што дадаваліся да той ці іншай грамадзянскай справы. Усяго да грамадзянскіх спраў дадавалася больш за дзесяць розных відаў дакументаў, пачынаючы ад простай заявы ці пратакола і заканчваючы грунтоўнымі іскамі, скаргамі і прысудамі. Такім чынам, уся гэта разнастайнасць дакументацыі, якая стваралася падчас дзейнасці судовых органаў Польшчы, сведчыць, папершае, аб вялікай колькасці спраў рознай цяжкасці, якія разглядаліся ў судах, а, па-другое, — аб адсутнасці пэўнай наладжанай уніфікаванай сістэмы дакументацыйнага забеспячэння судоў у Польшчы.

Вялікая колькасць відаў дакументаў у судовых органах і пракуратуры была звязана з вялікай колькасцю спраў рознай цяжкасці, якія разглядаліся ў судах і пракуратуры, а таксама была выклікана адсутнасцю пэўнай наладжанай уніфікаванай сістэмы дакументацыйнага забеспячэння правасуддзя ў Польшчы.

Справы судовай вытворчасці прадстаўляюць сабой вельмі каштоўную інфармацыю з пункту погляду як дакументазнаўцаў, так і гісторыкаў. І калі для першых такія справы — гэта падрабязнейшая крыніца па вывучэнні парадку вядзення, фарміравання, выкарыстання і захоўвання інфармацыі ў судах, што можа быць выкарыстана нават у сучасным справаводстве пры наяўнасці камп'ютарнай тэхнікі, электронных дакументаў і дакументазвароту, то для гісторыкаў справа судовай вытворчасці — гэта заўсёды скарб, які дазваляе прасачыць лёс асобнага чалавека праз прызму мінулых дзесяцігоддзяў.

Крыніцы і літаратура

1. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 10. Пратаколы пасяджэнняў Маладзечанскага гродскага суда за 1928 г.
2. Там жа.
3. Там жа.
4. Там жа.
5. Там жа.
6. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 60. Пратаколы пасяджэнняў Маладзечанскага гродскага суда за 1936 г.
7. Там жа.
8. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 10. Пратаколы пасяджэнняў Маладзечанскага гродскага суда за 1928 г.
9. Там жа.
10. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 3. Пратаколы пасяджэнняў Віленскага акруговага суда (1923—1927 гг.).
11. Там жа.
12. Там жа.
13. Там жа.
14. Там жа.

15. Cialkowski, R. System prawno-finansowy samorzajdu terytorialnego w Polsce w latach 1918—1939 / R.Cialkowski // Nauki humanistyczno-spoleczne. — 1967. — Zesz. 52. — S. 55—87.
16. Дзяржаўны архіў Гродзенскай вобласці. — Прадмова да Вопісу № 1 спраў пастаяннага захоўвання за 1920—1939 гг. «Наваградскае ваяводскае праўленне» — С. 4—9.
17. Cialkowski, R. System prawno-finansowy samorzajdu terytorialnego w Polsce w latach 1918—1939 / R.Cialkowski // Nauki humanistyczno-spoleczne. — 1967. — Zesz. 52. — S. 55—87.
18. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 23. — Воп. 1. — Спр. 6. Пракуратура 10 раёна (заявы, пратаколы, распараджэнні).
19. Там жа.
20. Там жа.
21. Там жа.
22. Там жа.
23. Там жа.
24. Там жа.
25. Там жа.
26. Там жа.
27. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 23. — Воп. 1. — Спр. 15. Справаздачы пра дзейнасць Пракуратуры 10 раёна.
28. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 543. — Воп. 1. — Спр. 7. Дакументы натарыуса П. Бердыжа.
29. Там жа.
30. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 10. Пратаколы пасяджэнняў Маладзечанскага гродскага суда за 1928 г.
31. Там жа.
32. Там жа.
33. Там жа.
34. Там жа.
35. Занальны дзяржаўны архіў г. Маладзечна. — Фонд 15. — Воп. 1. — Спр. 72. Справа аб парушэнні спіртавой манаполіі.
36. Там жа.
37. Там жа.
38. Там жа.
39. Там жа.
40. Там жа.
41. Там жа.
42 Там жа.
43. Там жа.
44. Там жа.
45. Cialkowski, R. System prawno-finansowy samorzajdu terytorialnego w Polsce w latach 1918—1939 / R.Cialkowski // Nauki humanistyczno-spoleczne. — 1967. — Zesz. 52. — S. 55—87.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 12.04.2012*

***С. С. Рудович,***
*старший научный сотрудник*
*отдела археографии БелНИИДАД,*
*кандидат исторических наук;*
e-mail: arheograph@belniiddd.by

# МИНСКИЙ СОВЕТ ДЕПУТАТОВ: НАЧАЛО ПУТИ (1917—1920 гг.)

В середине марта 2012 г. исполнилось 95 лет со времени образования Минского городского Совета депутатов, ныне являющегося представительным государственным органом и основным звеном системы местного самоуправления на территории столицы Республики Беларусь — г. Минска. За почти вековой период функционирования Минский Совет, находясь в центре общественно-политической жизни крупного столичного города, пережил немало трансформаций и потрясений, разделяя со всей страной и светлые, и мрачные страницы нашей непростой истории в XX в. По случаю знаменательной даты в Минске прошли торжества. Белорусскими архивистами была организована выставка «Минский городской Совет. Вехи истории», их же усилиями издан фундаментальный сборник документов и материалов «Минский городской Совет депутатов, 1917—2012» [22]. Памятная дата является хорошим поводом для того, чтобы попытаться с современных позиций осмыслить процесс возникновения Совета и его становления в первые годы существования.

Обращаясь к истокам, напомним, что Советы рабочих депутатов впервые возникли в России (самый первый — в г. Иваново-Вознесенске) в ходе революции 1905—1907 гг. В период высшего подъема революции Советы действовали в 55 российских городах. Они представляли собой не органы государственной власти, а общественные формирования, создававшиеся для революционной борьбы с самодержавным государством. Советы как специфическая форма самоорганизации трудящихся для выражения и отстаивания их социально-политических интересов являлись сугубо российским явлением. С одной стороны, они опирались на традиции самоуправления, присущие российской общине, с другой — как бы восполняли собой отсутствие либо неразвитость в Российской империи таких институтов для артикуляции и реализации различных социальных интересов, как профессиональные союзы, политические партии, парламент. В годы Первой российской революции Советы возглавляли стачечную борьбу рабочих, а в некоторых городах пытались осуществить вооруженные восстания. Но в белорусских губерниях в то время Советы еще не появились.

Опыт создания Советов, приобретенный в период Первой российской революции, был использован в более широких масштабах на этапе свержения самодержавия в 1917 г. В ходе Февральской революции в Петрограде наряду с образованием Временного правительства — официального органа новой

демократической власти — по инициативе близких к рабочему движению депутатов Государственной думы и других политических активистов социалистического направления сформировался Совет рабочих депутатов. После избрания в него представителей от воинских частей он начал именоваться Петроградским Советом рабочих и солдатских депутатов. По примеру Петрограда Советы рабочих и солдатских депутатов, а затем и Советы крестьянских депутатов стали создаваться по всей стране. В конце марта 1917 г. их уже насчитывалось до 600, а к октябрю — более 1400. В белорусских губерниях, по некоторым подсчетам, к середине 1917 г. образовалось около 150 Советов [1, с. 31]. До осени 1917 г. преимущественным политическим влиянием в Советах пользовались социал-демократы-меньшевики и социалисты-революционеры (эсеры).

Минский Совет рабочих и солдатских депутатов образовался одним из первых в Беларуси. Минск был тогда прифронтовым городом, в нескольких десятках километров на запад от него проходил российско-германский фронт Первой мировой войны. На территории Беларуси дислоцировались три армии российского Западного фронта общей численностью более 1,5 млн военнослужащих, штаб фронта располагался в Минске. Среди почти 250-тысячного населения города коренных минчан тогда насчитывалось едва 50 тысяч [2, 27 красавіка; 8, 28 апреля; 10, с. 809—810, 816—819]. Остальные — солдаты и офицеры, рабочие военных предприятий и чиновники различных тыловых учреждений, заброшенные сюда войной из других регионов империи, главным образом из центральных российских губерний. Инициатива создания Минского Совета исходила в первую очередь из этой среды.

К сожалению, дошедшие до нас документы недостаточно подробно отражают конкретно-исторические обстоятельства рождения Минского Совета, что создавало почву для появления в научной литературе определенных домыслов. В советской историографии приоритет в организации Совета рабочих депутатов в Минске (как и в других городах) однозначно приписывался большевикам. В одной из первых научных статей по истории Минского Совета, опубликованной в 1942 г., утверждалось: «Минский Совет был создан под руководством партийной организации большевиков после первых же известий о победе Февральской революции и образования Советов рабочих депутатов в Петрограде и Москве» [3, с. 23]. Несостоятельность такого утверждения очевидна: на момент свершения Февральской революции в Беларуси и на Западном фронте еще не было большевистской партийной организации, она начала оформляться только летом 1917 г. Поэтому в послевоенное время советские историки, продолжая отстаивать приоритет большевиков в деле создания Минского Совета, использовали более гибкие формулировки. Автор кандидатской диссертации о революционной деятельности Минского Совета в 1917 г. В. Г. Ивашин писал, что решение об образовании в Минске Совета рабочих и солдатских депутатов было принято «инициатив-

ной группой» большевиков в ночь на 2 марта 1917 г., а затем подтверждено «общим собранием» большевиков г. Минска, III и II армий утром 4 марта [12, с. 4]. Другие советские исследователи, расходясь в деталях, также были единодушны в том, что первоначальный импульс к созданию Минского Совета исходил от большевиков, которые провели 1—4 марта 1917 г. ряд совещаний, завершившихся избранием 4 марта Временного исполнительного комитета Совета [1, с. 15—17; 13, с. 11—20; 14, с. 89—94; 24, с. 202—204]. Такая трактовка полностью исключала представителей небольшевистских социалистических течений из числа инициаторов создания Минского Совета.

Официальную версию советской историографии оспорил в 1995 г. белорусский исследователь Н. Е. Семенчик. Опираясь на мемуарные публикации самих большевистских деятелей (В. Кнорина, А. Мясникова, И. Любимова), он обратил внимание, что в начале марта 1917 г. «в минской социал-демократии еще не наблюдалось партийной дифференциации», поэтому подчеркивание некоей особой роли большевиков в событиях тех дней научно неправомерно. По мысли историка, организующей силой при создании Минского Совета были не столько представители партий, сколько революционно-демократические элементы из числа служащих местных комитетов Всероссийского земского союза и Всероссийского союза городов — влиятельных неправительственных организаций, легально действовавших в годы войны. Исследователь считает, что их шаги по организации в Минске Совета рабочих и солдатских депутатов обуславливались не партийно-классовыми интересами, а стремлением мобилизовать рабочих и солдат на поддержку нового демократического строя и обеспечить сохранение порядка в тылу и на фронте [28, с. 66—70].

Данную точку зрения, думается, в целом подтверждают помещенные ниже материалы первого номера «Известий Совета рабочих депутатов» от 5 марта 1917 г., из которого жители Минска впервые узнали о создании в городе Совета*.

Информационная заметка в газете сообщала, что 4 (17) марта 1917 г. состоялось собрание служащих и рабочих местной организации Всероссийского земского союза, которое постановило немедленно начать организацию Совета рабочих депутатов и избрало его Временный исполнительный комитет (приложение № 1). С этого события и ведется отсчет истории Минского Совета. В газетной заметке не указан ни количественный, ни персональный состав Временного исполкома, а протокол первого собрания Совета не сохранился. Но из дошедшего до нас протокола второго собрания от 5 марта и других материалов видно, что Временный исполком состоял из 9 человек [6, с. 83—85]. Возглавил его Борис Позерн — уроженец Нижнего Новго-

* К сожалению, поиски оригинала первого номера «Известий …» не увенчались успехом, однако удалось обнаружить его факсимильное воспроизведение в газете «Савецкая Беларусь» (1927, 17 сакавіка), из которой мы и перепечатываем его материалы.

рода, социал-демократ-«межрайонец», имевший за плечами немалый революционный стаж.

Как уже было сказано, Временный исполком на следующий день после образования, 5 (18) марта, выпустил первый номер газеты «Известия Совета рабочих депутатов», своего печатного органа (позднее называлась «Известия Минского Совета рабочих и солдатских депутатов»). В ней от имени исполкома были обнародованы задачи создаваемого Совета (приложение № 2) и помещено воззвание к рабочим города с призывом избирать своих депутатов в Совет (приложение № 3). Параллельно с организацией рабочих в воинских частях Минского гарнизона проходили выборы солдатских депутатов. Понятно, что проводившиеся без всякой подготовки первые выборы Минского Совета не отличались высокой организованностью. Голосование осуществлялось не по территориальным участкам (их невозможно было быстро создать, но к этому и не стремились), а по предприятиям и воинским подразделениям. Единые нормы представительства отсутствовали, не была разработана процедура голосования; неизвестно, проводилась ли проверка полномочий прибывших депутатов. Так что первый состав Минского Совета нес на себе яркий отпечаток революционного времени со всей его спонтанностью и неупорядоченностью. По некоторым данным, к маю 1917 г. Минский Совет объединял вокруг себя 53 тыс. солдат, рабочих, ремесленников, служащих и других слоев населения. Причем характерно, что в Совете изначально получили численное преобладание представители от военных, отличавшихся большей активностью. К 11 марта было избрано не менее 165 солдатских депутатов, рабочая же секция Совета к 5 апреля насчитывала немногим более 100 человек [1, с. 43, 44].

На чале ўпраўлення знаходзіўся ягоны начальнік, які меў двух памочнікаў: памочніка начальніка Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў горадзе Віцебску, Віцебскім, Веліжскім, Гарадоцкім, Невельскім, Полацкім і Лепельскім паветах; памочніка начальніка ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Люцынскім, Себежскім і Дрысенскім паветах.

У паветах і гарадах знаходзіўся дадатковы штат Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення з вахмістраў, унтэр-афіцэраў, ротмістраў, якія непасрэдна падпарадкоўваліся адпаведнаму памочніку начальніка ўпраўлення. У складзе губернскага ўпраўлення знаходзілася таксама Дзвінская фартэцыйная жандарская каманда.

У гэтым артыкуле мы паспрабавалі вызначыць асноўныя напрамкі працы Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў пачатку XX стагоддзя, напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. У гэты час яго супрацоўнікам давялося сутыкнуцца ўжо не з нешматлікімі падпольнымі гурткамі, а з даволі разгалінаванымі палітычнымі структурамі, якія былі гатовы выкарыстоўваць у барацьбе з існуючым тады рэжымам усялякія метады, у тым ліку і тэрор. Акрамя таго, у разглядаемы намі час дзейнасць рэвалюцыйнага падполля спалучалася са стыхійнымі праявамі сацыяльнага пратэсту народных нізоў (сялян, рабочых, салдат і інш.). Таму ў дадзенай публікацыі вышэйзгаданыя напрамкі праілюстраваны канкрэтнымі прыкладамі з працы ўпраўлення.

Трэба адзначыць, што даволі часта пасля завяршэння аператыўна-следчых мерапрыемстваў справы не перадаваліся ў суд, а вырашаліся адміністрацыйным парадкам альбо губернатарам, альбо на ўзроўні міністраў унутраных спраў і юстыцыі. У апошнім выпадку іх рашэнні патрабавалі санкцыі імператара. У якасці прыкладу можна прывесці справу гельванскага Віленскай губерні і павета мешчаніна Нохіма-Лейбы Гефэна, а таксама мяшчан Цалеля Зільберта, Іоселя і Таўбы Канераў, Майсея Скопа. Першага прыцягнулі да адказнасці за тое, што ён 13 красавіка 1903 г. на вяселлі ў мястэчку Нікалаеў Дрысенскага павета прамовіў тост з рэвалюцыйнымі заклікамі супраць царскай улады. Другіх затрымала паліцыя ў ноч з 14 на 15 красавіка т. г. у павятовым горадзе Дзвінску за раскідванне ўлётак наконт святкавання 1-га Мая. 23 снежня 1903 г. Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне атрымала з Дэпартамента паліцыі паведамленне аб тым, што Лейба Гефэн падпарадкаваны публічнаму нагляду паліцыі па месцы жыхарства тэрмінам на два гады. Такім жа чынам былі адданы пад паліцэйскі нагляд Цалель Зільберт, Іосель Канер і Майсей Скоп. Што ж датычыцца Таўбы Канер, то яе чакаў арышт пры паліцыі тэрмінам на адзін месяц [2, арк. 21; 3, арк. 32].

У студзені—красавіку 1904 г. памочніку начальніка губернскага ўпраўлення ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Себежскім і Люцынскім паветах ротмістру Д. І. Гвоздзеву давялося займацца справай аб спробе гвалтоўнага прымушэння да страйку рабочых і прыказчыкаў тыпаграфіі і крамы дзвінскага купца Добрага. На працягу снежня 1903 г. і студзеня 1904 г. група невядомых патрабавала ад іх спынення працы ў гэтых установах. Тым, хто адмаўляўся, пагражалі збіццём і нават забойствам. Па гэтай справе былі затрыманы жыхары Дзвінска мяшчане Хаім Алуф, Іосіф Рэйн, Іосель Глік, браты Гірша і Хаім Эйдусы. У час вобыску жылых памяшканняў затрыманых у Хаіма Алуфа і Гіршы Эйдуса знайшлі нелегальную літаратуру, якая выдавалася габрэйскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыяй «Бунд» і анархістамі. Але чамусьці дадзеная справа па ўзгадненні з міністэрствамі ўнутраных спраў і юстыцыі была спынена, аб чым паведаміў 24 чэрвеня 1904 г. начальніку Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення Дэпартамент паліцыі [5, арк. 2—3адв., 24—25, 29].

Губернскае ўпраўленне праводзіла шэраг аператыўна-вышуковых мерапрыемстваў на падставе запытаў, атрыманых як з асобага аддзела Дэпартамента паліцыі, які курыраваў справы палітычнага вышуку ў імперыі, так і ад калег з іншых губернскіх, а таксама чыгуначных жандарскіх паліцэйскіх упраўленняў і ахоўных аддзяленняў. Так, 1 красавіка 1904 г. яно займалася па запыце Бесарабскага ахоўнага аддзялення ў г. Кішынёве зборам звестак наконт аўтара лістоў з Невеля і Віцебска на імя віцебскага мешчаніна Якава Белінькага, які на той час пражываў у вышэйзгаданым горадзе. З дапамогай галоўным чынам жандарскага ўнтэр-афіцэра ў Невелі Смірнова было ўстаноўлена, што іх аўтарам з'яўляўся 36-гадовы сын невельскага мешчаніна Мендэль Самінскі, які зарабляў на жыццё прыватнымі ўрокамі. Адпаведна агентурнай інфармацыі менавіта ён пасля ад'езду Якава Белінькага ў Кішынёў узяў на сябе абавязкі кіраўніка невельскага рэвалюцыйнага гуртка. Звесткі аб партыйнай прыналежнасці апошняга ў вывучаных намі дакументах адсутнічаюць [4, арк. 1—7, 9—10, 12, 13—15].

Адпаведна інфармацыі, атрыманай ад калег з Пскоўскага жандарскага ўпраўлення ў ліпені 1904 г., стала вядома аб існаванні ў Полацку сіяніцкага гуртка. Пскоўскія жандары даведаліся аб гэтым з ліста сына полацкага купца Самуіла Каценельсона, які знайшлі падчас вобыску ў жыхара Пскова рэжыцкага мешчаніна Іцыка Плінера ў чэрвені 1904 г. [4, арк. 24, 25].

З пачаткам руска-японскай вайны і рэвалюцыі 1905—1907 гг. супрацоўнікі ўпраўлення сутыкнуліся з пашырэннем выпадкаў распаўсюджвання ўлётак рэвалюцыйнага зместу, выкарыстання вулічных маніфестацый з боку падпольных арганізацый бундаўцаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і г. д. Прыкладам можа служыць справа якабштацкага Курляндскай губерні мешчаніна Самуіла Шляхтмана. Апошняга затрымалі ў Дзвінску 10 студзеня 1905 г. у час разгону рэвалюцыйнай дэманстрацыі. У яго знайшлі пачак улётак пад назвай «Рускія рабочыя і вы ўсе рускія грамадзяне», выдадзеных Дзвінскай арганізацыяй Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі. Яны ўтрымлівалі патрабаванні спыніць вайну ў Маньчжурыі, увесці свабоду друку і склікаць Устаноўчы сход. Па дадзенай справе вышэйзгаданага Самуіла Шляхтмана прыцягнулі да адказнасці ў якасці абвінавачванага і аддалі пад нагляд паліцыі па месцы ягонага сталага жыхарства ў мястэчку Грыўка Курляндскай губерні. Але там ён затрымаўся нядоўга і з'ехаў, па некаторых звестках, у Амерыку. Таму пастановай Віцебскай губернскай нарады ў складзе губернатара Б. Б. Гершаў-Флотава, пракурора акруговага суда Я. В. фон Ройтэрна і начальніка губернскага жандарскага ўпраўлення палкоўніка В. М. Лямзіна ад 27 мая 1905 г. справу аб Самуіле Шляхтмане прыпынілі да затрымання апошняга [7, арк. 20—22адв., 34, 41].

У час падзей 1905—1907 гг. узмацнілася і рэвалюцыйная прапаганда ў войску, аб чым сведчыць справа радавога 313-га Кінешэмскага пяхотнага палка Пятра Маркава. 25 сакавіка 1905 г. апошняга затрымалі ў казарме з улётка-

мі, якія мелі назву «Да салдат!». Яны ўтрымлівалі заклікі не страляць у народ і пераходзіць на бок рэвалюцыі. Акрамя таго, на тэрыторыі палка знайшлі шэраг падобных улётак. У час следства памочнік начальніка ўпраўлення ротмістр М. С. Сцяпанаў, які праводзіў яго, выявіў падабенства ўлётак, адабраных у Пятра Маркава і знойдзеных у палку, з аналагічнымі ўлёткамі, што праходзілі па справе аб выкрыцці ў Віцебску 2 красавіка 1905 г. падпольнай эсэраўскай тыпаграфіі. Спецыяльная экспертыза падцвердзіла дадзены факт. 15 верасня т. г. ротмістр М. С. Сцяпанаў вырашыў скончыць вытворчасць гэтай справы і перадаць яе пракурору Віленскага вайскова-акруговага суда [6, арк. 14—14адв., 39, 40—40адв., 50]. Звестак пра яе далейшы лёс, як і пра самога радавога Пятра Маркава, пакуль што не знойдзена.

У снежні 1905 г. віцебская паліцыя атрымала звесткі аб тым, што мясцовая габрэйская моладзь плануе ў бліжэйшы час правесці ў памяшканні любавіцкай сінагогі, што месцілася па Ільінскай вуліцы, сходку. Для ўдзелу ў апошняй запрашаліся адмысловыя рэвалюцыянеры-агітатары з Масквы. З мэтай прадухілення падобнага мерапрыемства паліцыя і казакі ўвечары 30 снежня 1905 г. ачапілі памяшканне гэтай сінагогі і правялі вобыск як унутраных пакояў, так і асабіста затрыманых удзельнікаў сходкі. У выніку гэтага былі знойдзены парваныя на шматкі нелегальныя пракламацыі і брашуры. Акрамя таго, у затрыманых знайшлі кінжалы, нагайкі, патроны і абоймы да розных рэвальверных сістэм. Большую частку арыштаваных вызвалілі на наступны дзень. Пад вартай засталіся студэнты Маскоўскага ўніверсітэта смаленскі купецкі ўнук Арон Розэнфельд і маскоўскі купецкі сын Майсей Раскін, а таксама шэраг мясцовых агітатараў. Паколькі, на думку прадстаўнікоў пракурорскага нагляду, не мелася важкіх падстаў для прыцягнення ўдзельнікаў сходкі да судовай адказнасці, у прыватнасці, супрацоўнікі жандарскага ўпраўлення не змаглі вызначыць персанальную прыналежнасць знойдзеных падчас вобыску ў любавіцкай сінагозе пракламацый і брашур, то гэту справу перадалі на разгляд віцебскаму губернатару для яе вырашэння адміністрацыйным парадкам. Як паведаміў 3 лютага 1906 г. у Дэпартамент паліцыі начальнік упраўлення палкоўнік В. М. Лямзін, «двадцать наиболее выдающихся участников митинга» пастановай губернатара былі арыштаваны тэрмінам на тры месяцы кожны [8, арк. 4—5адв., 12—13, 21—21адв., 23—23адв.].

У разглядаемы намі перыяд супрацоўнікі Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення займаліся выяўленнем нелегальных палітычных структур, а таксама баевікоў левых арганізацый, у прыватнасці сацыялістаў-рэвалюцыянераў. Так, 5 студзеня 1906 г. ротмістр асобнага корпуса жандараў М. С. Сцяпанаў на падставе прапановы Дэпартамента паліцыі МУС пачаў вытворчасць справы аб віцебскіх мяшчанах братах Абраме і Лейбе Бязносах і Аншэле Ціхантоўскім. Апошніх затрымалі яшчэ ў снежні 1905 г., калі тыя спрабавалі набыць у салдат 164-га Закатальскага пяхотнага палка зброю і рыштунак для яе. Пры гэтым яны спрабавалі весці палітычную агітацыю

сярод вайскоўцаў, перадаўшы ім брашуру, выдадзеную ад імя «Ваеннай арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў». У арыштаваных таксама знайшлі рэвальверы, а ў пятнаццацігадовага Абрама Бязноса — нагайку са свінчаткай. На вялікі жаль, у дадзенай архіўнай справе не захавалася больш падрабязнай інфармацыі наконт праведзеных аператыўна-следчых мерапрыемстваў, у прыватнасці, пратаколаў допытаў абвінавачаных. Урэшце рэшт Аншэль Ціхантоўскі і Лейба Бязнос пастановай Санкт-Пецярбургскай судовай палаты, юрысдыкцыя якой распаўсюджвалася і на Віцебскую губерню, ад 22 верасня 1906 г. былі асуджаны да аднаго года зняволення ў фартэцыі кожны. Непаўнагадовага Абрама Бязноса наогул вызвалілі ад судовай адказнасці [10, арк. 1—1а, 16,17—18, 62, 70].

У ноч з 7 на 8 студзеня 1906 г. адпаведна пастанове начальніка жандарскага ўпраўлення палкоўніка В. М. Лямзіна прыкамандзіраваны да дадзенага ўпраўлення паручнік Сердзюкоў правёў вобыск у доме віцебскіх мяшчан Геншафтаў па Пакроўскай вуліцы. Падставай для гэтага паслужылі агентурныя звесткі аб тым, што дом выкарыстоўваўся ў якасці канспіратыўнай кватэры, дзе выраблялася і адкуль распаўсюджвалася рознага кшталту нелегальная літаратура. У выніку вобыску былі знойдзены друкаваныя матэрыялы і ўлёткі, што адносіліся да выданняў Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі і партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў для вядзення агітацыйна-прапагандысцкай працы сярод рабочых, у прыватнасці чыгуначнікаў, сялян і «нижних чинов войск». У сувязі з гэтым арыштавалі шэраг асоб, у тым ліку віцебскага мешчаніна Самуіла Геншафта і гарадоцкую мяшчанку Стэру Зарагацкіну, у пакоі якой і знайшлі вышэйзгаданую літаратуру. Па выніках расследавання справу вырашылі адміністрацыйным парадкам. Па загаду міністра ўнутраных спраў Самуіла Геншафта і Стэру Зарагацкіну па хадайніцтве начальніка губернскага жандарскага ўпраўлення выслалі ў Нарымскі край Томскай губерні тэрмінам на тры гады [9, арк. 1, 4—5, 33—34, 41].

У маі 1907 г. начальнікам Дзвінскай фартэцыйнай жандарскай каманды ротмістрам Я. М. Грыгарашам у выніку вобыску, праведзенага ў ноч з 5 на 6 мая т. г. у доме мешчаніна мястэчка Арляны Бельскага павета Гарадзенскай губерні Рувіма Гурэвіча, была ліквідавана падпольная тыпаграфія Дзвінскага камітэта партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў [16, арк. 1—3адв.].

У чэрвені—верасні 1907 г. штабс-ротмістр упраўлення А. Т. Будніцкі вёў справу наконт існавання ў павятовым горадзе Веліжы гуртка прыхільнікаў партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў. 5 чэрвеня т. г. у вышэйзгаданым горадзе былі праведзены вобыскі ў шэрагу асоб, западозраных у прыналежнасці да нелегальнай арганізацыі, у тым ліку ў мясцовага натарыуса Яўгена Салодкіна, мяшчан Блюмы Віктаравай, Гершона Лаговіера, Сары Ліозянскай і іншых асоб агульнай колькасцю трынаццаць чалавек. У іх знайшлі шэраг нелегальных выданняў сацыялістычнага характару самых розных накірункаў (эсераўскага, сацыял-дэмакратычнага, бундаўскага, паалей-сіяніцкага

і г. д.), у тым ліку працы Георгія Пляханава, Уладзіміра Леніна («Н. Ленін»), Іосіфа Сталіна («Татамянц»). Але А. Т. Будніцкі не змог знайсці канкрэтных доказаў удзелу вышэйзгаданых асоб у нелегальнай працы і дадзеная справа па хадайніцтве начальніка жандарскага ўпраўлення палкоўніка Сямёнава была спынена пастановай віцебскага губернатара Б. Б. Гершаў-Флотава ў лістападзе 1907 г. [15, арк. 7—8, 81—82, 84].

У 1905—1907 гг. пачасціліся рознага роду вулічныя акцыі палітычнага характару (маніфестацыі, мітынгі і інш.), што ладзіліся актывістамі рэвалюцыйных арганізацый. Так, на працягу 1906 г. Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне займалася справай аб праведзеным 9 студзеня 1906 г. у мястэчку Чашнікі Лепельскага павета вулічным мітынгу габрэйскай моладзі, прымеркаваным да гадавіны падзей 9 студзеня 1905 г. у Санкт-Пецярбургу («Крывавая нядзеля»). Першапачатковае расследаванне гэтай справы вялося ў супрацоўніцтве з мясцовай паліцыяй. Паколькі адсутнічала магчымасць камандзіраваць у Чашнікі афіцэра ўпраўлення, то ажыццяўленне аператыўна-следчых мерапрыемстваў даручылі прыставу другога стану Бялінскаму. І толькі на заключным этапе ротмістр асобнага корпуса жандараў Г. А. Белапольскі правёў паўторныя допыты шэрагу сведак — сялян, што з’яўляліся жыхарамі Чашнікаў і былі відавочцамі вышэйзгаданага мітынгу. Згодна з іх паказаннямі, выступоўцы на гэтым сходзе, у тым ліку каваль Мордух Арансон, мясцовы мешчанін Залман Невельсон, жонка лекара Роза Абезгаўз і іншыя асобы, заклікалі ўсіх грамадзян не падпарадкоўвацца ўладзе як ніжэйшай, так і вышэйшай, забіваць усіх яе прадстаўнікоў ад паліцэйскіх да міністраў. Сялянам прапаноўвалася адбіраць у абшарнікаў зямлю, рубіць іх лясы і г. д. Але, на думку пракурорскага нагляду, следства не змагло дакладна вызначыць, хто менавіта з дадзеных выступоўцаў прамаўляў заклікі ў падтрымку гвалтоўных дзеянняў супраць урадавых служачых і мясцовых абшарнікаў, звяржэння самадзяржаўя і абвяшчэння краіны рэспублікай. Таму губернская нарада ў складзе выконваючага абавязкі кіраўніка губерні віцэ-губернатара Н. Ф. Ашаніна, пракурора акруговага суда Ф. Ф. Мікуліна і начальніка жандарскага ўпраўлення палкоўніка Сямёнава 10 жніўня 1907 г. вырашыла спыніць дадзеную справу з-за адсутнасці дастатковых доказаў віны вышэйзгаданых асоб [12, арк. 91—94, 98—104адв., 184—190, 195—196].

У час рэвалюцыі 1905—1907 гг. актывісты рэвалюцыйных партый разгарнулі агітацыйна-прапагандысцкую працу сярод сялянства Расійскай імперыі, у тым ліку і ў Віцебскай губерні. Прыкладам таму можа быць справа, якой у лютым—красавіку 1906 г. займаліся памочнік начальніка жандарскага ўпраўлення ў Дзвінскім, Рэжыцкім, Себежскім і Люцынскім паветах ротмістр Заглухінскі і яго пераемнік на гэтай пасадзе ротмістр Сатыры. Адпаведна звестак, атрыманых ад мясцовай паліцыі, якая па даручэнні першага праводзіла папярэдняе расследаванне дадзенай справы, сяляне Эвермуйжскай воласці Люцынскага павета Франц Давыдан, Віктар Кальван, Аўгуст Саленік, а такса-

ма эсер Іван Якаўлеў (ён жа Сямёнаў) наладжвалі явачным парадкам, не атрымаўшы дазволу ад афіцыйных сельскіх улад, сходы мясцовых сялян. На гэтых мерапрыемствах яны заклікалі да непадпарадкавання вясковай адміністрацыі, абрання замест яе новых асоб, адмовы ад выплаты і выканання земскіх падаткаў і павіннасцей, выдалення абшарнікаў з іхніх маёнткаў, падзелу паміж сялянамі абшарніцкіх зямель. Акрамя таго, у затрыманых паліцыяй Віктара Кальвана, Аўгуста Саленіка і Івана Якаўлева (Сямёнава) знайшлі рознага кшталту нелегальную літаратуру, выдадзеную Паўночным Сялянскім саюзам, партыямі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і сацыял-дэмакратаў. Да таго ж у Віцебскім губернскім жандарскім упраўленні мелася дадатковая інфармацыя аб ранейшай дзейнасці Івана Якаўлева як актыўнага функцыянера эсэраўскай партыі. Апошні ў 1904 г. прыцягваўся да адказнасці як член «Віцебскай групы партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў». Па агентурных дадзеных ён прымаў удзел, паколькі заставаўся на волі ў сувязі з унясеннем грашовага залогу, у некалькіх тэрарыстычных актах: замах на жыццё жандарскага ўнтэр-афіцэра Патрасава, які потым сканаў у выніку атрыманых ім ран; няўдалы замах на жыццё тагачаснага прыстава віцебскай паліцыі Б. М. Счансновіча. Але ўсе справы супраць яго спынілі адпаведна з царскім маніфестам ад 21 кастрычніка аб амністыі. Дадзеную справу па яе заканчэнні перадалі на разгляд Віцебскай губернскай нарады, паколькі пракурорскі нагляд не знайшоў дастатковых падстаў (не вельмі дакладныя паказанні сведак) для вырашэння яе судовым парадкам. 28 лістапада 1906 г. на пасяджэнні вышэйзгаданай нарады яна была спынена. Як паведаміў у Дэпартамент паліцыі начальнік упраўлення палкоўнік І. С. Сямёнаў, у адпаведнасці з пастановай віцебскага губернатара Б. Б. Гершаў-Флотава, Віктар Кальван, Аўгуст Саленік і Іван Якаўлеў (Сямёнаў) высылаліся ў Архангельскую губерню, прычым да моманту высылкі яны павінны былі ўтрымлівацца пад вартай [13, арк. 54—55, 65—66адв., 70—74адв., 81, 109, 125—128адв., 134—137адв.].

На пачатку дваццатага стагоддзя, асабліва ў 1905—1907 гг., падрыхтоўка тэрарыстычных актаў і спробы іх ажыццяўлення, удалыя альбо няўдалыя, сталі прыкметнай з’явай грамадска-палітычнага жыцця Расіі. Падобнай справай займаўся ў лютым—сакавіку 1906 г. памочнік начальніка ўпраўлення падпалкоўнік Зэйдліц. Яна датычылася невельскіх мяшчан Цалкі Зэліксона, Самуіла Кубланава, Ізраіля Шабашава і яшчэ аднаго невядомага. Па звестках, атрыманых невельскай паліцыяй, усе яны займаліся вырабам выбуховага прыстасавання ў кватэры Самуіла Кубланава. Вобыск, праведзены ёю ў гэтым памяшканні, падцвердзіў дадзеную інфармацыю. Па ягоных выніках Самуіла Кубланава ўзялі пад варту. Цалка Зэліксон і Ізраіль Шабашаў паспелі ўцячы. Пазней, 29 красавіка 1906 г., апошняга затрымалі ў Віцебску. Мэту выкарыстання гэтай бомбы следства дакладна не вызначыла. Па першай версіі, яе рабілі з мэтай забойства невельскага павятовага спраўніка Я. М. Бялінскага, па другой — на выпадак габрэйскага пагрому для самаабароны. Прына-

лежнасць абвінавачваных да той ці іншай арганізацыі таксама не змаглі вызначыць. Можна толькі меркаваць, што Самуіл Кубланаў, магчыма, належаў да габрэйскай сацыял-дэмакратычнай арганізацыі «Паалей-Цыён» («Працоўныя Сіона»), бо падчас вобыску ў ягонай кватэры знайшлі ўлётку «Да габрэйскай навучэнскай моладзі», выдадзеную гэтай партыяй. У сакавіку—красавіку 1906 г. падпалкоўнікам Зэйдліцам следства па справах Самуіла Кубланава і Ізраіля Шабашава было скончана, і матэрыялы перададзены ў суд. 15 сакавіка 1907 г. Самуіла Кубланава Санкт-Пецярбургская судовая палата асудзіла да высылкі на пасяленне, а Ізраіля Шабашава — да васьмі гадоў катаргі [14, арк. 3, 12—13, 17—18, 19—20, 21—21адв., 23адв.—24, 65, 87].

Супрацоўнікам Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення, як і іншым структурам палітычнага вышуку імперыі, цыркулярам Дэпартамента паліцыі ад 15 красавіка 1906 г. прадпісвалася адсочваць праявы праваманархічнага чарнасоценнага руху, прыхільнікі якога сталі выказваць імкненне да самаарганізацыі, актывізацыі прапагандысцкай дзейнасці ў якасці альтэрнатывы рэвалюцыйным партыям і арганізацыям. На Віцебшчыне дадзеная з’ява знайшла сваё адлюстраванне ў шэрагу гектаграфічных улётак ад імя «Першай рускай партыі ў абарону самадзяржаўя»: «Да рускага народа» (улётка № 1), «Да начальства» (улётка № 2), «Да вышэйшага начальства» (улётка № 3), «Да рускага народа і габрэяў» (улётка № 4), «Да святарства» (улётка № 5). Уся гэта друкаваная прадукцыя змяшчала заклікі да ўзброенага адпору «жыдоўскай смуце» і яе рускім прыхільнікам, якія ўзняліся супраць цара і праваслаўнай веры, патрабаванні да святарства актыўна весці антырэвалюцыйную прапаганду шляхам кожнадзённых казанняў і г. д. Асобная ўлётка адрасавалася стараабрадцам, якія лічыліся сапраўднымі патрыётамі, моцнымі прыхільнікамі веры і паданняў даўніны. Таму іх заклікалі да агульнай барацьбы супраць «касмапалітызму» [1, арк. 3адв.—4].

Кіраўніцтва Дэпартамента паліцыі лічыла распаўсюджванне падобных заклікаў у тагачасны перыяд непажаданым узбуджэннем адных сацыяльных слаёў супраць іншых, паколькі магло прывесці да далейшай дэстабілізацыі грамадска-палітычнага ладу ў краіне, масавых узрушэнняў. Таму Дэпартамент загадаў мясцовым жандарскім упраўленням і ахоўным аддзяленням выяўляць асоб, якія выдаюць і распаўсюджваюць такую літаратуру, і інфармаваць наконт гэтага вышэйшыя інстанцыі [1, арк. 4—4адв.].

У поле зроку жандарскага ўпраўлення траплялі ўсялякага кшталту праявы сацыяльнага пратэсту і незадаволенасці існаваўшым на той час грамадска-палітычным ладам Расійскай імперыі. У лістападзе 1906 г. супрацоўнікі ўпраўлення паручнік Сердзюкоў і ротмістр Г. А. Белапольскі займаліся справай Сяргея Смарыгі, селяніна вёскі Малае Таланкіна Чарняцоўскай воласці Невельскага павета. Апошні па звестках, атрыманых мясцовай паліцыяй, 14 верасня т. г., знаходзячыся ў гасцях у вёсцы Арэхаўка Гульцяеўскай воласці, назваў Невельскі павет дурацкім за тое, што дае навабранцаў для войска,

дадаўшы пры гэтым, што іншыя паветы губерні такога не зробяць і гэта будзе добра. На падставе дадзенай інфармацыі паручнік Сердзюкоў 2 лістапада 1906 г. вырашыў пачаць вытворчасць справы супраць Сяргея Смарыгі па абвінавачванні яго ў падбухторванні мясцовых сялян да ўхілення ад вайсковай службы. З дапамогай паказанняў сведак падцвердзілася сапраўднасць выказванняў Сяргея Смарыгі наконт гэтага. Але пры гэтым большасць з іх дадала, што апошні рабіў свае выказванні ў нецвярозым стане і таму адсутнічалі доказы таго, што абвінавачваны рабіў іх наўмысна. У сувязі з гэтым пастановай губернскай нарады ад 22 студзеня 1907 г. справу супраць яго спынілі [11, арк. 20—22адв., 31, 53].

Такім чынам, на падставе разгледжаных намі спраў можна прыйсці да наступных высноў. Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне прыкладала ўсе намаганні, каб спыніць наступ рэвалюцыйнага падполля на пачатку мінулага стагоддзя, асабліва ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. Першачарговай мэтай з'яўлялася спыненне дзейнасці нелегальных структур бундаўцаў, сацыял-дэмакратаў, сацыялістаў-рэвалюцыянераў і іншых палітычных партый сацыялістычнага напрамку, асабліва іх баявых арганізацый. Таксама прымаліся захады для стрымлівання праяў сацыяльнага пратэсту з боку нізоў тагачаснага расійскага грамадства. Трэба яшчэ заўважыць, што палітычны вышук імперыі лічыў неабходным адсочваць усе выпадкі палітычнай актыўнасці, уключаючы нават тых, хто аб'ектыўна з'яўляўся саюзнікам існуючага рэжыму.

Крыніцы

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. — Ф. 2499. — Воп. 1. — Спр. 6.
2. Там жа. — Спр. 9.
3. Там жа. — Спр. 10.
4. Там жа. — Спр. 27.
5. Там жа. — Спр. 28.
6. Там жа. — Спр. 35.
7. Там жа. — Спр. 37
8. Там жа. — Спр. 41.
9. Там жа. — Спр. 44.
10. Там жа. — Спр. 45.
11. Там жа. — Спр. 48.
12. Там жа. — Спр. 54.
13. Там жа. — Спр. 57.
14. Там жа. — Спр. 63.
15. Там жа. — Спр. 103.
16. Там жа. — Спр. 113.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.01.2012*

**А. М. Лукашевич,**
*доцент кафедры истории*
*Беларуси нового и новейшего времени БГУ,*
*кандидат исторических наук;*
e-mail: lukashevand@mail.ru

# РОССИЙСКОЕ ОПЕРАТИВНОЕ ПЛАНИРОВАНИЕ (ЯНВАРЬ—МАРТ 1812 г.): ПО МАТЕРИАЛАМ РОССИЙСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО ВОЕННО-ИСТОРИЧЕСКОГО АРХИВА

Оперативное планирование является главной составляющей военно-стратегических планов* любого государства и остается одной из самых закрытых тем в историографии. Большинство российских оперативных планов, разработанных в начале XIX в., приходится на 1810—1812 гг. Именно в это время вырабатывались основные подходы к определению характера будущей войны против Франции и ее союзников: наступательная или оборонительная война (во всем многообразии вариантов), разрабатывались планы конкретных операций.

Выработка российского стратегического замысла войны с Францией зависела, в первую очередь, от внешнеполитических обстоятельств. Поэтому, говоря об оперативном планировании, следует учитывать, в какое время создавался тот или иной вариант войны, и к какой конечной цели он должен был привести.

В настоящее время в историографии упоминается более 30 имен авторов и более 40 различных документов с планами ведения войны против Франции и ее союзников. Однако сразу же необходимо отметить, что многие из упоминаемых лиц непосредственно не разрабатывали оперативных планов. В представленных ими записках зачастую излагались лишь общие стратегические принципы ведения войны — наступательной или оборонительной, с определенным набором соответствующих тактических приемов. Среди авторов подобных документов можно назвать следующих лиц: Г. М. Армфельд и Ж. Б. Бернадот [23, с. 427—429, 431—445], Ш.-Ф. Дюмурье [7], Е. Ф. Канкрин [3, с. 16—17], Э. Ф. Сен-При [10, с. 332—339; 19], Ф. П. Уваров [11, с. 238—241], Г. Ф. К. Штейн [24, с. 80] и др. [2, с. 466—491; 1, с. 85—108]. Многие из них имели отдаленное представление о российском оперативном планировании.

Что касается круга лиц, имевших непосредственный доступ к секретной документации оперативного плана, то он был достаточно ограниченным. К нему относились: военный министр М. Б. Барклай де Толли, председатель Военного департамента Государственного совета граф А. А. Аракчеев (на

* Под военно-стратегическим планированием понимается совокупность оперативных планов (планов военных действий), а также их политическое, экономическое и военное обеспечение.

многих архивных документах есть его пометки), военный советник императора К. Л. Фуль, управляющий квартирмейстерской частью князь П. М. Волконский, управляющий Инженерным департаментом К. И. Опперман (как директор Депо карт), а также брат военного министра — флигель-адъютант, инженер-полковник И .Б. Барклай де Толли.

При этом П. М. Волконский и И. Б. Барклай де Толли отвечали только за «техническое» обеспечение военного планирования (брат министра занимался аналитической обработкой всех планов), а А. А. Аракчеев — лишь высказывал свое мнение по представленным для ознакомления документам. Все остальные лица, в том числе родственники императора (герцог А. Вюртембергский) и даже главнокомандующие отдельными армиями (князь П. И. Багратион), не имели прямого отношения к стратегическому планированию. Они не только не обладали полнотой военно-политической и разведывательной информации, но в ряде случаев не знали даже необходимого. Все это сказывалось на качестве их предложений.

Большинство из проектов оперативных планов хранятся в фондах Российского государственного военно-исторического архива (РГВИА) в Москве и были частично опубликованы в многотомном издании «Отечественная война 1812 года. Материалы Военно-ученого архива» [10—16]. Однако до настоящего времени предметом детального анализа историков (М. И. Богданович [2, с. 93—106, 466—491], В. И. Харкевич [24], В. В. Пугачев [18], В. М. Безотосный [1, с. 85—108], А. Л. Монахов [9]) становились лишь отдельные планы, в основном русскоязычные.

Проведенный автором статьи анализ документов позволил выделить шесть основных этапов оперативного планирования за период с февраля 1810 г. по июнь 1812 г. [6]. Наименее изученным в историографии является пятый этап, который приходится на начало 1812 г. Именно на нем и хотелось бы подробно остановиться в данной публикации.

В целом январь — март 1812 г. в оперативном плане можно расценивать с двух точек зрения. С одной стороны, как продолжение четвертого этапа (сентябрь — октябрь 1811 г.), связанного с подготовкой совместной с Пруссией наступательной операции против Княжества Варшавского. Ее разработка нашла отражение в плане прусского генерала Г. Шарнхорста (сентябрь 1811 г.) [4, с. 268—269; 5, с. 710]; втором плане И. Рюля фон Лилиенштерна (сентябрь 1811 г.) [12, с. 273]; оперативном плане «Военной конвенции» (5/17 октября 1811 г.) [8, с. 24—37; 5, с. 197—201] и предложениях генерала князя П. И. Багратиона (сентябрь 1811 г.) [11, с. 76—77].

О том, насколько в конце 1811 — начале 1812 г. в Российской империи накапливалось недовольство условиями Тильзитского мира (1807) и нарастали реваншистские настроения, свидетельствует ряд записок по оперативным вопросам отставных офицеров, представленных на высочайшее имя. Так, 11 ноября 1811 г. бывший майор гусарского полка и обер-квартирмейстер

А. Полев подготовил «Мнение об учреждении обороны, в настоящих обстоятельствах, по внешним и пограничным землям государства нашего» [21]. В нем автор выступал активным сторонником наступательной войны. Объясняя суть поданного «Мнения», А. Полев писал: «Мы тогда сами удивляться будем!.. Кому мы следовали?.. кого страшились?.. и для чего толь долго медлили, позволяя изнурять себя и всю Европу… и еще угрожать опровержением Великой нашей Империи, и возложением оков всю вселенную» [21, л. 9].

Однако из-за уклончивой позиция Пруссии, которая опасалась последствий своего союза с Россией, операция осенью 1811 г. была отложена. Однако идея нанесения первого удара по союзникам Франции не умерла.

Сохранившиеся документы Военно-ученого архива (сейчас это фонд РГВИА) позволяют рассматривать начало 1812 г. как самостоятельный этап оперативного планирования. Его суть сводилась к подготовке и проведению упреждающего удара по вероятным противникам Франции по антироссийской коалиции — Княжеству Варшавскому и Пруссии — до момента сосредоточения и развертывания основных сил Великой армии.

Подготовка этой операции нашла отражение в «Плане войны против французов и их союзников» неизвестного автора (12 февраля 1812 г., на фр. яз. [14, с. 190—192]), «Письме неизвестного» (12 марта 1812 г., на фр. яз. [15, с. 68—69]) и «Проекте плана операций русских войск в герцогстве Варшавском» герцога А. Вюртембергского (март 1812 г., на фр. яз. [15, с. 253—275]). Эти документы косвенным образом дополняет переписка М. Б. Барклая де Толли с командирами корпусов, дислоцированных на западной границе, в которых просматривается общий стратегический замысел российского командования.

Итак, какова же была политическая обстановка в это время? На начало 1812 г. пришелся заключительный этап долгой дипломатической борьбы Российской империи за Пруссию. В это время Берлинский двор стоял перед окончательным выбором: присоединиться к С.-Петербургу, чтобы совместно сражаться с превосходящим по силе противником, или окончательно подчиниться воле Наполеона.

В конце января — начале февраля 1812 г. Пруссия предприняла последнюю попытку помирить Францию с Россией и, таким образом, избавить себя от необходимости примыкать к одной из сторон. Для этого в С.-Петербург был командирован полковник К. Ф. Кнезебек. Главный военный советник Фридриха Вильгельма III должен был передать личное письмо короля, попытаться склонить имп. Александра I пойти на уступки требованиям Наполеона и тем самым предотвратить надвигавшееся военное столкновение.

В инструкции, данной К. Ф. Кнезебеку, подчеркивалось, что Россия не обладает достаточными силами для оказания Пруссии эффективной помощи в случае войны с Наполеоном. Поэтому российско-прусский союз может иметь печальное последствие: привести к окончательному французскому

завоеванию Пруссии [17, с. 347; 5, с. 289—292, 304—306, 725]. Однако миссия К. Ф. Кнезебека оказалась неудачной, поскольку имп. Александр I не изменил своего политического курса. После ее провала прусский король окончательно пришел к выводу о необходимости заключения союзного договора с Францией, который и был подписан в Париже 12 (24) февраля 1812 г. (обмен ратификациями состоялся 5 марта 1812 г.) [17, с. 592].

Как же отреагировало российское военное ведомство на окончательный отказ Берлина от союза с С.-Петербургом? Для начала М. Б. Барклай де Толли отозвал маршруты движения корпусов, которые были направлены командирам в октябре 1811 г. в целях проведения совместной операции с Пруссией, и одновременно дал новые оперативные указания.

В частности, 10 февраля 1812 г. военный министр отправил П. Х. Витгенштейну пакет (№ 68) «за печатью Императорскою». Генерал имел право распечатать его только при условиях, оговоренных в предписаниях от 8 (№ 1), 12 (№ 2) и 15 (№ 3) октября 1811 г., когда должен был «переправиться чрез Неман в Пруссию». При этом старые маршруты, отправленные 15 октября 1811 г. (№ 6) [14, с. 133], приказывалось вернуть назад. В другом письме от 10 февраля 1812 г. (№ 69) М. Б. Барклай де Толли указывал: «В самое то время, когда решитесь переправиться чрез Неман в Пруссию, изволите ни мало медля, с нарочным разослать прилагаемые при сем маршруты к войскам, означенным в списке, при сем прилагаемом. Оные войска, по обстоятельствам, получат в свое время, повеления идти вслед за Вами» [14, с. 132—133].

В тот же день, 10 февраля 1812 г., два пакета были отправлены и генералу К. Ф. Багговуту. В пакете под № 70 предписывалось: «1) Коль скоро получите чрез нарочного курьера от ген.-лейт. графа Витгенштейна известие, что он с вверенными ему войсками вступает в Пруссию, то благоволите распечатать прилагаемый при сем пакет за печатью Императорскою и по содержанию влагаемого в оном повеления, сделать точное и немедленное исполнение». Кроме того, командир корпуса должен был привести войска в полную боеготовность, но так, чтобы это не «могло бы сделать какую либо сензацию». При этом К. Ф. Багговуту предписывалось вернуть с нарочным маршруты, отправленные 15 октября 1811 г. «за № 4», и держать все «выше сказанное… в непроницаемой тайне» [14, с. 133—134]. В этом же предписании назывались и некоторые части, которые должны были принять участие в операции корпуса [14, с. 134].

Данные пакеты с указаниями были получены 21 февраля 1812 г., о чем командиры корпусов рапортовали М. Б. Барклаю де Толли, как и о готовности войск к походу. «Судить по всем обстоятельствам и по содержанию упомянутого повеления за № 70, — писал К. Ф. Багговут, — должен я ежечасно ожидать движения, не ожидая на то вторичное ваше повеление». При этом генерал отмечал, что конский состав корпуса испытывает усталость, а прови-

антских запасов хватит только на несколько дней из-за отсутствия денежных средств [14, с. 164].

Итак, в пакетах «за императорской печатью» содержались маршруты движения полков, которые прояснили бы оперативный замысел. К сожалению, они нам не известны. Однако сохранились иные документы, которые позволяют заполнить определенный вакуум вокруг российского оперативного плана ранней весной 1812 г. В этом отношении наибольший интерес представляет «План войны против французов и их союзников» неизвестного автора, датированный 12 февраля 1812 г. [14, с. 190—192].

Остановимся на сути этого документа. В преамбуле автор указал, что план составлен исходя из того, что Австрия будет сохранять нейтралитет, а Пруссия окажет только «притворное сопротивление». В случае же, если обе эти страны окажутся в стане противников, то российских сил не хватит, чтобы оказать отпор объединенным силам Франции, Пруссии, Австрии и Княжества Варшавского [14, с. 190].

Для проведения наступательной операции автор определил российские силы в 100 тыс. человек, разделенные на несколько групп. Один отряд, численностью 40 тыс. человек, должен был занять территорию Пруссии вдоль Куршской косы, начиная от Мемеля и до Кенигсберга (следуя вдоль побережья Балтики). Второй отряд, численностью в 15 тыс. человек, из Юрбурга направится к Тильзиту, а затем — на соединение с первым отрядом в район Кенигсберга. Успешное занятие этой части Восточной Пруссии, по мнению автора, должно было определить дальнейшие действия российских войск [14, с. 190].

Если первый этап пройдет без осложнений, тогда российские войска смогут занять большую часть Пруссии, прежде чем этому помешает корпус маршала Л. Н. Даву, сосредоточенный на севере Германии. Тем не менее, автор считал необходимым выставить заслон от этого корпуса [14, с. 190—191].

Одновременно с занятием Восточной Пруссии российские войска должны вступить и на территорию Княжества Варшавского. Рассредоточенные польские войска (60 тыс. человек), по мнению автора плана, объединятся для защиты своей столицы. Однако поляки не смогут рассчитывать на саксонские войска, поскольку князь Варшавский оставит их для защиты своих наследственных земель — Саксонии (Фридрих Август I не знал намерений Венского двора) [14, с. 191].

Вторжение на территорию Княжества Варшавского должно было происходить по двум главным направлениям: 10-тысячный отряд переправится через р. Неман у Олиты, проследует в направлении Гонендза (где перейдет р. Бобр в месте впадения в р. Нарев) и затем по правому берегу Нарева двинется к Щучину. Эта колонна должна соединится с отрядом, который прикрывает Кенигсберг. Главная задача этой группы — разбить польские войска,

которые будут прикрывать Варшаву с правого берега Вислы и обеспечить переправу через реку. После этого защита Варшавы станет бесполезной [14, с. 191].

Еще три небольших группы войск должны были сосредоточиться возле Пулав. Для этого 10-тысячный отряд выступает из Белостока, переправляется через р. Буг и следует к месту концентрации. Здесь он соединяется с 20-тысячным отрядом, который прибудет из Брест-Литовска. Еще один, 5-тысячный отряд, выступает из Устилуга и следует к Пулавам через Люблин. В результате возле Пулав сосредоточится 35 тыс. человек под единым командованием (при необходимости, может быть отряжен отряд против Кракова). Затем объединенный корпус должен переправиться через реки Вислу и Пилицу и энергично проследовать к Варшаве [14, с. 191—192]. По мнению автора проекта, поляки будут защищать подход к Висле, но правофланговая колонна отвлечет их внимание и заставит сконцентрироваться севернее Варшавы. Это позволит захватить столицу с юга [14, с. 192]. В ходе операции на территории Княжества Варшавского российские войска должны прибегнуть к реквизициям.

Для обеспечения успеха операции автор также предлагал принять комплекс мер, чтобы «обуздать недобрые намерения жителей наших польских провинций» (т. е. белорусско-литовских губерний), а также заключить мир с Англией и Турцией (ограничиться обладанием крепостей Хотин, Бендеры, Аккерман с прилегающими территориями). Тогда Молдавская армия, по его мнению, сформирует второй эшелон и обеспечит внутреннее спокойствие [14, с. 192].

Итак, дата документа, направления действий войск, их численный состав свидетельствуют о том, что автор был хорошо знаком с российской оперативной подготовкой предшествующего периода. Более того, по ряду элементов «План военных действий» совпадает с российско-прусской Военной конвенцией от 5 (17) октября 1811 г. Содержание же этой конвенции, кроме ее составителей, было известно (в общих чертах) только П. Х. Витгенштейну. Поэтому можно предположить, что автором «Плана войны против французов и их союзников» был либо сам командир корпуса, либо его генерал-квартирмейстер — генерал-майор Ф. Ф. Довре.

В целом же этот проект отвечал мысли М. Б. Барклая де Толли, изложенной в плане наступательной операции 1811 г., когда предполагалась «перемена правительства у ближайших беспокойных соседей» [13, с. 187—189].

Неоспоримым доказательством подготовки Российской империи к проведению в это время наступательной операции является поиск переправ через пограничные реки. 1 марта 1812 г. военный министр отдал секретный приказ генералам И. Н. Эссену, П. Х. Витгенштейну и другим о сборе подробных сведений о местах переправ. Командирам корпусов поручалось описать, до

последней лодки, все имеющиеся на реках плавательные средства, а также наличие материалов, необходимых для наведения переправ.

В частности, командир Обсервационного корпуса отвечал за сбор сведений по рекам Неман, Мречанка и Буг. Поэтому И. Н. Эссен поручил выполнение задания генерал-майору графу П. П. Палену (3-му) — в Белостокской области (по р. Бобр) и по р. Буг, а поручику Свиты е. и. в. по квартирмейстерской части А. А. Бруну — по р. Мречанке. Более того, определенную помощь российским военным оказывали и гражданские чиновники. В частности, гродненскому губернатору В. С. Ланскому поручалось осмотреть и описать суда на реках Неман, Щара и по Огинскому каналу. Для выполнения этого задания сенатор командировал асессора Гродненского губернского правления В. А. Горского «... с надлежащим к исполнению сего поручения наставлением» [16, с. 148; 22, л. 124].

В течение марта задание военного министра было выполнено: исследованы реки Неман, Мречанка, Буг и Бобр, выбраны места переправ (Меречь, Гродно, Крынки, Немиров).

В частности, 7 марта 1812 г. генерал И. Н. Эссен сообщил М. Б. Барклаю де Толли, что поскольку ранее при р. Мречанке строились барки, он нашел местечко Меречь «самым удобным пунктом для переправы» и отправил туда расторопного офицера. При этом корпусной командир отмечал, что «вообще в лодках и частию в барках не будет недостатка», а вот с нужными «для постройки моста» канатами и якорями — будут проблемы. Поэтому И. Н. Эссен поручил «узнать нет ли в реке Вилии нужных для построения через Неман мосту материалов», которые могут быть полезны П. Х. Витгенштейну, «ибо доставление до самого Юрбурга будет не затруднительно» [15, с. 24—25].

Через неделю, 13 марта, И. Н. Эссен представил военному министру сведения относительно других рек своей дистанции. При этом он обратил внимание на то, что в Гродно «всегда бывает летом мост». «Начиная от Бреста в верх по реке Бугу до селения Прилук, — говорилось в документе о первом участке, — расстоянием от города верст 14, на всей сей дистанции неудобности в переправе не случается, на пространстве сем на берегу находятся суден около 70, из коих два рода, одне побольше, называемые Дубаево; на них поместиться могут, на каждой до 200 (человек. — *А. Л.*) и больше, лошадей с удобностью поставить можно 50 и больше, другой сорт Лижбы. На них помещается до 150 человек, или до 40 лошадей. От вышеозначенного селения Прилук, до селения Збунина таковых же судов до 50. Расстояние между сими селениями, тоже 14 верст, со всею удобностью до переправы» [15, с. 275—276; 22, л. 46—47].

Относительно второго участка дистанции корпусной командир докладывал: «По течению реки Буга, ниже Бреста, в селениях Казливичах, Неплях, от города полторы мили 15 судов, оттоль за одну милю в Требуны — пристань для нагрузки, где судов до 7-ми, в полмили далее, в Добронирах — пост

надзирательский, где находится паром, на котором поместиться может человек 30. Оттоль в селении Лозовицах, в полмили, такой же паром еще за полмили в селении Сивпаха, пристань для судов, где бывает нагрузка хлеба, а таковая же за милю и в Бундюгах, за сим селением деревня Крынки, где находится таможня, и там паром несравненно более, прежде объясненных и с удобностью человек до 100 помещаться может, равно как и большие тяжести могут быть перевезены. От Крынок, верстах в трех местечко Немиров, где такой же паром, какой имеется в Крынках» [15, с. 275—276; 22, л. 46—47]. Что касается участка «вниз от местечка Немирова, до места соединений реки Нура с Бугом, и вверх от селения Збунина до местечка Устилуга», то его обследование планировалось провести в ближайшие дни.

Одновременно была проведена подготовка и закупка нужных материалов. Досок в Бресте было достаточно, как и в некоторых селениях. Основная проблема заключалась в отсутствии канатов. Как отмечал 13 марта И. Н. Эссен, «канатов, кроме [тех] на которых паромы ходят, а то вовсе нет, равно и якорев, кроме Бреста» [15, с. 276]. Поэтому 19 марта 1812 г. корпусной командир заказал в Ковно один канат в 120 сажень (по 150 коп. серебром за каждый). Однако затем он узнал, что «при Виленском артиллерийском парке находится старый канат, будучи прежде употребляем, при переправах, который велено артиллерийскою экспедициею продать». Поскольку этот канат был еще пригодным, И. Н. Эссен поручил цейхвахтеру 7-го класса Андрееву приостановить продажу и использовать его по назначению. Командир корпуса просил утвердить его представление, «ибо казна имеет большие издержки, может быть и ненужные, по случаю ожидаемого прибытия понтонных рот» [15, с. 103; 22, л. 42].

Для наведения переправ генерал И. Н. Эссен также предложил использовать не артиллерийских, как предлагалось, а понтонных офицеров, которые находились в Динабурге и «здесь» без понтонов. Сами понтоны были в Брест-Литовске, а их лошади использовались на строительных работах в Бобруйске. Поэтому генерал просил разрешение «заимствовать в случае надобности канаты и якоря у означенных рот». Он также предлагал для переправы использовать и сами понтоны, а лошадей для них выбрать из числа полковых (от «палаточных ящиков») или «лучших обывательских» [15, с. 24—25].

При этом следует обратить внимание, что в рапортах командира Обсервационного корпуса И. Н. Эссена четко указывается основная цель проводимых работ — подготовка наступательной операции, и указывались ее возможные сроки. «*... О сию пору все реки еще не открылись и свободно через оные переправляться можно*, — сообщал генерал 7 марта 1812 г. военному министру, — *но в скорости должны вскрыться, и тогда всякая переправа в рассуждении разлития рек будет невозможна по крайней мере в течение одного месяца*» (выделено мной. — *А. Л.*) [15, с. 24—25; 20, л. 191].

О том, что ранней весной 1812 г. существовала вероятность проведения военной операции на территории Княжества Варшавского и Пруссии, свидетельствуют и другие документы того же периода. Наиболее интересен в этом плане анонимный документ — «Письмо неизвестного», датированый 12 марта 1812 г. [15, с. 68—69] Письмо было адресовано какому-то графу (вероятно, Н. П. Румянцеву или П. Х. Витгенштейну), а его автор был человеком хорошо осведомленным в военных вопросах [15, с. 68].

Согласно его подсчетам, Франция вместе с войсками Рейнского союза в начале войны выставит против России 300 тыс. человек. Поэтому России следует иметь в первой линии столько же, не менее 50 тыс. человек для диверсий, а также не менее 100 тыс. человек на второй линии (т. е. не менее 450 тыс. человек). При этом рекрутские депо должны быть в состоянии пополнить эти войска. Кроме того, следовало занять крепости и укрепленные позиции, заготовить фураж и боеприпасы, создать резерв лошадей, артиллерии и военных транспортов. Автор выражал уверенность, что все эти меры уже приняты, и что в таком случае российские войска «долго будут непобедимыми» [15, с. 68—69].

Более того, он считал, что не в интересах России ожидать «пока враг доберется до ваших границ», и что переход французскими войсками Одера следует рассматривать как объявление войны. Если наполеоновская армия беспрепятственно достигнет Княжества Варшавского и Пруссии, это приведет к потере российских территорий. Противник с легкостью сможет выдвинуться к Риге и, пройдя через Княжество Варшавское, займет Брест, Пинск, Минск, Могилев и Смоленск. В этом случае придется бороться не только против французской армии, но и с восставшим «польским народом» («la nation polonaise»). И тогда России, несмотря на большую армию, будет очень сложно «выбить врага из своих [польских] провинций» [15, с. 69].

Дальнейшие рассуждения автора документа и вовсе уникальны. Он обращал внимание на то, что Наполеон может отказаться от продвижения вглубь России: укрепится в российской «Польше», организует правительство, сформирует большую армию, создаст магазины и тем подготовит плацдарм для дальнейших операций. И только перезимовав, Наполеон может весной начать вторую кампанию «с еще большим упорством». В этом случае война, по мнению автора, может закончиться «не в вашу пользу» [15, с. 69]. Эти мысли совпадали со словами, высказанными Наполеоном в мае 1812 г. в беседе с К. Меттернихом накануне похода в Россию [25, р. 122].

Автор советовал России опередить французов и разбить армию Княжества Варшавского или заставить ее капитулировать. Тогда преимущество на начальном этапе войны будет на российской стороне. Неудачи, которые могли произойти в этом случае, не были бы столь катастрофичными, и силы армии можно было восстановить. При этом автор письма выражал уверен-

ность, что войска Фридриха Вильгельма III не окажут сопротивления, когда российские части вступят на прусскую территорию.

Подобные мысли о проведении наступательной операции против Княжества Варшавского были высказаны и герцогом А. Вюртембергским в предложенном им плане (март 1812 г., заслуживает отдельного последующего рассмотрения) [15, с. 253—275]. Все это свидетельствовало о серьезной подготовке к операции весной 1812 г. И только изменение к апрелю 1812 г. расстановки политических сил в Европе — заключение Пруссией и Австрией союзных договоров с Францией — предопределили отказ России от проведения наступательной операции с целью «смены правительств» у ближайших соседей. Поэтому в апреле 1812 г. начался последний, шестой, этап российского оперативного планирования, который характеризовался выработкой окончательного плана войны, и растянулся до 12 июня 1812 г.

Таким образом, документы оперативного планирования конца 1811 — начала 1812 г. доказывают, что позиция российского руководства в вопросах военно-стратегического планирования на западном театре войны находилась в постоянном развитии или динамике. Несмотря на наличие различных планов ведения войны, процесс военно-стратегического и оперативного планирования замыкался исключительно на имп. Александре I, который вплоть до начала военных действий не мог принять определенного решения.

У візітах праяўляліся ўзаемаадносіны пароха і царкоўнага брацтва. Так, святар Хожаўскай царквы мог засноўваць брацтва, а таксама запісваць імёны братчыкаў у спецыяльную кнігу, дзе агаворвалася колькасць ахвяраванага імі [19, арк. 6]. Вядзеннем падобных «рэестраў імён братчыкаў» займаўся таксама Павел Вернікоўскі, парох Рубяжэвіцкай царквы [19, арк. 92 адв.—93]. Святару Трасцянецкай царквы Адаму Шышкоўскаму, пры аглядзе яго парафіі 2 чэрвеня 1792 г., прадпісвалася заслухоўваць справаздачы братчыкаў аб грашовых паступленнях і выдатках. Акрамя гэтага, братчыкі і парох не мелі права браць грошы на патрэбы царквы са скарбонкі без ведама аднаго з бакоў [19, арк. 44].

Брацтва Гарадзецкай царквы на свае сродкі і сродкі шпітальнікаў утрымлівала шпітальны будынак, дапамагло пароху Багрымоўскаму ў набыцці вялікага алтара [19, арк. 56, 57 адв.]. Брацтва Станькаўскай царквы разам з парохам забяспечвала дыяка жыллём і заробкам [19, арк. 105 адв.]. Брацтва Буцэвіцкай царквы выплачвала арганісту пенсію і прадстаўляла памяшканне пароху [19, арк. 18]. Брацтва Астрашыцка-Гарадоцкай царквы дапамагло пароху ў пабудове новай званіцы [19, арк. 23].

Немалаважным аспектам дзейнасці царкоўнага брацтва прадстаўлялася добраўпарадкаванне могілак, узвядзенне новых і аднаўленне старых царкоўных будынкаў (царквы, званіцы, сядзібы пароха). Пералічаныя накірункі дзейнасці фіксуюцца на прыкладзе царкоўнага брацтва Кіявецкай царквы [19, арк. 72 адв.].

Царкоўныя ўніяцкія брацтвы маглі заключаць фінансавыя пагадненні з іншымі канфесійнымі супольнасцямі. Брацтва Койданаўскай царквы, якое насіла імя Панны Марыі, атрымала прывілей яшчэ ў часы літоўскага харужага Багуслава Радзівіла (1620—1669) сыціць мёд шэсць дзён на год. Пасля таго як царква згарэла, з мэтай яе аднаўлення брацтва 14 лютага 1743 г. узяло ў койданаўскага кагала пазыку на тысячу злотых, якія абавязвалася выплачваць з даходаў ад збыту мёду [19, арк. 98 адв.].

Звычайнай з'явай была наяўнасць у парафіі аднаго царкоўнага брацтва, аднак у вялікіх парафіях такіх брацтваў магло быць два, як на прыкладзе парафіі Станькаўскай царквы. Так, асобнае брацтва існавала там пры Дабрынёўскай капліцы, згодна з прадпісаннем яно «як для маці павінна было даваць сродкі для скарбонкі Станькаўскай царквы» (за непаслухмянства прадугледжвалася пакаранне) [19, арк. 105 адв.—106].

Візіты брацтваў Бабруйскага, Глускага і Рагачоўскага дэканатаў Палескай сурагацыі Кіеўска-Віленскай уніяцкай епархіі за 1784 г. дадаюць новую інфармацыю аб функцыянаванні царкоўных брацтваў. У межах Бабруйскага дэканата называецца дзевяць брацтваў, у Глускім — чатыры, у Рагачоўскім — чатыры [16].

У згаданых апісаннях падкрэсліваецца падпадарадкаванае становішча брацтваў: брацтва Свіслацкай Марыінскай царквы знаходзілася пад кіраўніцтвам пароха [16, арк. 11 адв.], Свіслацкай Мікалаеўскай царквы — «пад упраўленнем пароха і двара» [16, арк. 14]. Аб сваёй дзейнасці брацтвы давалі справаздачу ў выглядзе спецыяльнага дакумента — калькуляцыі, якой фіксавалася штомесячнае паступленне грошаў у царкоўную скарбонку і іх выдаткаванне на розныя патрэбы. Пры гэтым нярэдка пазначаліся непасрэдныя памеры паступленняў і выдаткаў. Так, памер паступленняў у скарбонку Лукаўскай Юр'еўскай царквы складаў 80 рублёў [16, арк. 141 адв.], а выдаткі Свіслацкай Свята-Мікалаеўскай царквы складалі 524 злотых і чатыры грошы [16, арк. 14]. Фіксавалася і наяўная сума ў скарбонцы: для Бабруйскай Іллінскай царквы яна складала ўсяго 20 грошаў [16, арк. 25]. Справаздачнасць аб грашовых паступленнях і выдатках павінна была адбывацца штомесяц, пры гэтым многія брацтвы «калькуляцыі» не прадстаўлялі. Так, брацтва Дуброўскай царквы не прадстаўляла пароху справаздачу аб сваёй дзейнасці па той прычыне, што не вяло рэестраў аб паступленні і выдаткаванні грошаў [16, арк. 87]. Некаторыя брацтвы ўвогуле адмаўляліся ад падпарадкавання пароху, як брацтва Галынскай царквы, якое сабраныя для царкоўных патрэб сродкі трымала пры сабе [16, арк. 16 адв.].

Некаторыя брацтвы Бабруйскага дэканата надавалі ўвагу асветніцтву. Брацтва Панюшкаўскай царквы, акрамя набыцця царкоўнага рыштунку, дапамагала пароху ў навучанні парафіян асновам веры, катэхізісу і пацерам [16, арк. 19]. Брацтвы Стрэшынскай Марыінскай і Салонскай Раства-Багародзіцкай цэркваў раз на год займаліся вырабам воску для прыгатавання свечак на прастольнае свята [16, арк. 123, 126 адв.]. Два разы на год гэтай справай займаліся кцітары Рэчыцкай Свята-Мікалаеўскай царквы Глускага дэканата і Лукаўскай Юр'еўскай царквы Рагачоўскага дэканата [16, арк. 116—116 адв., 142 адв.]. У першым выпадку такая з'ява была звязана са святкаваннем дня веснавога і восеньскага памінання Святога Мікалая Мірлікійскага, у другім выпадку — Святога Георгія (Юр'я), якія, паводле народнай традыцыі, лічыліся апекунамі земляробства. Але, калі ў прыведзеных выпадках брацтвы ажыццяўлялі працэс вырабу воску на падставе фундушовых запісаў, то кцітары Заспенскай царквы Глускага дэканата рабілі гэта самавольна [16, арк. 111].

Даволі цікавая акалічнасць закранаецца пры апісанні брацтва Лукаўскай царквы. Так, братчыкі з вёскі Лукі не прадстаўлялі пароху справаздач аб паступленнях і выдатках. У той жа час братчыкі са Слабады падавалі «калькуляцыю» пароху [16, арк. 141 адв.]. Паводле рэфармацыйнага дэкрэта лукаўскім братчыкам прадпісвалася скласці справаздачу аб рахунках за апошнія шэсць месяцаў [16, арк. 142 адв.]. Падобны выпадак сведчыць аб тым, што брацтва пры Лукаўскай царкве не было маналітным утварэннем.

Візіты цэркваў Бабруйскага дэканата за 1792 г. змяшчаюць інфармацыю аб сямнаццаці царкоўных брацтвах, якая дапаўняе сабой звесткі папярэдняй візіты [23].

Брацтва Любоніцкай Марыінскай царквы мела права на кожны кірмаш вырабляць па шэсць камянёў* мёду і ў тры дні прадаваць яго. Грошы, атрыманыя ад продажу мёду, брацтва мелася патраціць на набыццё воску, ільну, намётак, палатна. Палова ад набытага ішла да пароха, другая палова — на патрэбы царквы. У царкоўнай скарбонцы на момант складання візіты знаходзілася 105 злотых [23, арк. 3]. Але на захаванні ў царкве маглі быць не толькі грошы. Так, у скарбонцы Брожскай Марыінскай царквы, акрамя 19 рублёў, меліся 10 фунтаў воску, 40 старых намётак і 20 новых [23, арк. 8 адв.].

Візіты Бабруйскага дэканата за 1792 г. фіксавалі не толькі колькасць наяўных у скарбонцы сродкаў, але і колькасць фінансаў, што былі пазычаны. Так, са скарбонкі Свіслацкай Мікалаеўскай царквы рознымі асобамі было пазычана 554 злотыя [23, арк. 27], а са скарбонкі Панюшкаўскай Раства-Багародзіцкай царквы валасцяне пазычылі 52 злотыя і 18 грошаў [23, арк. 24].

* Камень — адзінка масы сыпкіх рэчываў і штучных тавараў у рознічным гандлі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Літоўскі камень быў роўны каля 15 кг.

У той час як большасць брацтваў два або тры разы на год займаліся прыгатаваннем і продажам мёду, меліся і выключэнні з правілаў. Напрыклад, брацтва пры Гарбацэвіцкай царкве «кануну не сыціць, толькі ахвяраваннямі ільну, воску і намётак (тканіны. — *В. У.*), якія збываюцца продажам, атрымлівае сродкі ў царкоўную скарбонку, у якой 16 злотых» [23, арк. 17].

Некаторыя брацтвы Бабруйскага дэканата за 1792 г. знаходзіліся не пад упраўленнем пароха, а ажыццяўлялі сваю дзейнасць пад кіраўніцтвам двара. Гэта адносіцца да дзейнасці брацтваў Слабада-Каралеўскай царквы імя Панны Марыі і Карытнянскай царквы імя Святога Базыля [23, арк. 7, 14 адв.]. Так, як засведчана ў візіце, двор цераз брацтва Слабада-Каралеўскай Марыінскай царквы «ўсялякія царкоўныя патрэбы і аздобы забяспечвае і ахайна зберагае» [23, арк. 7].

Выпадкі існавання двух асобных брацтваў пры цэрквах пацвярджаюцца на прыкладзе Карытнянскай Базылеўскай царквы, дзе адно брацтва функцыянавала пры царкве, а другое — пры Замошскай капліцы [23, арк. 14 адв.].

У візітах Цырынскага дэканата Навагрудскай сурагацыі за 1793 г. маюцца запісы аб васьмі царкоўных брацтвах [22]. Утварэнне брацтваў адбывалася, галоўным чынам, на падставе прадпісання візітатараў парафіяльным святарам, якія абавязаліся схіляць на тое сялян. Гэта прасочваецца на прыкладзе Сноўскай Пятра-Паўлаўскай і Ястрэмбельскай Мікалаеўскай цэркваў [22, арк. 18, 61 адв.]. Зацвярджаліся брацтвы з дазволу навагрудскага афіцыяла ці кансісторa як у выпадку з Гарадзішчанскай царквой Святых Тадэвуша і Сымона-Іуды, Навамышскай Праабражэнскай царквой [22, арк. 39 адв., 57 адв.]. Сустракаліся выпадкі фінансавых пагадненняў паміж парохам і дэканам. Так, адміністратар Навамышскай царквы Антоній Мурашка разам з брацтвам быў абавязаны выплачваць дэкану працэнт з запазычанай некалі сумы ў 100 злотых [22, арк. 59]. Цікавым фактам, які рэдка фіксуецца ў візітах, з'яўляецца абавязак брацтва Малеўскай Мікалаеўскай царквы акрамя сычэння (вырабу) мёду два разы на год займацца лоўляй рыбы [22, арк. 10 адв.]. Некаторыя парохі ў адносінах да сваіх парафіян былі ўпаўнаважаны да ажыццяўлення судовай функцыі. Так, адміністратар Мірацікай Міхайлаўскай царквы Фларыян Пятровіч абавязаны быў «урад суддзі выконваць, вінных не абараняць» [22, арк. 36].

Сялянская штодзённасць на прыкладзе візітаў таксама закранаецца ў раздзеле «Дакументы» або «Фундуш», дзе пералічаюцца акты надання царкве рухомай і нерухомай маёмасці. Да рухомай маёмасці належалі сяляне, абавязкі якіх на карысць царквы падрабязна апісваліся ў дакументах аб падараванні. Так, Юзаф Галінскі, аршанскі войскі, 3 лютага 1738 г. падараваў Хоўхлаўскай царкве двух падданых Адама Любецкага і Яна Каравая з сем'ямі. Тут жа падрабязна рэгламентавалася іх гаспадарчая дзейнасць: для мужчын адпрацоўка паншчыны на вызначанай паўвалоцы складала тры дні, для жанчын — два дні; зімой адзін дзень у тыдзень неабходна было працаваць для царкоўных

патрэб. За гэтае падараванне парох быў абавязаны кожны тыдзень адпраўляць імшу за душы фундатараў [19, арк. 61]. Чатыры сялянскія двары ў вёсцы Скарадкі мела ў сваім валоданні Маркаўская Троіцкая царква на 3 лютага 1799 г. Сяляне Фёдар і Варынец Такайлы, Сымон Мазуль са сваімі сем'ямі адбывалі паншчыну зімой і летам па тры дні ў тыдзень, а Міхал Казёл плаціў 40 злотых чыншу штогод за карыстанне паўвалокай сенажаці [17, арк. 5]. Але ў той час, калі многія цэрквы мелі ў сваім гаспадаранні некалькі двароў, то ўласнасцю Дзмітравіцкай царквы Прарока Іллі ў 1784 г. з'яўлялася цэлая вёска Дзмітравічы. Падданыя Мірон і Грышка Лобачы з сем'ямі абавязаны былі адбываць два дні паншчыны на тыдзень, плаціць шэсць злотых чыншу ў год. Гаспадары яшчэ чатырох двароў з сем'ямі адбывалі адзін-два дні паншчыны на тыдзень, штогод плацілі па чатыры польскія злотыя. Акрамя гэтага, сяляне плацілі падымнае ў скарб Рэчы Паспалітай, мужчыны двойчы на год вазілі тавар на гандаль, жанчыны былі занятыя ў прапалцы агародаў і зборы агародніны [14, арк. 5—5 адв.]. У візіце Маламажэйкаўскай Раства-Багародзіцкай царквы за 26 студзеня 1792 г. інфармацыя падаецца больш шырэйшая. Так, акрамя памераў паншчыны, чыншу і дадатковых павіннасцей падрабязна апісваюцца жылыя і гаспадарчыя пабудовы, зямельныя ўгоддзі плябанскіх падданых, колькасць хатняй жывёлы (валоў, кароў, кляч, авечак, свіней) [27, с. 46]. Увесь комплекс дадзенай інфармацыі напрамую адносіцца да гаспадарчай сялянскай штодзённасці.

Пры апісанні парафій таксама фіксаваліся правапарушэнні, якія здзяйсняліся парафіянамі ў адносінах да царкоўнай уласнасці. Так, пры апісанні «рэзідэнцыі» Сенніцкай царквы Мінскага дэканата 1 чэрвеня 1792 г. генеральны візітатар Карнэліўш Вернікоўскі згадваў, што сяляне вёскі Вяленцэвічы забралі са скарбонкі, якую напаўнялі яшчэ іх дзяды і бацькі, торбу з двумастамі злотымі. Ён загадаў мясцоваму пароху Якубу Сушчынскаму прадпрыняць усе магчымыя захады па вяртанні азначанай сумы, а таксама раіў замыкаць скарбонку на замок, змацоўваць яе пячаткай ксяндза. Акрамя гэтага, святару прадпісвалася, каб «хвалебным прыкладам ясную навуку нёс людзям, сам усталёўваў час набажэнства, маральныя запаветы часта чытаў, заахвочваў люд наведваць храм, яснавельможных калятараў у спрыянні гэтаму прасіў, быў напоўнены духам спакою і згоды з сямейнікамі, сам сябе абавязаў выканаць гэта рашэнне» [19, арк. 42 адв.].

Генеральны візітатар у Рэчыцкім павеце і дэканаце Тадэвуш Лебядзінскі фіксаваў 23 лютага 1800 г. у парафіі Капліцкай Юр'еўскай царквы з'яву растраты кцітарам і капліцкімі парафіянамі тых сродкаў, якія былі зароблены з продажу воску, сычанага «на канун», і якія меркавалася патраціць на куплю царкоўных кніг, патрэбных для адпраўлення богаслужэння. Візітатар усталяваў наступны парадак дзейнасці па ўтрыманні скарбонкі: кцітар і два братчыкі абавязваліся захоўваць яе разам з сабранымі грашыма пад двума ключамі, адзін ключ знаходзіцца ў пароха, а другі ў кцітара; выдача грошай на патрэбы

царквы павінна рабіцца з супольнай згоды ўсіх чатырох; парох Сымон Мажароўскі, кцітар Дзямьян Кавалёў і братчыкі Лук'ян Краўчонак і Пракоп Салуянчык будуць прымаць воск раз на год ад трох спецыяльна падабраных для яго вырабу людзей [18, арк. 69—69 адв.]. Галоўнай мэтай гэтай рэгламентацыі з'яўлялася тое, што ніхто не меў права карыстацца царкоўнай скарбонкай для ўласных патрэб.

Цікавым фактам з'яўлялася прадпісанне пароху Крысаўскай царквы Узнясення Гасподняга забараніць сваім вернікам пераходзіць да рымскага абраду пад пагрозай адлучэння ад «супольнасці верных хрысціян» [19, арк. 102 адв.]. Верагодна, аналагічныя выпадкі пераходу мелі месца.

Аднак для большасці мясцовасцей такая з'ява не была ўласціва. Недаверлівыя адносіны сялян-уніятаў да лацінскай, а значыць, каталіцкай, чужароднай граматы прадвызначала іх нежаданне ў шэрагу парафій аддаваць дзяцей на навучанне ў лацінскія школы. Па гэтай прычыне ў Пухавіцкім дэканаце ў 1780-я гг. для адукацыі дзяцей на «рускай» мове выкарыстоўвалася «даўняя школа ў Дукоры, у якую пад карай у 40 грывен парафіяне мусяць дзяцей да 1 верасня пазавозіць». Пад «рускай» мовай, верагодна, разумеецца царкоўнаславянская (а быць можа, і старабеларуская) кірылічная мова. Кожны з дваццаці парохаў абавязваўся размясціць вучняў па вызначаных для іх пакоях. Выхаваннем і навучаннем у школе займаўся наняты за плату дырэктар. Зазначалася, што дукорскі парох Клюеўскі «павінен трымаць добрага дырэктара, абы ў царкоўных уставах моладзь удасканальваў і ў іншых навуках пільна навучаў, абы тыя да ніякіх забаў не былі захоплены...» [3, s. 150; 24, арк. 135—136].

Пад адну вокладку з загалоўкам «Візіта царквы» траплялі і тыя дакументы, якія не з'яўляліся апісаннямі, але мелі адносіны да пэўнай царквы. Так, у падобнай справе, прысвечанай Мацеевіцкай царкве, змешчаны патэнт мацеевіцкаму святару Міхалу Пекарскаму на далучэнне да яго парафіі жыхароў вёскі Суцін з правам ажыццяўлення над імі сваёй душпастырскай дзейнасці за 9 снежня 1771 г., а таксама фундушовыя запісы, інвентар і акт абмежавання за 11 лютага 1762 г., метрычныя запісы за 1772—1793 гг. [25, арк. 1—11]. Яны таксама пад пэўным вуглом адлюстроўваюць штодзённасць жыхароў Мацеевіцкай парафіі, але да непасрэдных візітаў адносін не маюць.

Прыватная штодзённасць сялян характарызуецца прысутнасцю зародкаў сістэмы адукацыі і рэгламентаванага ў візітах парадку вывучэння пацераў, катэхізіса і іншых святых тэкстаў, што было неабходна для выратавання душы верніка. Удзел у гэтай дзейнасці маглі прымаць і царкоўныя брацтвы.

Грамадская штодзённасць сялян праяўлялася ў дзейнасці брацтваў, якія складаліся з парафіян і кантралявалі паступленне ў царкоўную скарбонку грашовых ахвяраванняў і міласціны ад парафіян, прымалі ўдзел у прыгатаванні і продажы воску, мёду, іншых напояў (гарэлкі і піва), лоўлі рыбы, займаліся пабудовай і рамонтам царквы, капліц і званіц, упарадкаваннем могілак. Цар-

коўнае брацтва магло ажыццяўляць дзейнасць пад кіраўніцтвам пароха, двара або самастойна, а таксама выступаць суб'ектам юрыдычных прававадносін. Яно дапамагала пароху ўтрымліваць шпіталь і школу, а таксама выплачваць заробак дыяку і арганісту. У парафіі магло быць некалькі брацтваў: адно змяшчалася пры царкве, а астатнія пры капліцах.

Гаспадарчая штодзённасць фіксуецца ў згадках аб гаспадарчай дзейнасці царкоўных сялян, што часцей за ўсё праяўляецца ў фундушах.

З усяго сказанага магчыма заключыць, што візіты фіксавалі і рэгламентавалі ўнутранае жыццё кожнай парафіі. Менавіта на падставе іх магчыма вызначыць уплыў духоўнай асобы пароха і сацыяльнага інстытута царкоўнага брацтва на бытавое і духоўнае жыццё вёскі. Візіты ўніяцкіх храмаў характарызуюцца адсутнасцю шаблоннасці, а менавіта вялікай колькасці паўтораў з іншымі візітамі пры апісанні аднатыпных з'яў. Падобная акалічнасць надае кожнай асобнай візіце своеасаблівы каларыт.

Крыніцы і літаратура

1. Gil, A. Unickie cerkwi Brześcia w opisie wizytacyjnym z 1726 roku / A. Gil // Rocznik Europy Srodkowo-Wschodniej. Rok (4) 2006. — S. 25—51.
2. Gil, A. W kręgu dziejów i kultury Kościołów wschodnich w Rzeczypospolitej / A. Gil. — Siedlce, 2009. — S. 67—95.
3. Greckokatolickie dekanaty błoński i puchowicki w latach 1783—1784 / Wstęp i opracowanie Irena Wodzianowska. — Sandomierz, 2006.
4. Księga wizyty dziekańskiej dekanatu podlaskiego przeze mnie księdza Bazylego Benedykta Guttorskiego dziekana podlaskiego, plebana golniewskiego w roku 1773 miesiąca Novembra dnia 17 iuxta vetus kalendarza sporządzona. Opracowali Józef Maroszek, Waldemar F. Wilczewski. — Białystok, 1996. — Aneks I. — Wizytacja generalna unickiey cerkwi białostockiej przeprowadzona 25 listopada 1804 roku przez księdza Leona Kraskowskiego. — S. 143—156.
5. Sygowski, P. Brasławski dekanat unickiej «Dyecezyi Polsko-Polockiej» (cerkwie i ich wyposaïenie) w świetle wizytacji z roku 1789 / P. Sygowski // Studia nad sztuką Renesansu i Baroku; pod red. J. Lileyko i J. Rolskiej-Boruch. — T. V. — Lublin: Towarzystwo Naukowe KUL, 2004. — S. 393—422.
6. Wizitacje generalne parafii unickich w województwie Kijowskim i Bracławskim po 1782 roku / Towarzystwo Naukowe Katolickiego Uniwersytetu Lubielskiego; opracował i wydał M. Radwan. — Lublin: Towarzystwo Naukowe KUL, 2004. — 912 s.
7. Wizytacje cerkwi unickich dekanatu Nowodworskiego diecezji Supraskiej 1804 roku. Opracowali P. Borowik i G. Ryżewski. — Białystok, 2009. — 184 s.
8. Візіты уніяцкіх цэркваў Мінскага і Навагрудскага сабораў 1680—1682 гг.: Зборнік дакументаў / Укладальнік Д. В. Лісейчыкаў. — Мінск: І. П. Логвінаў, 2009. — 270 с.
9. Лісейчыкаў, Д. В. Візіты і інвентары уніяцкіх храмаў Беларусі як крыніца па гісторыі штодзённасці (паводле матэрыялаў НГАБ) / Д. В. Лісейчыкаў // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Вып. 6. — Мінск: БелНДІДАС, 2005. — С. 94—101.
10. Лісейчыкаў, Д. В. Маральны стан уніяцкага кліру ў Беларусі напярэдадні скасавання уніі (30-я гг. XIX ст.) / Д. Лісейчыкаў // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 3; рэдкал.: А. К. Галубовіч (старш.) і інш. — Мінск: НГАБ, 2005. — С. 44—49.

11. Лісейчыкаў, Д. В. Плябанская гаспадарка уніяцкага святара ў Беларусі ў XVIII ст. / Д. В. Лісейчыкаў // Весці Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. — № 5. — Ч. 2; рэд. кал.: П. Г. Нікіценка (гал. рэд.) і інш. — Мінск: Беларуская навука, 2005. — С. 44—46.
12. Лісейчыкаў, Д. В. Штодзённае жыццё уніяцкага парафіяльнага святара беларуска-літоўскіх зямель 1720—1839 гг. / Д. Лісейчыкаў. — Мінск: Медысонт, 2011. — 198 с.
13. М(альшевский), Н. Заметка о визитах как хранилищах исторических сведений и документов (на память о митрополите Иосифе) / Н. М. // Литовские епархиальные ведомости. — 1869. — № 10. — С. 658—662.
14. НГАБ (Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі). — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41238. — Візіты Дзмітравіцкай царквы Барысаўскага пав., 1774—1803 гг.
15. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41240. — Візіты цэркваў Мазырскага, Петрыкаўскага, Тураўскага і Убарцкага дэканатаў, 1777—1787 гг.
16. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41241. — Візіты цэркваў Бабруйскага, Глускага і Рагачоўскага дэканатаў, 1784 г.
17. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41242. — Візіты Маркаўскай царквы Вілейскага пав., 1788—1814 гг.
18. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41244. — Візіты цэркваў Лідскага дэканата 1792 г., Мазырскага, Рэчыцкага і Тураўскага дэканатаў 1800 г., Пагосцкага дэканата 1801—1802 гг., Мазырскага і Рэчыцкага дэканатаў 1802 г. і Рэчыцкага дэканата 1803 г.
19. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41245. — Візіты цэркваў Мінскага дэканата, 1792—1793 гг.
20. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41246. — Візіты Вітуніцкай царквы Барысаўскага пав., 1799 г., 1817 гг.
21. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41247. — Візіты цэркваў Любяшоўскага, Мазырскага, Нобельскага, Пагосцкага і Тураўскага дэканатаў Брэсцка-Пінскай дыяцэзіі, 1799 г.
22. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41248. — Візіты цэркваў Цырынскага дэканата Навагрудскай сурагацыі, 1793 г.
23. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41268. — Візіты цэркваў Бабруйскага дэканата, 1792 г.
24. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41285. — Візіты цэркваў Блонскага і Пухавіцкага дэканатаў, 1783—1784 гг.
25. НГАБ. — Ф. 136. — Воп. 1. — Спр. 41289. — Дакументы Мацеевіцкай царквы Пухавіцкага дэканата, 1771—1793 гг.
26. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Калінкавіцкага раёна. — Мінск: Ураджай, 1999. — С. 60—61 [Візіта Азарыцкай уніяцкай царквы, 29 студзеня 1778], 62—63 [Генеральная візіта Каленкавіцкай уніяцкай царквы, 21 лютага 1778].
27. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Шчучынскага раёна. — Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2001. — С. 45—48 [Візіта Маламажэйкаўскай уніяцкай царквы, 26 студзеня 1792].
28. Скочиляс, І. Генеральні візитації Київської унійної митрополії XVII—XVIII століть. Львівсько-Галицько-Кам'янецька єпархія. Протоколи генеральних візитацій / І. Ско-

чиляс. — Львів: Видавництво Українського Католицького Університету, 2004. — Т. 2: — CCVIII+512 с.

29. Скочиляс, І. Генеральні візитації в українсько-білоруських єпархіях Київської уніатської митрополії. 1596—1720 роки / І. Скочиляс // Записки наукового товариства імені Шевченка. — Львів, 1999. — Т. CCXXXVIII: Праці Історично-філософської секції. — С. 46—94.
30. Скочиляс, І. Протоколи генеральних візитацій церков Київської уніатської митрополії XVIII століття (на прикладі недатованої єпископської ревізії Щирецького намісництва) / І. Скочиляс // Записки наукового товариства імені Шевченка. — Львів, 1999. — Т. CCXXXVIII: Праці Історично-філософської секції. — С. 434—514.
31. Хроніка Убарцкага Палесся / Аўтар-уклад. А. І. Атнагулаў; навук. рэд. В. Л. Насевіч. — Мінск: Тэхналогія, 2001. — 496 с.
32. Цвірка, А. А. Візіты Заслаўскай уніяцкай царквы Праабражэння Гасподняга за 1681, 1792 гг. / А. А. Цвірка, З. Л. Яцкевіч // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Вып. 6. — Мінск: БелНДІДАС, 2005. — С. 230—246.
33. Яцкевіч, З. Л. Цырынскі грэка-каталіцкі дэканат / Зміцер Яцкевіч // Адам Міцкевіч і нацыянальныя культуры: Матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі (Мінск, 7—11 верасня 1998 г.). — Мінск: Беларускі кнігазбор, 1998. — С. 428—436.
34. Яцкевіч, З. Л. Візіты Блоньскага і Пухавіцкага уніяцкіх дэканатаў 1783—1784 гг. / З. Л. Яцкевіч // Архіварыус: зб. навук. паведамл. і арт. — Вып. 4. — Мінск, 2006. — С. 76—79.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 16.04.2012*

**_Г. М. Брэгер,_**
_вядучы палеограф_
_аддзела старажытных актаў НГАБ;_

**_Л. А. Лінская,_**
_старшы навуковы супрацоўнік НМГКБ_

# АРХІЎ СЛУЦКАГА ТРАЙЧАНСКАГА СВЯТА-ТРАЕЦКАГА МАНАСТЫРА (ДАКУМЕНТЫ 436—532 ЗА 1733—1746 гг.)

Працягваем публікацыю апісання дакументаў архіва Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра, якія захоўваецца ў фондах Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, распачатую ў мінулых выпусках «Беларускага археаграфічнага штогодніка» [1].

Прадстаўлена 97 дакументаў за 1733—1746 гг. (№№ 436—532). Сярод іх выдзяляюцца скаргі праваслаўных святароў і мяшчан на ўніяцкіх і каталіцкіх ксяндзоў аб захопе цэркваў і іх маёмасці (№ 436, 472, 482, 489), нявыдачы радзівілаўскімі аканомамі фундушаў для цэркваў (№ 438, 479) і інш. Цікавыя дакументы аб аднаўленні разбуранай царквы Трайчанскага манастыра (№ 441—443), выбарах паслоў на Сойм ад праваслаўнага духавенства (№ 444). Таксама маюцца пацвярджальныя прывілеі каралёў і Радзівілаў на правы і фундушы праваслаўнаму духавенству Слуцкага княства (№ 451, 483, 487). Як заўсёды шырока прадстаўлены дакументы фінансава-эканамічнай дзейнасці ўладанняў Слуцкай архімандрыі, яе цэркваў і манастыроў, прыватнага жыцця праваслаўных іерархаў і простых святароў, а таксама дакументы, датычныя некаторых манастыроў і цэркваў па-за межамі Слуцкай архімандрыі.

436. Супліка вікарыя Слуцкай саборнай замкавай царквы Захарыя Мардзвіловіча слуцкаму архімандрыту, генеральнаму намесніку Кіеўскай мітраполіі аб гвалтах і шкодах Зблянскай царкве [Лідскага пав.], куды быў прызначаны 26.09.1732 для нагляду, з боку адміністрацыі маёнтка Беліца, аб смерці зблянскага празбітара Яна Ківачыцкага, захопе царквы і яе фундушаў сіняўскім празбітарам Грыгорыем Ральцэвічам, і з просьбай звольніць яго ад нагляду за царквой у сувязі з узмацненнем у тым раёне ўніі. Без месца і даты [1733].

Подпіс: Захары Мардзвіловіч, вікары царквы саборнай замкавай слуцкай.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 953—954; арк. 954 чысты, з затылкам).

437. Квіт Ізака Гловача, прызначанага намеснікам Заблудаўскага манастыра, аб атрыманні пры ад’ездзе ў Заблудаў ад слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага дакументаў гэтага манастыра ў колькасці 14 штук. Архімандрыя Слуцкая, 21.02.1733.

Подпіс: Ізак Гловач, н[амеснік] з[аблудаўскі].

Арыгінал. Пол. м. Фрагмент філіграні. Стар. сігн.: № 10. 1 арк. (арк. 955).

438. а) Супліка слуцкага грэка-рускага (праваслаўнага) духавенства канцлеравай ВКЛ Ганне Радзівілавай аб нежаданні жыдоў, арандатараў чопавага ў Слуцку, даваць слуцкім цэрквам, паводле фундушаў, 16 каменяў воску штогод, аб выбіранні камандуючым слуцкім гарнізонам Тротам стацый і іншых падаткаў на жаўнераў з цэркваў насуперак прывілеяў і аб інш. шкодах. Без месца і даты.

Копія подпісу: духавенства грэка-рускае слуцкае.

б) (на адв. арк. 957). Загад кн. Ганны Радзівілавай на папярэднюю супліку, каб слуцкім цэрквам слуцкія жыды-арандатары штогод выдавалі воск, адміністрацыя замка дазваляла бясплатна па суботах браць дрэва на ацяпленне і рамонт цэркваў, і аб вызваленні цэркваў ад стацый слуцкага гарнізона. Замак Слуцкі, 13.03.1733.

Копія подпісу: А[нна] кн[ягіня] Радзівілавая.

в) Ліст С. М. Градэцкага з загадам арандатарам шосавага выдаць слуцкаму праваслаўнаму духавенству паводле распараджэнняў кн. Г. Радзівілавай 6 каменяў воску. Слуцк, 18.03.1734.

Копія подпісу: С. М. Градэцкі, П. Ч.

г) (на арк. 957) Арыгінал ліста кн. Г. Радзівілавай да п. Градэцкага з распараджэннем выконваць яе мінулы загад (№ 438-б) і вярнуць цэрквам ужо спагнаныя падаткі. Замак Бяльскі, 18.07.1735.

Пячатка на чорным сургучы і подпіс: А[нна] Радзівілавая.

Тагачасныя копіі тэкстаў а)—в), арыгінал тэксту г).

Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 60; № 83. 2 арк. (арк. 956—957).

439. Прыватны ліст (пісьмо) празбітара капыльскай царквы Стэфана Маўчановіча да слуцкага архімандрыта з паведамленнем, што ён, вярнуўшыся з Навагрудка да сваёй царквы, з-за святаў не мог паехаць да Слуцка і абяцае прыехаць пазней, даць калькуляцыю грошай і паведаміць аб сваіх справах. Без месца і даты.

Копія подпісу: Стэфан Маўчановіч, празбітар царквы Капыльскай.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 958).

440. Асекурацыйны ліст пані Аскеркавай, дадзены слуцкаму архімандрыту кс. Аранскаму, з абяцаннем вярнуць у тэрмін пазычаныя 6000 штук цэглы. Слуцк, 7.04.1733.

Подпіс: Аза (?) Аскеркавая, КВН (кашталянавая ваяводства Навагрудскага).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 959).

441. а) Выпіс з кніг кансісторскіх Кіеўскай архіепіскопіі і кніг праўных Кіеўскай катэдры 7.05.1733. Консэнс (дазвол) караля Аўгуста II грэка-рускаму духавенству места Слуцка на рэстаўрацыю разбуранай мураванай царквы Св. Тройцы на прадмесці Слуцкім, належачым Слуцкай архімандрыі, ва ўладаннях княжны Нейбурскай. Варшава, 20.12.1720.

Копія подпісу: Augustus Rex.

Пячатка кустадыйная. Кансісторыі Кіеўскай архіепіскопіі.

Подпісы: Рафаэль Забароўскі, архіепіскап кіеўскі; Юзаф, архімандрыт Св.-Мікольскі Кіеўскі, суддзя кансісторыі духоўнай катэдры архіепіскопіі Кіеўскай; Амброжы Дубневіч, архімандрыт і рэктар Калегіума Кіеўскага, суддзя судоў кансісторскіх; Кіева-Міхалаўскага манастыра ігумен Алексі Пятрына, архіепіскопіі Кіеўскай судоў духоўных суддзя; Тэадозі Глінскі, ігумен манастыра Свята-Траецкага Кірыльскага (?) Кіеўскага; Сыльвестр Думніцкі, намеснік катэдры архіепіскопіі Кіеўскай; Тэафан Трафімовіч, архідыякан катэдры Кіеўскай; Герман Канашэвіч, экзаменатар архіепіскопіі Кіеўскай.

б) Нататка, што арыгінал гэтага прывілея-консэнса 3.07.1732 падаў у кнігі кансісторскія і кнігі праўныя Кіеўскай архіепіскопіі айцец Юзаф Аранскі, які прыехаў у Кіеў для пасвячэння на Слуцкую архімандрыю, з якіх цяпер выдадзены гэты выпіс. [Кіеў, 7.05.1733].

Подпіс: Тыматэуш Шчарбацкі, у катэдры кіеўскай пісар.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 37; № 12; 4. 2 арк. (арк. 960—961).

442. а) Выпіс з кніг кансісторскіх Кіеўскай архіепіскопіі і кніг праўных Кіеўскай катэдры 7.05.1733. Консэнс (дазвол) аблегата і пленіпатэнта Генрыка Вільгельма Крамердэ Клауспруха ад імя палаціна рэнскага кн. Караля Філіпа і яго жонкі кн. Элізабеты Аўгусты [з Радзівілаў] слуцкаму праваслаўнаму духавенству на рэстаўрацыю царквы ў Св.-Траецкім манастыры Слуцкай архімандрыі. Варшава, 20.12.1720.

Копія подпісу: Генрык Вільгельм Крамедрэ Клауспрух.

Пячатка на кустодыі кансісторыі Кіеўскай архіепіскопіі.

Подпісы тых жа асоб, што ў № 441а.

б) Нататка, аналагічная як у № 441б.

Подпіс: Тыматэуш Шчарбацкі, катэдры Кіеўскай пісар.

Арыгінал. Лацін. (а) і пол. (б) м. Філігрань. Стар. сігн.: № 74. 2 арк. (арк. 962—963).

443. Ліст архітэктара Бартламея Шыслоўскага і яго памочнікаў аб атрыманні ад слуцкага Св.-Траецкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Тэадозія Ваўковіча 2000 зл. на мураванне царквы ў Св.-Траецкім кляштары і з абяцаннем распачаць працу 23.04.1732. У кляштары Св.-Траецкім Архімандрыі Слуцкай, 30.09.1731.

Подпісы: Бартломі Шыслоўшкі, М. К. М.; Марцін Лукашэвіч; Юзаф Вялічка (крыжык); Крыштаф Жукоўскі (крыжык).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 964—965; арк. 965 чысты, з затылкам).

444. Прыватны ліст (пісьмо) брацкага пісара Андрэя Талаконскага-Пашкевіча ад імя Віленскага Крыжаноснага брацтва пры царкве Св. Духа да братчыкаў слуцкіх брацтваў Праабражэння Гасподня і Успенскага пры саборнай

замкавай царкве з паведамленнем, што цяпер Віленскае брацтва не можа абраць паслоў ад праваслаўнага духавенства на будучы элекцыйны сойм у Варшаве ў сувязі з адсутнасцю старшага іх кляштара Св. Духа, які знаходзіцца па кляшторных патрэбах пры Расійскім імператарскім двары. З манастыра п[анства] б[рацкага] Віленскага, 6/17.07.1733.

Подпіс: Андрэй Талаконскі-Пашкевіч, брацкі пісар.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 966—967; арк. 967 чысты, з адрасам, пашкоджаны).

445. Прыватны ліст (пісьмо) старосты Слуцкай замкавай царквы Геліяша Паўлюшыца ад імя Успенскага брацтва пры гэтай царкве да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай архіепіскопіі Юзафа Аранскага з просьбай хадайнічаць перад кіеўскім архіепіскапам аб прызначэнні святаром іх царквы Захарыяша Мальца. Слуцк, 29.08.1733 (стары стыль).

Пячатка на кустодыі (на адвароце арк. 969) Слуцкага Успенскага брацтва.

Подпіс: Геліяш Паўлюшыц, староста царквы замкавай слуцкай.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 968—969; арк. 969 чысты, з адрасам і пячаткай).

446. Другі экзэмпляр дакумента № 445.

Пячатка і подпіс такія ж, як на дакуменце № 445.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 970—971; арк. 971 чысты, з адрасам і пячаткай).

447. Квіт камісараў, выдадзены духавенству Слуцкага манастыра, якое са свайго маёнтка Пасекі, з 26 дымоў, далучыўшыся да Слуцкай архімандрыі, выдала пешых жаўнераў з узбраеннем і грашовым утрыманнем. Навагрудак, 8.04.1734.

Подпісы: Францішак Д. Гарбачэўскі, столь[нік] НС [Навагрудка Северскага] і камісар; Міхал К[азімі]р Дашкевіц, падстароста, рэгент гродскі і камісар в[аяводств]а Наваг[рудскага].

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 972).

448. Адсутнічае.

449. Квіт камісараў, выдадзены слуцкаму архімандрыту Юзафу Аранскаму, які з маёнткаў Слуцкай архімандрыі, манастырскіх і царкоўных вёсак, усяго 196 дымоў, выдаў 11 пешых жаўнераў з узбраеннем і грашовым утрыманнем. Навагрудак, 10.04.1734.

Подпісы: Францішак Д. Гарбачэўскі, столь[нік] Наваг[рудка] Сев[ерскага] і камісар; Міхал К[азі]м[і]р Дашкевіц, падстароста, рэгент гродскі в[аяводств]а Наваг[рудскага].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 973).

450. Ліст-обліг слуцкага абывателя і купца Трафіма Шчурыковіча, дадзены слуцкім сесіяналістам і абывателям, братчыкам Успенскага брацтва пры

Слуцкай замкавай царкве Якубу Лапіцкаму, Яну Янавічу Хрысцінічу і Геляшу Паўлюшыцу на пазычаныя ў брацтва 300 зл. з тэрмінам вяртання пазыкі 16.04.1734. Без месца і даты [1733 г.].

Подпісы: Трафім Шчурык; Ян Ваўковіч; Пётр Гутоўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 974).

451. Прывілей вялікага падчашага ВКЛ, перамышльскага старосты кн. Гераніма Фларыяна Радзівіла грэка-рускаму духавенству Слуцкага і Капыльскага княстваў, у сувязі са скаргай слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага і Слуцкай капітулы, на вольнае беспадатковае сычэнне і шынкаванне мёду і воску, а гарэлкі толькі па-за межамі цэркваў і плябаній для патрэб царкоўных і брацкіх, паводле ранейшых прывілеяў. Замак Слуцкі, 16.05.1734.

Копія подпісу: Г. Ф. Радзівіл, князь, п[адчашы] в[ялікі] В[ялікага] Кн[яс]тва Літоўскага.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 22. 2 арк. (арк. 975—976; арк. 976 чысты, з затылкам).

452. Квіт Войцеха Легуцкага, маёра ЯКМ, вайсковага камісара ад генеральнага рэгіментара войск ВКЛ для рэкрутавання пяхоты з Навагрудскага ваяводства для Генеральнай канфедэрацыі, дадзены праваслаўнаму духавенству Слуцкай архімандрыі і капітулы, манастыроў і цэркваў аб выдачы са сваіх маёнткаў пэўнай колькасці пешых жаўнераў з узбраеннем. Слуцк, 22.05.1734.

Пячатка на чырвоным сургучы і подпіс: В. Легуцкі, маёр ЯКМ і камісар.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: «Нам не належыць». 2 арк. (арк. 977—978; арк. 978 чысты, з затылкам).

453. Ліст камісараў аб атрыманні ад кс. слуцкага архімандрыта з яго Слуцкай архімандрыі падатку на войска ВКЛ у памеры 148 чырвоных злотых, а са святароў Слуцкай капітулы і сельскіх цэркваў грошы не атрыманы. Слуцк, 18.07.1734.

Подпіс: Ян Канстанты Сіповіч, гараднічы п[аве]та Браслаўскага, канцылярыст і камісар Правінцыі ВКЛ.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 979).

454. Ліст камісараў аб атрыманні ад слуцкага архімандрыта кс. Юзафа Аранскага з кляштараў Слуцкай архімандрыі — Слуцкіх Св.-Траецкага, брацкага Праабражэння Гасподня, Грозаўскага Св. Мікалая, Старчыцкага і Морацкага — падатку на войска ВКЛ у памеры 2666 зл. і 20 гр. Слуцк, 20.07.1734.

Подпісы: Ян Канстанты Сіповіч, гараднічы п[аве]та Браслаўскага, канцылярыст Генеральнай канфедэрацыі і камісар Правінцыі ВКЛ; Якуб Ярмаловіч, [...] і камісар ад войска ВКЛ.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 980—981; арк. 981 чысты).

455. а) Ліст-обліг мужоў (старэйшын) в. Пасека Царкоўная, дадзены свайму пану, слуцкаму архімандрыту Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго

184 зл. на выплату падыманага на войска ВКЛ, з тэрмінам вяртання пазыкі на дзень Св. Тройцы. Слуцк, 1734 (без чысла і месяца).

Подпісы: Васіль Усеня, войт пасецкі, ад імя ўсёй вёскі (крыжыкам); Стэфан Манькоўскі, празбітар уваскрэсенскі слуцкі.

б) Нататка на адвароце, што згаданая сума 184 зл. пры генеральнай калькуляцыі ўвайшла ў агульную суму 2000 зл., апісаную на асобным облігу.

Без месца і даты.

Подпіс: Юзаф Аранскі, АСНМК (архімандрыт слуцкі, намеснік мітраполіі Кіеўскай).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: «Ненужное». 1 арк. (арк. 982).

456. а) Дэкрэт духоўнага суда Слуцкай капітулы па скарзе капыльскай празбітаравай Фрузыны Стэфанавай Маўчановічавай на капыльскіх празбітараў Яна Пыжэвіча і Клімента Маўчановіча аб невыкананні імі пастановы духоўнага суда ад 1735 г. аб выдачы ёй трацiны даходаў з Капыльскай парафіі. Дом судовы капітульны слуцкі, 30.10.1736.

Пячатка на кустодыі Слуцкай капітулы і архімандрыі.

б) Пастанова слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага аб зацвярджэнні вышэйзгаданага дэкрэта з некаторымі папраўкамі. Без месца і даты.

Копія подпісу: Юзаф Аранскі, архімандрыт слуцкі, НМК (намеснік мітраполіі Кіеўскай).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 983—984).

457. Ліст-прэзента (прадстаўленне) перамышльскага і крычаўскага старосты Гераніма Фларыяна Радзівіла айцу Парфеніўшу Звярковічу на празбітара Амговіцкай царквы Слуцкага княства па смерці былога святара Грыгорыя Дашкевіча. Замак Бяльскі, 2.08.1736.

Копія подпісу: Г. Ф. Радзівіл, ста[роста] пера[мышльскі].

Тагачасная копія. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 985).

458. Інвентар Трабскага староства Ашмянскага павета пры падачы яго ў трыманне навагрудскаму кашталяну, прапойскаму і трабскаму старосце, палкоўніку Петыгорскай харугвы войска ВКЛ Багуславу Феліксу Незабытоўскаму паводле прывілея караля Аўгуста III. Трабы, 16.01.1736.

Подпісы: Міхал Літавор Храптовіч, канюшы павета Мазырскага, дваранін ЯКМ Скарбу ВКЛ; Томаш Казлоўскі, енерал ЯКМ пав. Ашмянскага.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 16 арк. (арк. 986—1001).

459. а) Ліст-обліг слуцкага абываталя Сыльвестра Санкевіча, дадзены слуцкаму архімандрыту Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 300 тынфаў з тэрмінам вяртання грошай 9.02.1737. Без месца і даты (29.10.1736 — на адвароце арк. 1003).

Подпісы: Сыльвестр Санкевіч; Ян Ваўковіч; Аляксандр Кучарскі; Пётр Сухажанет.

б) Нататка на адвароце арк. 1002, унізе, што гэты обліг быў прадстаўлены на сесіі Слуцкай магдэбургіі. Без месца, 22.09.1738.

Подпіс: Алякса[ндр] Кучарскі, пісар м[айдэбурскі] м[еста] Сл[уцкага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1002—1003; арк. 1003 чысты, з затылкам).

460. Выпіс з кніг Жамойцкага сурагатарскага суда. Скарга супругаў Юрыя і Гертруды Ганіпроўскіх на Яна Самішчу, што 9.08.1735 падданая адказчыка Кацярына Андрулёвая па смерці сваёй дачкі наехала на дом свайго зяця Пятра Карповіча, падданага істцоў маёнтка іх Пагрыжава Жамойцкага княства, і захапіла ўсю маёмасць і свайго ўнука. Расейні, 10.04.1736.

Пячатка на кустодыі тэльшэўскага старосты, генеральнага харужага і сурагатара Жамойцкага княства Антонія Горскага.

Подпіс: карыгаваў Янцэвіч.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 1 арк. (арк. 1004).

461. Указ Кіеўскага архіепіскапа Рафаіла, дадзены паводле ліста-данясення ігумена Мгарскага манастыра Феафана аб знішчэнні падчас пажара гэтага манастыра, з загадам арыштаваць вінаватага ў пажары іераманаха Веніяміна Савецкага да аддачы ім запісаных на манастыр 200 рублёў за прададзены свой млын у сяле Жданы, а таксама аб дазволе збіраць міласціну ў суседніх епархіях на адбудову манастыра. (Згадваецца аб смерці 27.05.1736 князя Шахаўскога). Катэдра Кіеўская, 12.06.1736.

Подпіс: Рафаіл, архіепіскап кіеўскі.

Арыгінал. Стукр. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 363, 6 K. Z. 2 арк. (арк. 1005, 1007).

462. Данясенне брацііі Мгарскага Лубенскага манастыра свайму ігумену аб абранні новага намесніка айца Іякіма Літвішкі замест былога намесніка Георгія Кувячынскага, якога за злоўжыванні на пасадзе панізілі да статусу звычайнага манаха. Без месца і даты.

Копіі подпісаў: іераманах Дарафей, былы аканом; іераманахі Прохар, Віталій, Варлаам, Павел, Кірыл; іерадыяканы Далякін (?), Венядыкт, Дэанісій, Назарэй; манахі Варфаламей, Усіхій, Наум; іераманах Іезекііл, аканом ММЛ (манастыра Мгарскага Лубенскага).

Тагачасная копія. Стукр. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1006).

463. Ліст-адказ пісара Кіеўскай катэдры іераманаха Мадэста на данясенне ігумена Мгарскага манастыра аб прыняцці пад арышт дастаўленага іераманаха Мгарскага манастыра Георгія Кувячынскага. Кіеў, 22.06.1736.

Подпіс: іераманах Мадэст, пісар К. К. (катэдры Кіеўскай).

Арыгінал. Стукр. м. Філіграні. 1 арк. (арк. 1008).

464. Ліст-данясенне брацііі Мгарскага Лубенскага манастыра свайму ігумену, які прыехаў з Масквы, аб самавольным разбурэнні манастырскай царквы былым намеснікам айцом Георгіем Кувячынскім, а таксама з просьбай да ігумена паехаць у Глухаў для хадайніцтва перад панам гетманам аб дапамозе на адбудову царквы. Без месца і даты.

Подпісы: іераманах Іякім Літвішка, НММЛ (намеснік манастыра Мгарскага Лубенскага); іераманах Маркел; іераманах Веніямін Савіцкі; іераманах Іезекііл, аканом; іераманах Варлам; манах Варсанофій Палатны.

Арыгінал. Стукр. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 1009—1009; абодва аркушы прапагінаваны аднолькава).

465. Указ Кіеўскага архіепіскапа Рафаіла ігумену Мгарскага манастыра Феафану на яго данясенне з паведамленнем аб пачатку следства ў духоўнай кансісторыі па справе іераманаха гэтага манастыра Георгія Кувячынскага, фінансаванне якога следства павінен здзяйсняць манастыр. Катэдра Кіеўская, 3.07.1736.

Подпіс: Рафаіл, архіепіскап кіеўскі.

Арыгінал. Стукр. м. Філігрань. Стар. сігн.: ВК. Z. № 447. 2 арк. (арк. 1010—1111; арк. 1111 чысты).

466. Указ Кіеўскага архіепіскапа Рафаіла ігумену Мгарскага манастыра Феафану з паведамленнем, што па справе аб разбурэнні Мгарскага манастыра і вінаватых у гэтым іераманахаў Георгія Кувячынскага і Веніяміна Савецкага прызначаны і накіраваны ў манастыр следчыя катэдральныя іераманахі экзаменатар Іаасаф Гарленка і Уладзімір Каменскі. Катэдра Кіеўская, 28.07.1736.

Подпіс: Рафаіл, архіепіскап кіеўскі.

Арыгінал. Стукр. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 490. 2 арк. (арк. 1012, 1015).

467. Прыватны ліст (пісьмо) іераманаха (?) Сыльвестра Кахоўскага да [слуцкага архімандрыта] з паведамленнем аб хадайніцтвах падчас яго знаходжання ў Варшаве перад расійскім паслом Цэйсерлінгам, панам рэзідэнтам (без імя) і навагрудскім кашталянам [Багуславам Незабітоўскім] наконт дапамогі будаўніцтву мураванай царквы [у Слуцкім Св.-Траецкім манастыры] і пратэкцыі па гэтым пытанні перад [Радзівіламі], расійскімі Імператарскім Дваром і Свяцейшым Сінодам. Варшава, 28.08.1736 (стары стыль).

Подпіс: іерам[анах] (?) Сыльвестр Кахоўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1013—1014).

468. Ліст былой пападдзі Марыяны Давідавай Сасіноўскай і яе дачкі панны Гелены Сасіноўскай, дадзены іванскім святаром, з прабачэннямі перад імі за ўчынены вэрхал за знесены здзек і абяцаннямі не рабіць гвалтаў, за што святары выдзелілі ім месца для пабудавання. Плябанія Іванская, 1.05.1736.

Подпісы: Марыяна Давідавая Сасіноўская (крыжыкам); Гелена з Сасіноўскіх (крыжыкам); Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі слуцкі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1017).

469. Тэстыманіяльны ліст давідгарадоцкаму пратапопу айцу Яну Гармановічу, які з'яўляецца паводле сведчанняў давідгарадоцкіх месцкіхураднікаў і мяшчан бліжэйшым сваяком і крэдыторам давідгарадоцкага мешчаніна Стахея Цумановіча, які памёр у Скавышынскай воласці, для адшукання і атрымання ў спадчыну маёмасці нябожчыка. Давідгарадок, 15.06.1737.

Сляды чатырох кустадыйных пячатак кепскай якасці давідгарадоцкіх гродскіхураднікаў і шляхты.

Подпісы: Юзафат Радцэвіч-Плотніцкі, суддзя гродскі кн[яс]тва Давідгарадоцкага; Караль Апановіч, пісар гродскі кн[яс]тва Давідгарадоцкага; Томаш Дастаеўскі; Станіслаў Кульвінскі; Антоні Кульвінскі; Грыгоры Альпінскі (усе па-польску); Станіслаў Альпінскі (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: 7. 2 арк., змацаваныя пячаткамі (арк. з тэкстам не пагінаваны; арк. 1018 чысты).

470. Ліст-прэзента (прадстаўленне) перамышльскага і крычаўскага старосты Гераніма Фларыяна Радзівіла Яну Клімковічу на празбітарства Рубяжэвіцкай царквы па смерці былога святара Казьмы Байкоўскага паводле просьбы слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага. Нягневічы, 8.12.1736.

Копія подпісу: Г[еранім] кн[язь] Радзівіл, с[тарос]та пера[мышльскі].

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1016).

471. Прыватны ліст (пісьмо) Юрыя Маляўскага да слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага з паведамленнем, што вымушаны з’ехаць са Слуцка, а як вернецца, то аддасць яму пэўныя грошы. Слуцк, 15.05.1737.

Пячатка на чырвоным сургучы кепскай якасці (на адвароце арк. 1020) і подпіс: Юры Маляўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1019—1020; арк. 1020 чысты, з адрасам і пячаткай).

472. а) Супліка (скарга) мяшчан і жыдоў места Капыль да кс. віленскага афіцыяла аб збіванні іх капыльскім каталіцкім камендарам кс. Пенскім і інш. шкодах, і з просьбай аб прызначэнні камісіі. Без месца і даты.

Подпіс: усё места Капыльскае.

б) Нататка на адвароце аб прадстаўленні гэтай суплікі кс. віленскаму генеральнаму афіцыялу і прызначэнні дэкрэтам следства. Каўпеніца, 27.08.1732.

Подпіс: кс. Аляксандр Жаброўскі, канонік і афіцыял г[ене]р[аль]ны віленс[кі].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1021).

473. Акт рэвізіі (праверкі) паводле загада слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага наяўнасці абразоў, кніг, апаратаў, каштоўнасцей і інш. рухомых рэчаў у Капыльскай царкве Нараджэння Найсвяцейшай Панны. Без месца [Капыль], 27.09.1737.

Подпісы: Міхал Андрэеўскі, празбітар мікольскі слуцкі; Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1022—1023; арк. 1023 чысты, з затылкам).

474. Тэстыманіяльны ліст давідгарадоцкіх гродскіх ураднікаў і шляхты, дадзены давідгарадоцкаму пратапопу айцу Яну Гармановічу, які пацвярджае

іх папярэдні ліст, што пратапоп з’яўляецца найбліжэйшым сваяком і крэдыторам нябожчыка Стахея Цумановіча. Без месца [Давідгарадок], 10.11.1737.

Пячатка кустадыйная вял. крайчага ВКЛ Марціна Мікалая Радзівіла, ардыната клецкага і давідгарадоцкага.

Подпісы: Юзафат Радцэвіч-Плотніцкі, суддзя гродскі кн[яс]тва Давідгарадоцкага; Караль Апановіч, пісар гродскі княства Д[авід]гарадоцкага; Ян Антоні Наздрына, стар[оста] зых., рэг[ент] з[емскі] п[авета] Пін[скага]; Павел Ліпскі, с[акратар] ЯКМ; Міхаіл Дамброўскі, ОПП (абозны (?) павета Пінскага); Міхал Гофман, СПС; Станіслаў Люберскі; Антоні Качаноўскі; Дамінік Мікульскі, інстыгатар рочкавы кн[яства] Д[авід]г[арадоцкага]; Марцін Сярніцкі; Станіслаў Каліноўскі, рэгент г[родскі] кн[яства] Д[авід]г[арадоцкага]; Грыгоры Баруцкі (стб. м.); Грыгоры Альпінскі, енерал ЯКМ п[авета] П[інскага]; Даніэль Альпінскі (стб. м.); Данілей Стахоўскі (стб. м.); Сямён Юнкевіч (стб. м.); Міхал Патоцкі; Андрэй (?) Вараноўскі; Андрэй Сасноўскі; Канстанты Верэнц; Марцін Тапанскі (?) (стб. м.); Томаш Шпігановіч.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк., змацаваныя пячаткай (арк. з тэкстам не пагінаваны; арк. 1025 чысты).

475. Ліст-прэзента (прадстаўленне) перамышльскага і крычаўскага старосты Гераніма Фларыяна Радзівіла айцу Аляксандру Ярашэвічу на празбітарства паловы парафіі царквы Нараджэння Найсвяцейшай Панны Марыі ў месце Капыль па смерці былога празбітара гэтай паловы парафіі айца Стэфана Маўчановіча. Бялая, 19.01.1738.

Пячатка кустадыйная і подпіс: Г[еранім] Фл[арыян] Радзівіл, ста[роста] пера[мышльскі].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 4. 2 арк., змацаваныя пячаткай (арк. з тэкстам не пагінаваны, арк. 1024 чысты).

476. Выпіс з кніг месцкіх Магілёўскай майдэбурыі. Рэляцыя магілёўскага лаўніка Якуба Куцэвіча, што, ад’язджаючы з таварам з Нежына Украінскага, узяў сабе ў дарогу па рэкамендацыі магілёўскага паспалітага Грыгорыя Хамянтоўскага парабкам Лявона, слуцкага абывателя юрыздыкі слуцкага архімандрыта, якога здаровым, як узяўшы, і адпусціў. Магілёў, 21.01.1738.

Пячатка на кустодыі Магілёўскай майдэбурыі.

Подпісы: Філімон Дзегцярэвіч, войт магілёўскі; Юры Трубніцкі, рэгент канцылярыі месцкай магілёўскай.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1026—1027).

477. Ліст давідгарадоцкіх мяшчан, дадзены давідгарадоцкаму пратапопу айцу Яну Германовічу, што ён з’яўляецца найбліжэйшым сваяком, крэдыторам і спадкаемцам маёмасці давідгарадоцкага мешчаніна нябожчыка Стахея Цумановіча. Давідгарадок, 28.01.1738.

Подпісы: Лукаш Ярашэвіч, войт давідгарадоцкі (стб. м.); Алісей Ціцюра (крыжык); Гаўрыла Бранцэвіч (крыжык); Сямён Аношка (крыжык); Леска Ціцюра (крыжык); Сава Бесан (крыжык); Павел Стадкевіч, пісар м[есцкі]

д[авід]г[арадоцкі]; Хама Шышка, цэхмістр кравецкі (крыжык); Іван Данкевіч, слесар (крыжык) (усе — давідгарадоцкія мяшчане).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 30. 2 арк. (арк. 1028—1029; арк. 1029 чысты, з затылкам).

478. Асекурацыйны ліст тальскага паповіча Базылія Жыдскага і яго жонкі Зофіі Сеўрукоўны слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму з абяцаннем увайсці самім і іх нашчадкам у падданства айцу архімандрыту з выкананнем усіх цяглых павіннасцей, за што атрымліваюць зямлю ў в. Шыпілавічы Слуцкай архімандрыі, у сувязі з разарэннем і немагчымасцю больш жыць у в. Тальскай Ераміцкага двара. Архімандрыя Слуцкая, 19.03.1738 (стары стыль).

Подпісы: Сымяон Бабарыка, пра[збітар] царквы Вызнаўскай; Ян Вечар.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 36; № 33. 2 арк. (арк. 1030—1031; арк. 1031 чысты, з затылкам).

479. Супліка (скарга) слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага і Слуцкай капітулы да княжны [Радзівілаўны], уласніцы Слуцкага княства і калятаркі слуцкіх цэркваў і манастыроў, на жыдоў-арандатараў слуцкай мытніцы аб нявыдачы воску на слуцкія цэрквы, перашкодзе перамяшчэнню святароў праз слуцкія брамы, нападзе на плябанію і збіцці слуцкага міхайлаўскага празбітара Базылія Бараноўскага, а таксама на слуцкага каталіцкага плябана, аб розных шкодах слуцкім цэрквам і інш. Слуцк, 07.1738 (без чысла).

Подпісы: Юзаф Аранскі, архімандрыт слуцкі, НМК (намеснік мітраполіі Кіеўскай); Міхал Андрэеўскі, пр[азбітар] уваскр[асенскі] с[луцкі]; Раман Казюліч, пр[азбітар] варварынскі слуц[кі]; Максім Салавевіч, пр[азбітар] юр'еўскі слуцкі; Артэмі Рыбец, празбітар увуздвіжанскі; Базылі Бараноўскі, празбітар міхайлаўскі слуцкі; Ян Корбут, празбітар іванаўскі слуцкі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 26. 4 арк. (арк. 1034—1037).

480. Прыватны ліст (пісьмо) Фларыяна Булгарына да слуцкага архімандрыта Фларыяна Аранскага з просьбай вярнуць давідгарадоцкаму пратапопу Яну Германовічу маёмасць, якая засталася па смерці яго вуя (дзядзькі па маці) [Стахея Цумановіча]. Давідгарадок, 29.01.1738.

Пячатка на чырвоным сургучы (захавалася напалову) і подпіс: Фларыян Булгарын.

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 1032—1033; арк. 1033 чысты, з адрасам і пячаткай).

481. Ліст перамышльскага, крычаўскага і камянецкага старосты Геранімa Фларыяна Радзівіла да капыльскіх зямян, мяшчан і падданых аб прызначэнні святарамі царквы Нараджэння Панны Марыі ў м. Капыль айцоў Яна Пыжэвіча і Кліменція Маўчановіча па смерці былых святароў айцоў Пыжэвічаў. Слуцк, 6.09.1738.

Копія подпісу: Г[еранім] Фл[арыян] Радзівіл, с[тарос]та перам[ышльскі].

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: «Papiry Kopylskiey Cerkwi y Oycom Służące» (замазана): 2 арк. (арк. 1038; арк. з тэкстам без пагінацыі, арк. 1038 чысты).

482. а) Супліка (скарга) праваслаўных святароў слуцкіх цэркваў да каталіцкага віленскага біскупа аб захопах фундушавых зямель Слуцкіх Мікольскай, Юр'еўскай і Раждзественскай цэркваў слуцкім каталіцкім плябанам, не зважаючы на пастановы камісараў. Без месца і даты [1738 г.].

Подпісы: Міхал Андрэеўскі, празбітар мікольскі слуцкі; Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі; Максім Салаўевіч, празбітар Юр'еўскі.

б) Нататка на затылку аб прадстаўленні гэтай суплікі перад віленскім біскупам кс. Міхалам Янам Зянковічам. Дамброўна, 3.08.1738.

Подпіс: Міхал, біскуп віленскі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 3; «Ненужное». 2 арк. (арк. 1039—1040).

483. Выпіс з кніг Пінскага гродскага суда, 26.01.1739. Прывілей крычаўскага старосты Героніма Радзівіла ўсім жыхарам Слуцкага княства і іншых так званых Нейбурскіх маёнткаў праваслаўнай, аугсбурскай (лютэранскай) і евангеліцкай (кальвінісцкай) канфесій, які пацвярджае іх ранейшыя прывілеі і вольнасці. Замак Слуцкі, 6.03.1731.

Пячатка на кустодыі Пінскага гродскага суда (пінскага старосты).

Подпісы: Антоні Арэшка, войскі і пісар г[родс]кі п[аве]та П[інска]га; карыгаваў Нагурчэўскі; згодна з арыгіналам — А. М. Качаноўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 4; 24. 4 арк. (арк. 1041—1044).

484. Выпіс з кніг Пінскага гродскага суда, 26.01.1739. Судовы ліст суддзяў, ад кн. Юрыя Юр'евіча Слуцкага прызначаных, Яна Грабінскага, Сямёна Іванавіча, кн. Лукаша Баляслававіча Свірскага, Данілы Рэзчыча ў справе ігумена Морацкага манастыра айца Феадосія з падданымі Слуцкага княства з сяла Лютовічы аб праве карыстання дубровай у манастырскім востраве Баркурава. Слуцк, 5.08.1550.

Копіі подпісаў: Антоні Арэшка, войскі і пісар грод[скі] п[аве]та пін[скага]; карыгаваў Нагурчэўскі; згодна з арыгіналам — А. М. Качаноўскі.

Копія XVIII ст. Пол. м. Без філіграні. Стар. сігн.: 1817 — № 9; № 94; 46-й. 2 арк. (арк. 1045—1046).

485. Рэестр облігавых, выдэркафавых і легацыйных лістоў на грашовыя сумы, якія належаць Слуцкаму брацтву Праабражэння Гасподня. Без месца, 4.05.1739.

Без пячатак і подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1047—1048).

486. Прыватны ліст (пісьмо) нейкай Маляўскай да нейкага царкоўнага іерарха (слуцкага архімандрыта?) з просьбай пачакаць з выплатай грошай, якія яна яму павінна. Без месца, 14.10.1739.

Подпіс: Маляўская.

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 1049—1050).

487. Прывілей караля Аўгуста II аб пацвярджэнні і захаванні правоў праваслаўнай царквы ў ВКЛ і Кароне Польскай паводле даўніх прывілеяў былых каралёў, дадзены паводле просьбы наміната-епіскапа луцкага і астрожскага кс. Дыянізія Жабакрыцкага. Без месца і даты.

Без пячатак і подпісаў. Дакумент без канца.

Тагачасная копія(?). Пол. м. Філіграњ. 2 арк. (арк. 1051—1052).

488. Пабаровы квіт, выдадзены слуцкаму міхалаўскаму празбітару айцу Базылю Бараноўскаму, аб заплаце падымнага падатку са свайго царкоўнага маёнтка Брановічы. Навагрудак, 15.03.1740.

Подпіс: Францішак Высоцкі, сукал[екта]р надым[нага] в[аяводства] Н[ава]гр[удскага].

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1053).

489. а) Супліка (скарга) праваслаўных сялян вёскі Дражна да свайго пана мінскага скарбніка дэ Раеса аб захопе святаром уніяцкай Залужскай царквы могілак у іх вёсцы, дзе некалі стаяла праваслаўная царква, і забароне ім хаваць сваіх нябожчыкаў. Без месца і даты [1740 г.].

Подпіс: мужы вёскі Дражна.

б) Нататка на затылку аб вынясенні рэзалюцыі па гэтай супліцы на вырак слуцкага архімандрыта. Станькаў, 22.03.1740.

Подпіс: (імя скарочана, не зразумела) дэ Раес, СВМ (скарбнік ваяводства Мінскага).

Арыгінал. Пол. м. Філіграњ. 2 арк. (арк. 1054—1055; арк. 1055 чысты, з затылкам).

490. Ліст-обліг слуцкага войта Яна Янавіча Хрысцініча і сесіяналістаў слуцкага месцкага суда Якуба Лапіцкага і інш., дадзены намесніку Слуцкага кляштара Праабражэння Гасподня і братчыкам брацтва пры ім, на пазычаныя ў іх на патрэбы места Слуцка 2000 зл. з тэрмінам вяртання грошаў 9.04.1740. Без месца і даты [1739 г.].

Подпісы: Ян Я[навіч] Хрысцініч, войт м[еста] С[луцкага]; Якуб Лапіцкі; Якуб Ваўковіч; Ян Ф[едаравіч] Хрысцініч; Дзям’ян Ладычка; Самуэль Хрысцініч; Аляксандр Кучарскі (акторы); М. Казімір Палонскі, губернатар княства Слуцкага; Караль Абуховіч; Юзаф(?) Віхерт (сведкі).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. Стар. сігн.: 32. 1 арк. (арк. 1056).

491. а) Спіс абавязкаў намесніка манастыра і манахаў на іншых манастырскіх пасадах, складзены па патрабаванні ігумена Мгарскага манастыра айца Іясафа. Без месца і даты [1740 г.].

Подпісы: іераманах Іясаф Андрэеў; іераманах Пётр Феадораў; іераманах Іаан; іераманах Дарафей Ірынееў.

б) Надпіс зверху на першым аркушы: «Захоўваць гэта пану пісару пры справах манастырскіх». Без месца, 26.04.1740.

Арыгінал. Стукр. м. Філіграні. 4 арк. (арк. 1057—1060; арк. 1058 павінен быць пасля арк. 1060, разарваны напалам).

492. Прыватны ліст (пісьмо) ураднікa А. Корзуна да свайго пана слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі айца Юзафа Аранскага са справаздачай аб гаспадарчых і фінансавых справах у архімандрыцкіх маёнтках. Шыпілавічы, 17.05.1740.

Подпіс: А. Корзун.

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 1061—1062).

493. Асекурацыйны ліст святароў Раждзественскай царквы Мойзеша Бялькевіча і царквы Св. Геліяша Дзям'яна Рэвінскага, дадзены намесніку Кіеўскай мітраполіі айцу Юзафу Аранскаму, з абавязкам вярнуць пазычаныя на обліг 500 зл. у тэрмін 13.07.1742. Без месца і даты [13.07.1742].

Подпісы: Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі; Дзям'ян Рэвінскі, в[ікары?] царквы с[вят]ога Г[еліяша] прарока.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1063).

494. Супліка парафіян вёскі Урэчча да царкоўнага іерарха (слуцкага архімандрыта?) на святара сваёй царквы Андрэя Плышэўскага, які перайшоў ва ўніяцтва, з-за чаго праваслаўныя парафіяне засталіся без пастыра і не маюць магчымасці адпраўляць духоўныя патрэбы. Урэчча, 24.12.1770.

Подпіс: з вёскі Урэчча парафіяне.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1064—1065).

495. Ліст-обліг празбітара Слуцкай Раждзественскай царквы Мойзеша Бялькевіча, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі айцу Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 300 зл. з тэрмінам вяртання грошай 24.07.1741. Без месца і даты [1740 г.].

Подпісы: Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі; Аляксандр Кучарскі, пісар маг[істрата] ме[ста] Слуцкага; Ян М. Мелянтовіч, возны (?).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1065; паўтор пагінацыі, гл. папярэдні дак-т).

496. Супліка (скарга) святароў Асавецкай царквы Пятра і Сымяона Біруковічаў да айца слуцкага архімандрыта аб выгнанні іх з парафіі і пераасвячэнні іх праваслаўнай Асавецкай царквы ва ўніяцкую ксяндзамі слуцкімі езуітамі. Без месца і даты.

Подпісы: Петр Біруковіч, празбітар царквы Асавецкай; Сымяон Біруковіч, святар царквы Асавецкай.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: sub № 15. 1 арк. (арк. 1066).

497. а) Ліст канцлеравай ВКЛ [Каралевай Станіслававай] Радзівілавай Ганны Сангушкаўны да ўраднікаў мытных камор ЯКМ з просьбай не затрымліваць і не абкладаць мытам яе віціны, якія яна адпраўляе са Слуцкага княства ракой Нёман да м. Каралявец пад кіраўніцтвам харужага слуцкага гарнізона Міхала Твароўскага і адміністратара Капыльскага княства Абрамовіча. Слуцк, 26.04.1741.

Копія подпісу: Ганна княжна Радзівілавая.

б) На адвароце чатыры чарнавыя тэксты суплік, эканамічных нататак. Без месца і даты.

Копія XVIII ст. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1068).

498. Ліст-обліг слуцкіх уваскрасенскіх празбітараў Томаша Тамашэўскага і Стэфана Манькоўскага, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 300 зл. пад заклад 4-х моргаў зямлі ў прадмесці Востраў у Слуцку і даходаў з фундушавага фальварка Меляшкевічы, з тэрмінам вяртання грошай у 1740—1742 гг. Без месца і даты [31.08.1739] (дата на затылку).

Подпісы: Томаш Тамашэўскі, празбітар уваскрасенскі; Стэфан Манькоўскі, празбітар уваскрасенскі; Максім Салаўевіч, празбітар юр’еўскі; Мойзеш Бялькевіч, празбітар раждзественскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1067, 1071; арк. 1071 чысты, з затылкам).

499. Дэкрэт слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага паводле ўказа кіеўскага архіепіскапа Рафала Забароўскага аб вызваленні на паўгода з пасады мазырскага пратапопа Тэадора Савіцкага з загадам прынесці прабачэнні святарам Мазырскай пратапопіі і іншым людзям, над якімі ён здзекваўся, збіваў і вымагаў грошы. Мазыр, 14.01.1742.

Копія подпісу: Юзаф Аранскі, архімандрыт слуцкі, НМК (намеснік мітраполіі Кіеўскай).

Копія XVIII ст. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1069—1070; на дакуменце таксама пагінацыя XVIII ст. — арк. 12—13).

500. Прыватны ліст (пісьмо) кіеўскага архіепіскапа Рафала Забароўскага да мінскай войскай Петранэлі з Завішаў Валадковічавай з просьбай, каб яна ў сваіх нованабытых маёнтках Скрыгалава і Слабада Мазырскага пав. захоўвала і абараняла ў цэрквах грэка-рускае (праваслаўнае) набажэнства. Без месца, 28.02.1742.

Копія подпісу: Рафаэль Забароўскі, арцыбіскуп кіеўскі.

Копія XVIII ст. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1072).

501. Ліст-прэзента (прадстаўленне) мінскай войскай Петранэлі з Завішаў Валадковічавай айцу Лук’яну Шуневічу на пажыццёвае святарства ў царкве Св. Міхала ў яе вёсцы Слабада Скрыгалаўская з правам карыстання царкоўнымі зямельнымі ўгоддзямі. Скрыгалава, 6.05.1742. (гл. таксама № 538).

Копія подпісу: Петранэля з Завішаў Валадковічавая, ВВМ (войская ваяводства Мінскага).

Подпіс (арыгінальны на копіі): Лук'ян Шунев[іч], празбітар слабодск[і].

Копія тагачасная. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1073).

502. Асекурацыйны ліст антонаўскага празбітара айца Мацея Мачульскага, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі айцу Юзафу Аранскаму з запэўніваннем вяртання пазычаных 35 зл. 11 гр. у дзень Св. Тройцы рускай у 1742 г. у кляштары Слуцкай архімандрыі. Кіеў, 6.03.1742.

Подпісы: іярэй Матфей Мачульскі (стб. м.), Міхал Багуцкі (пол. м.).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1074).

503. Супліка (скарга) празбітара Вязкаўскай Іллінскай царквы Георгія Яфрэмавіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб пераводзе ва ўніяцтва парафій яго Навасельскай і Вязкаўскай цэркваў азарыцкім старостам Людвікам Панцэрынскім, які заснаваў уніяцкую царкву ў Азарыцкім старостве. Без месца і даты (адзнака, што супліка пададзена архімандрыту 28.02.1743).

Подпіс: Георгі Яфрэмавіч, празбітар свята-іллінскі вязкаўскі (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк.; арк. 1075—1076 (арк. 1076 чысты, з затылкам).

504. Анатацыя (кароткі змест) да дакумента № 503. [XIX ст.].

Арыгінал. Рус. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 1077).

505. Дэкрэт Слуцкага замкавага суда ў справе былой слуцкай войтавай удавы Аляксандры Лапіцкай з жыдоўскім кагалам м. Слуцка аб пазычаных на обліг грошах у пляменніка скаржніцы нябожчыка Мацея Чарняўскага, якія спадчынай прыйшлі скаржніцы. Слуцк, 18.06.1743.

Пячатка на кустодыі Слуцкага замкавага суда («Пагоня»).

Подпісы: Мацей Казімір Палонскі, скарбнік латычаўскі, губернатар княства Слуцкага і Капыльскага; зверана з актамі — Смагаржэўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 6 арк. (арк. 1078—1083; арк. 1083 чысты).

506. Ліст-обліг слуцкага абываталя і купца Трафіма Шчурыка, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазычаныя ў яго 180 зл. з тэрмінам вяртання грошай 25.03.1744. Без месца і даты [1744 г.].

Подпісы: Трафім Шчурык; Ян М. Мелянтовіч.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1084).

507. Указ Кіеўскай мітрапалітальнай катэдры ад імя яе Вялікасці Расійскай Імператрыцы ігумену Гадзяцкага Краснагорскага Св.-Мікалаеўскага манастыра айцу Міхаілу аб накіраванні ў манастыр калужскага купца Васіля Грыгор'евіча Цішкова для дастаўкі драніц для пакрыцця дахаў спарахнелых манастырскіх будынкаў і здзяйснення іншага рамонту. Без месца, 2.06.1747.

Подпіс: смірэнны Рафаіл, мітрапаліт кіеўскі.

Арыгінал. Рус. м. Без філіграней. Стар. сігн.: № 571. 2 арк. (арк. 1085—1086).

508. а) Супліка (скарга) якімавіцкага святара Сямёна Пігулеўскага да [слуцкага архімандрыта] з апраўданнямі, што ён не падкупаў камісараў мазырскага староства і не намаўляў людзей аддзяліцца ад Навасельскай парафіі і далучыцца да яго парафіі. Без месца і даты (адзнака аб падачы суплікі архімандрыту 14.07.1774).

Подпіс: Сямён Пігулеўскі, святар якімавіцкі свята-праабражэнскі (стб. м.).

б) Дэкрэт Кансісторыі Слуцкай архімандрыі па згаданай супліцы. Без месца, 14.07.1774.

в) Нататка аб сканчэнні гэтай справы ў кансісторыі. Без месца, 16.07.1774.

Подпіс: пісар кансісторыі А[рхімандрыі] С[луцкай] Якуб Каржанеўскі.

Арыгінал. Пол. м. (а, в), стб. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 1087—1088; арк. 1088 чысты).

509. а) Супліка (скарга) святароў Слуцкіх Уваскрэсенскай і Варварынскай парафій да падчашага ВКЛ Гераніма Радзівіла, каб выдаў дазвол на ўзнаўленне трох згарэўшых цэркваў у Слуцку перад Старым Замкам — Уваскрасення Госпадня, Святых Айцоў і Ахвяравання Найсвяцейшай Панны, на карыстанне дрэвам ва Урэцкай і Амговіцкай пушчах і пацвердзіў фундуш гэтых цэркваў. Без месца і даты (пададзена князю 13.08.1744).

Копія подпісу: усё духавенства грэка-рускае з дзвюма парафіямі Уваскрэсенскай і Варварынскай.

б) (На адвароце арк. 1090). Рэспонс (загад) Г. Радзівіла аб узнаўленні згарэлых цэркваў і выдачы дрэва з Урэцкай пушчы. Слуцкі замак, 27.08.1744.

Копія подпісу: Г[еранім] кн[язь] Радзівіл, ПВВКЛ (падчашы вялікі ВКЛ).

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1089—1090).

510. Перапіска сенатараў і іншыхураднікаў Рэчы Паспалітай паміж сабой і з паслом Расійскай Імперыі ў РП Кайзерлінгам наконт становішча праваслаўнай царквы ў РП, уціскаў святароў і прыхаджан і інш.

а) Ліст кс. прымаса (толькі загаловак). Скерневічы, 30.12.1743.

б) Рэспонс падканцлера ВКЛ кн. М. Ф. Чартарыйскага, 24.01.1744.

в) Ліст кс. віленскага біскупа да падканцлера ВКЛ кн. М. Ф. Чартарыйскага. 10.01.1744.

г) Рэспонс канцлера ВКЛ Я. Ф. Сапегі. Кодзень, 21.01.1744.

д) Рэспонс вялікага маршалка кароннага Ф. Бялінскага. Отвацк, 30.01.1744.

е) Ліст Ліпскага. Кельцы, 2.02.1744.

ж) Рэспонс польнага гетмана ВКЛ М. К. Радзівіла. 29.01.1744.

з) Рэспонс кіеўскага ваяводы, польнага гетмана кароннага Патоцкага. Залозцы, 4.02.1744.

і) Ліст яго ж да віленскага і луцкага біскупаў. Залозцы, 4.02.1744.

к) Рэспонс вялікага гетмана ВКЛ М. С. Вішнявецкага. Вішнявец, 4.02.1744.

л) Рэспонс кс. гнезненскага архібіскупа і прымаса кс. Шэмбека. 12.02.1744.

м) Рэспонс кракаўскага кашталяна Мнішка. Явораў, 11.02.1744.

н) Ліст яго ж да кс. мітрапаліта, 16.01.1744.

о) Паўторны мемарыял кароннага і літоўскага канцлераў. 01.1744. Без канца.

Копія XVIII ст. Пол. м. Без філіграней. 8 арк. (арк. 1091—1098).

511. Супліка сялян в. Вялікія Фальваркі Заблудаўскага графства да слуцкага архімандрыта кс. Юзафа Аранскага з просьбай дазволіць намесніку Заблудаўскага кляштара асвяціць капліцу ў іх вёсцы, пабудаваную ў 1710 г. у падзяку выратавання ад моравай пошасці. Без месца і даты (адзнака аб падачы суплікі 12.02.1744).

Подпісы: Якуб Пятровіч; Раман Шчотка; Іван Сыновец; Даніла Рыбачук; Андрый Кананюк; Хведар Кудэрскі (усе крыжыкамі).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 8. 2 арк. (арк. 1099—1100).

512. Супліка святароў Старобінскай і Іздрашоўскай цэркваў да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага аб захопе іх фундушавых зямель у вв. Паварчычы і Ціжэвічы трымальнікамі двара Мецавіцкага Кацярынай Узлоўскай і яе сынам Аляксандрам Узлоўскім. Без месца і даты [1744 г.].

Подпісы: Базылі Бабарыка, празбітар старобінскі; Харлампі Лісіца, празбітар царквы Іздрашоўскай.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1101—1102; арк. 1102 чысты, з затылкам).

513. Супліка языльскага празбітара Яна Страховіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб гвалтоўнай перадачы 24.06.1744 горбаўскім старостам Бярнардам Аборскім праваслаўнай царквы ў яго маёнтку Горка, якая належала Языльскай парафіі, уніяцкаму залужскаму каплану. Без месца і даты [1744 г.].

Подпіс: Ян Страховіч, празбітар языльскі.

Арыгінал. Пол. м. Без філіграней. 2 арк. (арк. 1103—1104; арк. 1104 чысты, з затылкам).

514. Прыватны ліст (пісьмо) горбаўскага старосты Бярнарда Аборскага да архімандрыта Слуцкай капітулы, намесніка Кіеўскай архіепіскопіі Юзафа Аранскага з тлумачэннем добраахвотнага пераходу сялян яго маёнтка ва ўніяцтва і няслушнасці абвінавачвання яго ў гвалтах языльскім праваслаўным святаром. Бярэзіна, 3.01.1745.

Пячатка на чырвоным сургучы (захавалася часткова) і подпіс: Бярнард Аборскі, СГ (староста горбаўскі).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: «О церкви Горской»; 4; № 8. 2 арк. (арк. 1105—1106; арк. 1106 чысты з адрасам і пячаткай).

515. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ, 24.05.1745, выдадзены 15.06.1768. Актыкацыя выпісу з кніг Хрыстбургскага замкавага суда ад 1744 г. Ліст Элізабеты Аўгусты Шульцбах і яе дачкі Марыі Францішкі, нашчадкаў палаціна рэнскага, пфальцграфа баварскага, уступкі Слуцкага княства і іншых Нейбурскіх уладанняў падчашаму ВКЛ Геранімy Фларыяну Радзівілу, отчычу гэтых маёнткаў. Без месца, 23.12.1743.

Пячатка кустадыйная земскага суда Віленскага ваяводства (1768 г.).

Подпіс: згодна з актамі — Ржэвускі, віцэрэгент зем[скі] в[аяводств]а Вілен[скага] (1768 г.).

Арыгінал (1768 г.). Пол. і лацін. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 18 (закрэслена); № 15. 6 арк. (арк. 1107—1112).

516. Ліст-обліг ашмянскага чашніка Томаша Воляна, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, на пазыку ў яго 1870 зл. з тэрмінам вяртання грошай 6.06.1746. Без месца і даты [1745 г.].

Подпісы: Томаш Волян, чаш[нік] ашм[янскі]; Стэфан Багуслаў Волян; Крыштаф Няшкоўскі, П. Я. К. М.; Ян Касецкі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1113).

517. Выпіс з кніг Навагрудскага гродскага суда, 1.07.1745. Ліст караля Стэфана Баторыя да ўсіх ураднікаў і шляхты Ашмянскага пав. з загадам неадкладна ў тэрмін заплаціць падаткі на ўтрыманне войска ВКЛ ашмянскаму паборцы Мікалаю Ваўчку Абрамовічу. Вільня, 10.05.1579.

Пячатка на кустодыі навагрудскага ваяводы Мікалая Фаўстына Радзівіла.

Подпісы: Станіслаў Быкоўскі-Лопат, войскі і пісар гродз[кі] на[ва]г[рудс]кі; карыгаваў Яновіч, СМНГВН (скарбнік мінскі?, намеснік гродскі ваяводства Навагрудскага).

Арыгінал. Пол. м., стб. м. пол. літ. Філіграні. 2 арк. (арк. 1114—1115).

518. Выпіс з кніг Навагрудскага гродскага суда, 1.07.1745. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Антонія Драніцкага атаксавання (ацэнкі) па просьбе Яна Феліцыяна Абрамовіча розных рэчаў любчанскага жыда Гецэля Фавішовіча, пакінутых у суме грошай Я. Ф. Абрамовічу. [Навагрудак], 1.07.1745.

Пячатка на кустодыі навагрудскага ваяводы М. Ф. Радзівіла.

Подпісы: Станіслаў Быкоўскі-Лопат, войскі і пісар гродз[кі] на[ва]г[рудс]кі; карыгаваў Яновіч, СМНГВН (скарбнік мінскі?, намеснік гродскі ваяводства Навагрудскага).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 1116—1117).

519. Асекурацыйны ліст мазырскага пратапопа Феадора Савіцкага, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Юзафу Аранскаму, з запэўніваннем, што калі антонавіцкі празбітар Мацей Мачульскі не верне грашовы доўг у азначаны тэрмін, то сам заплаціць, як паручыцель па ім. Без месца, 24.10.1745.

Подпіс: Феадор Савіцкі, пратапоп мазырскі (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1118).

520. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда, 16.11.1745. Прыватны ліст (пісьмо) віленскага кашталяна, польнага гетмана ВКЛ Міхала Масальскага да сваёй сястры якімавіцкай старосцінай Грабоўскай з просьбай садзейнічаць і дапамагаць дукорскаму празбітару айцу Грыгорыю Пілецкаму (Пілієўскаму — у сусцэпце). Без месца, 5.08.1745.

Копія подпісу: карыгаваў Яленскі, РЗГВМ (рэгент земскі і гродскі ваяводства Мінскага).

Копія XVIII ст. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 1120).

521. Прыватны ліст (пісьмо) М. Рейбніча да слуцкага архімандрыта Юзафа Аранскага з паведамленнем аб выдаткаванні грошай на вядзенне судовага працэсу. Слуцк, 26.03.1745.

Подпіс: М. Рэйбніч, оберст… (не зразумела).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1121—1122; арк. 1122 чысты, з адрасам).

522. а) Рэгест (загаловак, кароткі змест) дакумента № 522-б. [XIX ст.].

б) Супліка празбітара Бялевіцкай царквы Антонія Страховіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб здзяйсненні грабяжоў, шкод і гвалтаў святаром Бялевіцкай царквы з боку мазырскага падкаморыя Казіміра Вольбека. Без месца і даты [1745 г.].

Подпіс: Антоні Страховіч, празбітар ц[арквы] Бялевіцкай.

Арыгінал. а) Рус. м. б) Пол. м. Філігрань. а) 1 арк. (арк. 1123); б) 2 арк. (арк. 1124—1125; арк. 1125 чысты, з затылкам).

523. Інквізіцыя (допыт сведак, іх сведчанні) царкоўных іерархаў па загаду слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі [Юзафа Аранскага] па скарзе п. Грыцкевіча на чэлішчэвіцкага празбітара айца Мікіту аб вянчанні падданай скаржніка без яго дазволу. Чэлішчэвічы, 9.01.1746.

Подпісы: Грыгоры Змаровіч, протапразбітар петрык[аўскі]; Ян Каржанеўскі, п[разбітар] скрыг[алаўскі]; Якаў Багароўскі, ПЦNП (празбітар …, далей не зразумела) (стб. м.).

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. Стар. сігн.: 25. 2 арк. (арк. 1126—1127).

524. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Мінску, 27.01.1746. Ахоўны ўніверсал віленскага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ Януша Радзівіла манастыру Св. Тройцы ў Слуцкім княстве на вызваленне манастырскіх маёнт-

каў Шыпілавічы, Ямінск, Родкавічы і Пухавічы Навагрудскага ваяводства ад вайсковых падаткаў і жаўнерскіх стацый. Вільня, 13.05.1654.

Пячатка на кустодыі Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: Ігнаці Стравінскі, пісар гродс[кі] слонім[скі], маршалак Трыбунала Гал[оўнага] ВКЛ; Д[амі]нік Ігнаці Букоўскі, ст[арос]та курклян[скі], ротм[істр] і д[э]п[у]т[а]т п[аве]та Ашмян[скага]; Петр Антоні Мойгіс, будаўнічы і дэпутат павета Вілкамір[скага]; Юзафат Копец, с[тарос]та обальскі, дэпутат п[аве]та Браслаўскага; Адам Барташэвіц, рот[міст]р і дэпутат п[аве]та Аршанскага; Караль Эйдзятовіч, падстолі смален[скі] і д[э]п[ута]т; Юзаф Валодковіч, пад[судкавіч] і дэпутат в[аяво]дс[тва] Мінскага, пісар Трыб[унала] Гал[оўнага] ВКЛ; Багдан з Кастравіц Кастравіцкі, стар[оста] пр[...] і д[э]п[ута]т в[аяво]дства Мін[скага]; Ян Келчэўскі, падстолі і дэпутат п[аве]т[а] Рэчыцкага; карыгаваў Яленскі, ГМРЗВМ і ТГВКЛ (гараднічы(?) мінскі, рэгент земскі ваяводства Мінскага і Галоўнага Трыбунала ВКЛ); згодна з актамі — Пушкін (на затылку).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 92 (выпраўлена на 86); 22 (закрэслена). 4 арк. (арк. 1128—1131).

525. Супліка святароў цэркваў Ярэміцкай воласці Слуцкага княства да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб абцяжарванні калятарам [кн. Радзівілам] іх цэркваў дадатковымі падаткамі на яго двор, жаўнерскімі стацыямі і інш. Без месца і даты (пададзена 4.03.1746).

Подпісы: Стэфан Акіншыц, празбітар ярэміцкі; Петр Біруковіч, Сымяон Біруковіч, Грыгоры Слаўтовіч, Юзаф Біруковіч, празбітары царквы Асавецкай; Петр Ярашэвіч, празбітар царквы Тальскай; Ян Трэнбачэўскі, п[разбітар] л[юбанскі]; Лукаш Шпілеўскі, празбітар любанскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1132, 1134; арк. 1134 чысты, з затылкам).

526. Прыватны ліст Міхала(?) Лаўцэвіча да нейкага Грыгорыя, каб выбраў падымны падатак сакавіцкай раты як са святароў Ярэміцкай воласці, так і з жыдоў па талеры з кожнай асобы. Ярэмічы, 14.03.1746.

Подпіс: М[іха]л(?) Лаўцэвіч.

Арыгінал(?). Пол. м. Фрагмент філіграні. 1 арк. (арк. 1133).

527. Супліка святароў Капыльскай царквы да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб гвалтоўнай забароне камісарам Пацейкаўскага двара п. Нацалевічам сялянам вв. Вайшкоты і Мазалі наведваць праваслаўную Капыльскую царкву, парафіянамі якой яны з'яўляюцца. Без месца і даты (пададзена 12.04.1746).

Подпісы: Ян Пыжэвіч, празбітар ц[арквы] К[апыльскай]; Аляксандр Ярашэвіч, п[разбітар] ц[арквы] Капыльскай; Кліменты Маўчановіч, празбітар ц[арквы] Капыльскай.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1135—1136; арк. 1136 чысты, з затылкам).

528. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда, 29.07.1746. Актыкацыя выпісу з кніг Слуцкага замкавага суда, 21.02.1732. Ліст-прэзента (прадстаўленне) крычаўскага і члухоцкага старосты Гераніма Радзівіла айцу Юзафу Аранскаму на слуцкае архімандрыцтва, абранаму на гэтую пасаду Слуцкай капітулай па смерці былога архімандрыта айца Тэадозія Ваўковіча. Замак Бяльскі, 6.02.1732.

Пячатка на кустодыі мінскага судовага старосты [...] Іваноўскага.

Подпіс: у адсутнасці пана рэгента карыгаваў Пушкін, н[аместнік] г[родскі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 4 арк. (арк. 1137—1139, 1144).

529. а) Выпіс з кніг кансісторскіх Кіеўскай архіепіскопіі і кніг праўных Кіеўскай катэдры, [3.07.1732]. Ліст-прэзента (прадстаўленне) крычаўскага і члухоцкага старосты Гераніма Радзівіла айцу Юзафу Аранскаму на Слуцкае архімандрыцтва, абранаму на гэтую пасаду Слуцкай капітулай па смерці былога архімандрыта айца Тэадозія Ваўковіча. Замак Бяльскі, 6.02.1732.

Пячатка кустадыйная кансісторыі Кіеўскай архіепіскопіі.

Копія подпісу: Геранім князь Радзівіл, староста крычаўскі.

Подпісы: Рафаэль Забароўскі, архіепіскап кіеўскі; Юзаф Ваўчанскі, архімандрыт манастыра С[вята]Нікольскага Пустыннага, суддзя кансісторыі духоўнай архіепіскопіі Кіеўскай; Амброжы Дубновіч, архімандрыт і рэктар калегіума Кіеўскага, суддзя судоў кансісторскіх; Кіева-Міхалаўскага манастыра ігумен Алексы Пятрына, судоў архіепіскопіі кіеўскай суддзя; Тэадозі Хамінскі, ігумен манастыра Свята-Міхальскага Выдубіцкага Кіеўскага; Тэадозі Глінскі, ігумен манастыра Свята-Траецкага Кірыльскага Кіеўскага; Сільвестр Думніцкі, намеснік катэдры архіепіскопіі Кіеўскай; Тэафан Трафімовіч, архідыякан катэдры архіепіскопіі Кіеўскай; Герман Канашэвіч, экзаменатар катэдры архіепіскопіі Кіеўскай.

б) Нататка на арк. 1142 аб выдачы вышэйзгаданага выпісу. Без месца, [7.05.1733].

Подпіс: Тыматэуш Шчарбацкі, катэдры Кіеўскай натарыус (пісар).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 67; 63. 4 арк. (арк. 1140—1143; арк. 1143 чысты, з затылкам).

530. Прыватны ліст (пісьмо) [Стэфана-Багуслава] Воляна (ініцыялы і пасада не расшыфраваны) да [слуцкага архімандрыта?] з просьбай пачакаць вяртання грошай, якія некалі ў архімандрыта пазычыў яго нябожчык бацька. Грозаў, 3.08.1746.

Подпіс: С[тэфан] Б[агуслаў] Волян, [...].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 1145—1146).

531. а) Тэстамент слуцкага абываталя і сесіяналіста (члена) Слуцкага магістрацкага суда Даміяна Ладычкі, якім ахвяруе 8000 зл. і краму на адбудову Саборнай царквы ў Слуцку і пэўныя сумы іншым цэрквам, запісвае свой

дом у Слуцку на вул. Шырокай Новамейскай Грыгорыю Ладычку і інш. Слуцк, 10.09.1746.

Копіі подпісаў: Якуб Ваўковіч; Якуб Мелянтовіч.

б) Нататка аб зверцы гэтай копіі з арыгіналам. Без месца, 7.12.1747.

Копія подпісу: Казі[мір] Шэмбель, пісар урадавы замка Слуцкага.

Копія XVIII ст. Пол. м. Філіграні. 4 арк. (арк. 1147—1150).

532. Супліка святароў Петрыкаўскай пратапопіі да [слуцкага архімандрыта] аб здзяйсненні крыўд святаром Урбанам Антоніем Грабніцкім, камісарам маёнтка Петрыкаў брэсцкай ваяводзінай Хадкевічавай, закрыцці праваслаўных цэркваў і перадачы іх уніятам, захопах царкоўнай маёмасці і інш. Без месца і даты (пасля 1741 г.). Без подпісу.

Копія XVIII ст. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 5. 2 арк. (арк. 1151, 1154).

## Літаратура

1. Беларускі археаграфічны штогоднік. Мінск, 2004. Вып. 5. С. 47—72; Мінск, 2005. Вып. 6. С. 288—311; Мінск, 2006. Вып. 7. С. 225—237; Мінск, 2007. Вып. 8. С. 72—88; Мінск, 2008. Вып. 9. С. 194—214.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.03.2012*

***Ю. М. Лаўрык,***
*вядучы навуковы супрацоўнік*
*навукова-фондавага аддзела*
*пісьмовых і выяўленчых крыніц*
*Нацыянальнага гістарычнага музея*
*Рэспублікі Беларусь,*
*аспірант Інстытута гісторыі НАНБ;*
e-mail: lawryk@tut.by

# КНІГАВЫДАВЕЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ СПІРЫДОНА СОБАЛЯ Ў КУЦЕЙНЕ

*Літаратура і крыніцы.* Навуковую літаратуру, прысвечаную Спірыдону Собалю, нельга назваць шматлікай, хоць і ў цені гэтае імя таксама не знаходзілася. Выданні Собаля досыць часта фігуруюць як у дарэвалюцыйных, так і ў найноўшых бібліяграфіях (айчынныя — у т. л. куцеінскія — выданні найбольш падрабязна прадстаўлены ў каталогу Г. Я. Галенчанкі [1]); згадкі пра яго дзейнасць прысутнічаюць амаль ва ўсіх аглядавых публікацыях па кірылічным кнігадрукаванні ў Беларусі ў 1-й пал. XVII ст. Разам з тым, уражвае невялікая колькасць даследаванняў, прысвечаных непасрэдна дзейнасці друкара, што, магчыма, звязана з адноснай рэдкасцю яго выданняў, некаторыя з якіх захаваліся ў адным або некалькіх паасобніках.

Асноватворчае даследаванне па тэме было падрыхтавана прадстаўніцай расійскага кнігазнаўства А. Зёрнавай, якая дзякуючы багаццю фондаў ДБЛ СССР (сёння — Расійская дзяржаўная бібліятэка) змагла вывучыць усе вядомыя на той час Собалевы друкаваныя выданні [2]. Заслуга даследчыцы перш за ўсё заключаецца ў тым, што яна правяла аналіз шрыфтоў і аздаблення гэтых кніг, а таксама выявіла выданні з несапраўднымі выходнымі данымі і ажыццявіла даволі пераканаўчую (хоць і не заўсёды бясспрэчную) спробу вызначэння іх храналогіі. Таксама менавіта А. Зёрнавай беларусы абавязаны вяртаннем у навуковы зварот фактаграфіі з дарэвалюцыйнай працы Ф. Жудро пра мінуўшчыну магілёўскага брацтва [3], якая даводзіць, што Спірыдон Собаль быў нашым суайчыннікам родам з Магілёва [2, с. 126—127].

Для вызначэння тых ці іншых акалічнасцей біяграфіі друкара былі карысныя дакументы, выяўленыя дзякуючы росшукам украінскіх гісторыкаў Я. Ісаевіча [4; 5] і А. Мацюка [6; 7], а таксама польскага даследчыка Э. Ружыцкага [8]. Шэраг матэрыялаў, звязаных з жыццём і дзейнасцю Спірыдона Собаля (у т. л. знойдзеныя згаданымі даследчыкамі), былі апублікаваны ў зборніках дакументаў «Русско-белорусские связи» [9] і «Першодрукар Іван Федоров та його послідовники на Україні» [10]. Філіграні Собалевых выданняў даследаваліся Т. Дыянавай у межах вывучэння паперы ўкраінскіх і беларускіх кірылічных старадрукаў, вынікі якога былі апублікаваны ў падрыхтаваным ёю альбоме [11].

Калі казаць пра айчынныя даследаванні, дзейнасць Спірыдона Собаля ўвогуле найбольш поўна прадстаўлена ў аглядавых працах па гісторыі беларускай кнігі і кнігадрукавання Г. Галенчанкі [12] і М. Нікалаева [13]. Мастацкае аздабленне выпушчаных друкаром кніг разглядаў В. Шматаў [14; 15]. У артыкуле Г. Кірэевай разглядаюцца прысутныя ў зборах мінскіх бібліятэк Собалевы выданні [16], а яго «Буквару» прысвечаны публікацыі беларускіх даследчыкаў М. Батвінніка [17] і І. Яршова [18].

*Куцеінскі перыяд дзейнасці Спірыдона Собаля.* Паколькі ў дадзеным артыкуле дзейнасць Собаля нас цікавіць перш за ўсё ў сувязі са знаходжаннем апошняга ў Куцейне, спынімся спецыяльна на гэтым перыядзе жыцця друкара. Тэкст першага выдання кіеўскага Апостала быў папярэджаны прысвячэннем Багдану Сцяцкевічу, які прафінансаваў публікацыю гэтай кнігі. У прысвячэнні друкар, між іншым, звяртаецца да фундатара з пажаданнем «жебысь Вмс милостивыи Пан тыи працы моей початки обачивши, зрозумети рачил яко снадне можеши в державе своей типографiи розширити»[*]. Працытаваны фрагмент даў падставы А. Зёрнавай [2, с. 134], а за ёй і іншым даследчыкам, выказаць думку, што Собаль нібыта прыехаў у Беларусь па запрашэнні Багдана Сцяцкевіча і распачаў кнігавыданне ў маёнтку апошняга ў Куцейне.

Такое меркаванне, аднак, нельга прыняць без засцярогі, паколькі ўрочышча Куцейна ніколі не з'яўлялася вотчынай Сцяцкевічаў, а было куплена апошнімі на пачатку 1620-х гг. толькі дзеля заснавання ў ім Багаяўленскага манастыра — якому адразу ж і было аддадзена.

Менавіта таму ні ў адным з куцеінскіх выданняў Собаля мы не сустракаем прысвячэння фундатару, абавязковага ў этыцы адносін кліента і мецэната. Так, прысвячэнне Багдану Сцяцкевічу, напрыклад, прысутнічае ў «1-м»[**] і «3-м выданнях» «Апостала», уяўляючы сабой выраз удзячнасці друкара і змяшчаючы пазначэнне, што «тая книга власным коштом и накладом Вмс: Пана … вельце милостивого на свет выходить». Але нават у «2-м» (куцеінскім) выданні «Апостала» падобнага прысвячэння няма [2, с. 130], хоць большая частка кнігі была надрукавана яшчэ ў Кіеве (праўда, тытульны аркуш, які змяшчае аналагічную формулу, і герб Сцяцкевіча ўзноўлены без змен).

Не сустракаем мы ў куцеінскіх выданнях і такога пазначэння, якое прысутнічае на тытульным аркушы буйніцкага «Псалтыра» 1635 г. і паведамляе, што кніга выпушчана «в маетности его милости пана Богдана Стеткевича, подкоморего мстиславского», — а яно павінна было б быць, калі б Куцейна

---

[*] Гэтыя ж словы прысутнічаюць і ў прысвячэнні да 3-га выдання «Апостала» — гл.: Апостол. 3-е изд. Могилев, 1638 (тип. С. Собаля). Арк. 3 (5). Экз. НББ, 09/4095.

[**] У Кіеве Собаль не паспеў закончыць выпуск усяго накладу кнігі, а пазней друкаваў адсутныя сшыткі ў Куцейне і Магілёве. У літаратуры асобнікі з дадрукаванымі часткамі абазначаюцца як 2-е і 3-е выданні, але паколькі *de facto* яны такімі не з'яўляюцца, мы бяром гэтыя выразы ў двукоссі.

належала апошняму. Усё гэта сведчыць пра тое, што прыезд Спірыдона Собаля ў Куцейну нельга тлумачыць запрашэннем Багдана Сцяцкевіча.

Разам з тым, вяртанне Собаля ў Беларусь і выданне ім кніг у Куцейне зрабілася магчымым усё ж не без удзелу прадстаўнікоў названага роду. Каля 1630 г. Ганна Сцяцкевічава з Агінскіх і Ян Сцяцкевіч-Заверскі купілі і падарылі Багаяўленскаму манастыру, у дадатак да зробленых Багданам ахвяраванняў, суседні з манастырскімі землямі маёнтак Белкаўшчыну. У пераліку задач, на вырашэнне якіх паводле свайго выбару брацiя магла выдаткоўваць даходы з гэтых новападораных уладанняў, фундушавы акт называе пабудову яшчэ аднаго манастыра, адкрыццё школы і заснаванне друкарні.

Думаецца, што мэты, на дасягненне якіх мог быць выдаткаваны прыбытак з надання, папярэдне абмяркоўваліся паміж фундатаркай з аднаго боку і Яілям Труцэвічам і манастырскімі вярхамі з другога. Усе гэтыя мэты з часам маглі быць рэалізаваны, аднак, найперш брацiя аддала перавагу менавіта справе выдання кніг: верагодна, для таго, каб забяспечыць сябе малітоўнай літаратурай, а будучую школу — падручнікамі. Адразу ж па атрыманні фундушу быў распачаты пошук шляхоў для рэалізацыі гэтага рашэння.

Выбар кандыдатуры Спірыдона Собаля, як і яго згода на прыезд, не былі выпадковымі. З аднаго боку, увага брацii скіроўвалася на яго асобу ўжо з прычыны цесных сувязей Багаяўленскага манастыра з праваслаўным асяродкам Магілёва, сярод дзейных членаў якога былі сваякі і сябры Собаля; з другога — Собаль не мог заставацца ў Кіеве з прычыны варожага стаўлення да яго Пятра Магілы [5, с. 71].

На момант, калі Спірыдон Собаль атрымаў запрашэнне пераехаць у Куцейну, быў завершаны друк толькі часткі накладу «Апостала». Але друкар неадкладна на запрашэнне адгукнуўся, і далейшыя работы былі згорнуты. Менавіта раптоўнасцю ад’езду і належыць тлумачыць той факт, што ў шэрагу паасобнікаў «Апостала» з кіеўскімі выходнымі данымі некаторыя сшыткі былі дадрукаваны пазней — ужо ў Беларусі, а згаданая ў духоўніцы частка накладу ўвогуле засталася незакончанай. Толькі праз пэўны час пасля прыезду ў Куцейну — не раней за 1632 г. — друкар змог узяцца за далейшы набор ненадрукаваных сшыткаў.

Адразу працягнуць працу над «Апосталам» Собаль не меў магчымасці, бо выконваў заказ Труцэвіча, друкуючы вучэбную і малітоўную літаратуру. Трэба сказаць, што ў гэтым выпадку паняцці «вучэбная» і «малітоўная кніга» ў значнай ступені перакрываліся між сабой. За першыя гады свайго знаходжання ў Куцейне друкар, як адзначалася вышэй, выпусціў у свет «Буквар» — падручнік, які, аднак, змяшчаў значную колькасць тэкстаў малітоўнага і катэхітычнага характару, а таксама — малітоўнік, часаслоў і даследаваны Псалтыр. Апошнія дзве кнігі традыцыйна выкарыстоўваліся на ўсходнеславянскіх землях для практычнага навучання чытанню. Такім чынам, у гэтым шэрагу вучэбнага прызначэння не меў хіба толькі малітоўнік («Малітвы што-

дзенныя»), які, тым не менш, мог быць карысны кожнаму праваслаўнаму верніку.

Верагодна, адразу па прыездзе ў Куцейну друкар атрымаў ад манастыра пэўную суму на пакрыццё выдаткаў: мы ведаем, што была набыта папера (філіграні ў першых куцеінскіх выданнях адрозніваюцца ад сустрэтых у кіеўскіх выданнях Собаля) [11, с. 182] і адліты новы, драбнейшы шрыфт для друкавання «Малітваў штодзённых» [2, с. 139].

Да сённяшняга дня амаль не захавалася крыніц, якія ўказвалі б на тое, якія сумы і як часта выплачваліся друкару манастыром. Адзінае выключэнне — гэта запісаны ў кнігах магілёўскага магістрата 1645 г. «квітанцыйны ліст» Яіля Труцэвіча, які сведчыць, што Спірыдон Собаль заплаціў манастыру «триста коп литовских», якія быў вінаваты [10, с. 217]. З тэксту дакумента нельга зрабіць высновы, з якой прычыны і ў якім годзе «зостал … был винен пан Спиридон Собол теперешнии Силвестер, інок печарскии» гэтыя грошы куцеінскай брацііі. Можна толькі зразумець, што справа адбывалася яшчэ да пастрыжэння апошняга ў манахі — да 1640 г. Гэтая справа зноў набыла актуальнасць у 1645 г. з прычыны падрыхтоўкі Собаля да ад'езду за мяжу (у Валахію) і раздзелу сваёй маёмасці між дзецьмі. Баючыся, каб распіска, якая некалі захоўвалася ў пана Міхала Пуцяты і была згублена, не стала падставай для судовага працэсу супраць сыноў, інак Сільвестар дамогся ўпісання пацвярджэння пра аплату грошай у магістрацкія кнігі Магілёва.

Сума ў трыста коп на той час была даволі значнай. Напрыклад, іншы тагачасны друкар Цімафей Вярбіцкі «ўсяго» за дзвесце коп грошай купіў у 1624 г. у Кіеве цэлы «двор» з домам, у якім усталяваў свой варштат і пачаў выдаваць кнігі [5, с. 66]. Можна думаць, што выплачаныя Собалю манастыром грошы былі прызначаны на пакрыццё выдавецкіх выдаткаў. Напэўна, гэта ўласна і была тая самая атрыманая Собалем па прыездзе выплата, якая дазволіла яму адліць новы шрыфт для куцеінскага малітоўніка і закупіць паперы для далейшай працы.

Разам з тым, на цяперашні момант не зусім ясна, на якіх падставах будаваліся эканамічныя ўзаемаадносіны друкара з куцеінскай брацціяй. У выданнях гэтага перыяду ні манастыр, ні праца чарняцоў нідзе не згадваюцца; на тытульных аркушах адзначаецца толькі тое, што ўпамянутыя кнігі выходзілі «в Кутейне з друкарни Спиридона Собаля». Гэта дазваляе думаць, што Собаль, нягледзячы на размяшчэнне друкарні на тэрыторыі манастыра, выступаў у Куцейне як незалежны прадпрымальнік з уласнымі сродкамі вытворчасці. Разам з тым, калі брацція пакрывала выдавецкія выдаткі і, хутчэй за ўсё, пастаўляла са свайго асяродку рабочую сілу для друкарні, то яна павінна была прэтэндаваць калі не на ўвесь наклад, то, прынамсі, на значную частку прадукцыі.

Яшчэ адным пытаннем, якое ў літаратуры да канца не высветлена, з'яўляецца ад'езд Собаля ў Буйнічы. А. Зёрнава выказала здагадку, што пераезд

Собаля бліжэй да Магілёва мог быць звязаны з ваеннымі дзеяннямі 1632—1634 гг. [2, с. 138—139]. Аднак версія пра эвакуацыю друкарні Собаля з Куцейны з прычыны наступлення маскоўскіх войскаў або боязі такой небяспекі, здаецца непераканаўчай.

Падзеі так званай «Смаленскай вайны» разглядаюцца, у прыватнасці, у кнізе А. Вайнштэйна «Россия и тридцатилетняя война (1618—1648 гг.)» [20]. Яе аўтар паказвае, што ў той час маскоўскія войскі захапілі тэрыторыю Смаленшчыны прыкладна па лініі Дарагабуж—Рослаў—Старадуб, і калі прасоўваліся далей за гэтую лінію на захад да Крычава, яны хутчэй пагражалі Магілёву, чым Оршы [20, с. 168], якая знаходзілася на большай адлегласці ад фронту. Таму дзіўна было б думаць, што Собаль, уцякаючы ад вайны, пераехаў з Куцейны ў Буйнічы — хутчэй можна было б чакаць адваротнага накірунку. Гэта нам падказвае, што ад’езд друкара з Куцейны быў выкліканы іншымі прычынамі.

Вывучэнне А. Зёрнавай друкарскага матэрыялу паказала, што некаторыя з выпушчаных Собалем у Куцейне кніг былі паўтарэннем яго кіеўскіх выданняў з захаваннем старых выходных звестак. Таксама яна прыйшла да высновы, што не ўвесь наклад «Часаслова» з пазначэннем 1632 г. выхаду быў закончаны ў адзін час: некаторыя паасобнікі маюць перанабраныя апошнія чатыры сшыткі, што ўказвае на пазнейшую дадрукоўку часткі накладу. Аўтарам гэтых радкоў таксама разглядалася версія, што варыянтнасць набору згаданых сшыткаў звязана з увядзеннем у працу новазбудаванага манастырскага варштату. Гэтая гіпотэза, аднак, не пацвердзілася, паколькі ксілаграфічныя аздобы ў дадрукаваных сшытках паказваюць стан большай зношанасці адносна першага выдруку [2, с. 139]. Калі б набор розных варыянтаў апошніх сшыткаў рабіўся адначасова, то і адбіткі, якія ў іх сустракаюцца, дэманстравалі б аднолькавы стан дошак.

Магчыма, перавыданне кіеўскіх выданняў не было санкцыянавана манастырскімі вярхамі або заўчаснае спыненне працы над «Часасловам» парушала папярэднюю дамоўленасць Собаля з брацціяй: кожная з гэтых прычын магла выклікаць канфлікт і прывесці да незапланаванага ад’езду друкара. З другога боку, ад’езд мог быць акурат запланаваны і звязаны з заканчэннем працы па вырабе манастыром уласнага варштату на ўзор Собалевага.

Улічваючы працаздольнасць Спірыдона Собаля, які, распачынаючы друкарскую дзейнасць на новым месцы, кожны раз паспяваў ужо ў першы год выдаць некалькі кніг (Кіеў: «Актоіх», «Ліманар» і «Мінея агульная»; Куцейна: «Буквар» і «Малітвы штодзённыя»), ад’езд друкара з Куцейны павінен быў адбыцца не раней як у 1634 г., а хутчэй нават у 1635 г., бо ў Буйнічах ён здолеў апублікаваць толькі «Псалтыр». Гэтая думка падмацоўваецца і наступным меркаваннем: наўрад ці Собаль падчас ваенных дзеянняў адправіўся б са сваім варштатам, усім абсталяваннем і лёгкімі на загаранне кнігамі, якія складалі аснову яго рухомай маёмасці, у больш небяспечны — як мы

ўбачылі вышэй — раён, якому пагражалі напады непрыяцеля і дзе, зрэшты, маглі абрабаваць свае ж войскі, там сканцэнтраваныя. Усялякі разважны чалавек перад тым, як выправіцца ў падобнае падарожжа, дачакаўся б заканчэння ваенных дзеянняў. Такім чынам, ад'езд Собаля з Куцейны ў Буйнічы мог адбыцца не раней за сакавік—красавік 1634 г. (пагадненне Уладзіслава IV з маскоўскім ваяводам Шэіным аб перамір'і было падпісана 28 лютага 1634 г.).

*Праблема выданняў з несапраўднымі выходнымі звесткамі і іх сувязь з Куцейнай.* Праведзены А. Зёрнавай скрупулёзны аналіз выпушчаных з аднолькавымі выходнымі звесткамі «Ліманара», «Актоіха» і «Апостала», дапамог ёй заўважыць, што кожная з гэтых кніг вытрымала па некалькі выданняў, якія адрозніваліся паводле набору, ужытых шрыфтоў для друку тых ці іншых фрагментаў, а таксама іншых характарыстык. Больш таго, вывучэнне стану элементаў аздаблення — інакш кажучы, «гісторыі» развіцця дэфектаў у ксілаграфічных дошках, — дазволіла даследчыцы скласці досыць пераканаўчую храналогію іх выхаду.

У прыватнасці, апісваючы пашкоджанні і спробы іх наладжвання ў адной з Собалевых заставак (якая паходзіла з друкарні Івана Фёдарава), А. Зёрнава вылучыла восем станаў дошкі. Размясціўшы іх у храналагічным парадку, яна, у прыватнасці, даказала, што паасобнікі «Апостала», якія фігуруюць у літаратуры як «2-е выданне», дадрукоўваліся ў той час, калі выходзіў куцеінскі «Часаслоў» — г. зн., каля 1632 г. Сёння гісторыкі схільны прымаць аргументацыю маскоўскай даследчыцы без пярэчанняў і датаваць гэтую дадрукоўку названым часам, адносячы яе да прадукцыі Куцейны [1, с. 103].

Аналіз стану згаданай застаўкі (як і некаторых іншых дошак) даў А. Зёрнавай падставы сцвярджаць, што і 2-е выданне «Актоіха» выйшла не раней за 1632 г., а менавіта пасля выпуску першага выдання «Часаслова», але больш ці менш адначасова з заканчэннем працы над названай кнігай. Ужытая методыка, аднак, не дазволіла маскоўскай даследчыцы адназначна выказацца, ці выйшла 2-е выданне «Актоіха» перад дадрукоўваннем часткі накладу «Часаслова», ці ўжо пасля. Таму, вагаючыся паміж Куцейнай і Буйнічамі, А. Зёрнава не асмелілася зрабіць канчатковага выбару адносна месца выхаду «Актоіха» [2, с. 139]. З яе артыкула гэтая няпэўнасць пранікла і ў працы іншых даследчыкаў.

Несумненна, 2-е выданне «Актоіха» ўбачыла свет яшчэ ў Куцейне і яго належыць залічваць менавіта да спісу куцеінскіх выданняў, пра што сведчыць факт адсутнасці на кнізе ўказання, што яна выпушчана «в маетности его милости пана Богдана Стеткевича, подкоморего мстиславского»: калі б Собаль працаваў ужо ў Буйнічах, то ён не мог бы гэтую акалічнасць праігнараваць, не пазначыўшы на тытульным аркушы.

Крыху інакш маецца справа з атрыбуцыяй 2-га выдання «Ліманара», якое А. Зёрнава таксама адносіць да куцеінскага перыяду дзейнасці Собаля. Датаваць гэтую кнігу на падставе апісанай вышэй методыкі немагчыма,

паколькі ў дадзеным выпадку не выкарыстоўваліся вялікія ксілаграфічныя дошкі, а на падставе дробных элементаў аздаблення (такіх, як ініцыялы) складана прасачыць развіццё дэфектаў. Таму А. Зёрнава пайшла іншым шляхам: аналізуючы ўжытыя элементы аздаблення, яна заўважыла, што ў адным з выданняў выкарыстоўваюцца пераважна ініцыялы вышынёй 14 мм, а ў другім — 10 мм. Паколькі ў кіеўскім «Актоіху» 1628 г. ужыты большыя паводле памеру ініцыялы, а дробныя сустракаюцца ў беларускіх выданнях Собаля, даследчыца прыйшла да высновы, што выданне з параўнальна буйнымі (14 мм) ініцыяламі з'яўляецца 1-м і выйшла ў Кіеве ў 1628 г., а выданне з меншымі ініцыяламі (10 мм) убачыла свет на пачатку 1630-х гг. і з'яўляецца 2-м.

У дадзеным даследаванні перад аўтарам гэтых радкоў стала задача высветліць, ці было хаця б адно з названых выданняў «Ліманара» апублікавана ў Куцейне. Найбольш верагодным спосабам гэта высветліць з'яўляецца вывучэнне ўжытай для друкавання «Ліманара» паперы і суаднясенне выяўленых вадзяных знакаў з філігранямі іншых выданняў Собаля і манастырскай друкарні. З гэтай мэтай былі прагледжаны паасобнікі «Ліманара» са збораў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (094/2485, 094/4791, 094/4797) і Цэнтральнай навуковай бібліятэкі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (К 16-18/Нр 49, К 16-18/Нр 69). У іншых айчынных кнігасховішчах названая кніга не выяўлена.

Гэты прагляд даў цалкам нечаканыя вынікі. Так, у выданні з дробнымі ініцыяламі (НББ: 094/4791; ЦНБ НАНБ: К 16-18/Нр 49) былі выяўлены філіграні: 1) з гербам кн. Ераніма Сангушкі і двухрадковым подпісам (вадзяны знак, падобны да паказанага Т. Дыянавай пад № 101); 2) з выявай рыбы ў коле (падобны да паказанай Т. Дыянавай пад № 688). Асноўнай філігранню ў абодвух прагледжаных паасобніках быў менавіта герб Сангушкі. Некалькі разоў таксама сустракаецца філіграць, якую не ўдалося ідэнтыфікаваць з прычыны малога памеру і знаходжання яе на лініі згібу паперы (кніга мае фармат у ¼ аркуша, і згіб трапляе на сярэдзіну філіграні).

Паводле вынікаў, атрыманых Т. Дыянавай, кіеўскі «Актоіх» 1628 г. быў надрукаваны на паперы з філігранямі, указанымі ў яе альбоме пад № 101, 413 і 688 [11, с. 182]. Такім чынам, блізкае падабенства, прынамсі, дзвюх выяўленых намі філіграней да двух з трох вадзяных знакаў на паперы, ужытай для друку гэтай кнігі, дае падставы меркаваць, што «Ліманар» з дробнымі ініцыяламі» выходзіў прыкладна ў адзін час з 1-м выданнем «Актоіха», г. зн. у 1628 г. і таксама быў 1-м, а не 2-м выданнем.

У 2-х паасобніках «Ліманара» з буйнымі ініцыяламі» (НББ: 094/2485; ЦНБ НАНБ: К 16-18/Нр 69) было выяўлена некалькі відаў філіграней, якія рэгулярна паўтараюцца: 1) выява гарлачыка з ініцыяламі «ВС» у некалькіх варыянтах (у прыватнасці, вельмі блізкія вадзяныя знакі паказаны Т. Дыянавай пад № 370 і 376); 2) выява дзвюхчасткавага герба на картушы з ініцыяламі «W» і «I» абапал картуша ў верхняй яго частцы (падобны да паказанага

Т. Дыянавай пад № 199); 3) выява радзівілаўскага арла, аточанага вянком і з гербам «Трубы» на грудзях (падобны да паказанага Т. Дыянавай пад № 500 і 501*, а таксама Лаўцявічусам — пад № 182); 4) выява картуша з кругам (?) пасярэдзіне, увенчанага рыцарскім шлемам з 2-ма радамі пёраў з ініцыяламі «I» і «A» абапал (у альбомах філіграней не выяўлены). Гэта асноўныя філіграні, якія сустракаюцца прыкладна ў роўнай прапорцыі (дакладную статыстыку правесці немагчыма з прычыны кепскага стану паасобнікаў і страты або рэстаўрыравання шэрагу старонак). Акрамя таго, некалькі разоў сустракаліся філіграні, якія не ўдалося ідэнтыфікаваць, а аднойчы ў паасобніку ЦНБ НАНБ (К 16-18/Нр 69) быў сустрэты вадзяны знак з гербам Сангушкі.

Яшчэ ў адным паасобніку гэтага выдання, які належыць НББ (094/4797), вадзяныя знакі з выявамі гарлачыка і герба з дзвюхчасткавым шчытом і ініцыяламі «W» і «I» не былі выяўлены. На паперы гэтага паасобніка сустракаюцца філіграні з выявай радзівілаўскага арла, аточанага вянком, а таксама герба з ініцыяламі «I» і «A» і 2-ма радамі пёраў на шлеме. Аднак найчасцей сустрэтай філігранню гэтага паасобніка з'яўляецца выява неаточанага вянком арла без кароны і герба на грудзях, якую не ўдалося атаясаміць з прадстаўленымі ў альбомах вадзянымі знакамі.

Паводле Т. Дыянавай, папера з трыма філігранямі, указанымі ў яе альбоме пад № 199, 370 і 376, сустракаецца толькі ў кіеўскім «Літургіёне» 1629 г. [11, с. 182]. Крыху больш складанай з'яўляецца справа з выявай радзівілаўскага арла ў вянку. Як адзначана вышэй, варыянты вадзянога знака, найбольш блізкія да нашага, але адрозныя ў пэўных элементах, паказаны Т. Дыянавай пад № 500 і 501 і Лаўцявічусам — пад № 182. Выкарыстанне выявы, адзначанай пад № 500, Дыянава таксама паказвае ў «Ліманары» з кіеўскімі выходнымі данымі (без вылучэння паасобных выданняў) [11, с. 181], а філіграні пад № 501 — у куцеінскіх выданнях 1637 і 1651 гг. [11, с. 182—183] Лаўцявічус рэгіструе ўжыванне знака, пазначанага ў яго альбоме пад № 182, у 1625 г. у Вільні і ў 1629 г. у Гродне [21, с. 177].

Такім чынам, прысутнасць пераважнай часткі філіграней «Ліманара» з буйнымі ініцыяламі» ў розных друкаваных і рукапісных дакументах, пазначаных 1629 г. (а таксама адсутнасць іх у «Апостале» 1630 г. і куцеінскіх выданнях пачатку 1630-х гг.), схіляе датаваць нашу кнігу менавіта 1629 г. і атрыбутаваць яе як 2-е выданне. Адзначаную толькі аднойчы прысутнасць філіграні з гербам Сангушкі можна растлумачыць ужываннем леташніх залежаў паперы. Такім чынам, можна меркаваць, што абодва выданні «Ліманара» выйшлі

* Паколькі філігрань трапляе на лінію згібу аркуша, дэталёваму разгляду паддаецца або верхняя, або ніжняя частка вадзянога знака. З гэтай прычыны цяжка сказаць, ці маем мы ў нашай кнізе дачыненне з абодвума ўказанымі варыянтамі, ці — з прамежкавым, які злучае ў сабе паасобныя дэталі і аднаго, і другога (больш праўдападобным здаецца менавіта другі варыянт).

ў Кіеве (адно — у 1628 г., а другое — у 1629 г.) і да Куцейны ніякага дачынення не маюць.

*Вынікі.* Такім чынам, мы пабачылі, што Спірыдон Собаль прыехаў у Куцейну не з ініцыятывы Багдана Сцяцкевіча, а на запрашэнне Яіля Труцэвіча і куцеінскіх вярхоў, і заставаўся там да 1634 г. або 1635 г. Мэтай яго прыезду было друкаванне вучэбных і малітоўных кніг, прызначаных для забеспячэння патрэб праваслаўных вернікаў. Апрача публікацыі замоўленых брацціяй кніг, менавіта ў Куцейне Собаль перавыдаў некалькі сваіх кіеўскіх выданняў з захаваннем старых выходных звестак — «Апостал» і «Актоіх». Разам з тым, «Ліманар» з дробнымі ініцыяламі» (Кіеў, 1628 г.), які паводле прынятай у літаратуры думкі таксама выйшаў у Куцейне, на самой справе мае на тытульным аркушы сапраўдныя выходныя даныя. Што датычыць «Ліманара» з буйнымі ініцыялямі» і тымі ж самымі выходнымі звесткамі, то ён таксама ўбачыў свет у Кіеве, але ў 1629 г. і з'яўляецца 2-м выданнем.

### Літаратура і крыніцы

1. Старадрукаваныя кірылічныя выданні XVI — XVIII стст. / Склад. Г. Я. Галенчанка // Кніга Беларусі (1517—1917): Зв. каталог / ДБЛ БССР; склад. Г. Я. Галенчанка, Т. В. Непарожная, Т. К. Радзевіч. — Мінск: БелСЭ, 1986. — С. 9—189.
2. Зёрнава, А. С. Белорусский печатник Спиридон Соболь // Книга: Исслед. и матер. Сб. X. —М.: Книга, 1965. — С. 126—145.
3. Жудро, Ф. А. История Могилевского Богоявленского братства. — Могилев-на-Днепре, 1890. — 112 с.
4. Исаевич, Я. Д. Новые материалы об украинских и белорусских книгопечатниках первой половины XVII в. // Книга: Исслед. и матер. Сб. 34. — М.: Книга, 1977. — С. 152.
5. Исаевич, Я. Д. Преемники первопечатника / Я. Д. Исаевич. — М.: Книга, 1981. — С. 69—74.
6. Мацюк, О. Я. Спиридон Соболь и русско-украинско-белорусские связи // Вторая Всесоюзная науч. конф. по проблемам книговедения «Книговедение и его задачи в свете актуальных проблем советского книжного дела». Секция истории книги (Общие проблемы истории книги. История книги в СССР): Тезисы докладов / АН СССР: МК СССР; Госкомиздат Совмина СССР. — М., 1974. — С. 46—48.
7. Мацюк, О. Я. Новые документы о Спиридоне Соболе // Федоровские чтения 1973 «400-летие книгопечатания на Украине»: Сб. науч. трудов. — М., 1976. — С. 59—67.
8. Różycki E. Nieznane szczegóły z życia białoruskiego drukarza Spiridona Sobola // Rocznik Biblioteki Narodowej. — Warszawa, 1973. — S. 287—294.
9. Русско-белорусские связи: Сб. док. (1570—1667 гг.) / Главное архивное управление при СМ СССР, ЦГАДА, МО БССР, БГУ им. В. И. Ленина; отв. ред. Л. С. Абецедарский, М. Я. Волков. — Минск: Высшая школа, 1963. — 534 с.
10. Першодрукар Іван Фєдоров та його послідовники на Україні (XVI — перша половина XVII ст.): Збірник докумєнтів / Головнє архівнє управління при Раді Міністрів УРСР; ЦДІА УРСР у Львові; упорядники канд. іст. н. Я. Д. Ісаєвич та О. А. Купчинський; О. Я. Мацюк, Е. Й. Ружицький. — Кіев: Наукова думка, 1975. — 342, [2] с.

11. Филиграни XVII в. по старопечатным книгам Украины и Литвы: Каталог / ГИМ; сост. Т. В. Дианова. — М., 1993. — 192 с.
12. Голенченко, Г. Я. История белорусского книгопечатания XVI—XVIII вв.: Диссертация на соискание научной степени канд. ист. наук / Г. Я. Голенченко. — М., 1965. — Т. 1—3. (На правах рукапісу; захоўваецца ў хатнім архіве Г. Я. Галенчанкі).
13. Гісторыя беларускай кнігі. У 2 т. Т. 1: Нікалаеў, М. Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў; навук. рэд. В. В. Антонаў, А. І. Мальдзіс. — Мінск: БелЭН, 2009. — С. 224—230.
14. Шматаў, В. Ф. Беларуская кніжная гравюра XVI—XVIII стст. / В. Ф. Шматаў. — Мінск: Навука і тэхніка, 1984. — 181, [2] с.
15. Шматаў, В. Ф. Мастацтва беларускіх старадрукаў XVI—XVIII стст. / В. Ф. Шматаў. — Мінск: Тэхналогія, 2000. — 132 с. (У апошняй кнізе мастацтвазнавец перагледзеў некаторыя свае выказаныя раней меркаванні).
16. Киреева, Г. В. Издания Спиридона Соболя в книжных собраниях Беларуси // Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: зб. навук. арт. У 2 ч. Ч. 1 / Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў; склад. Дзем'яновіч Т. А. і інш. — Мінск, 2006. — С. 105—110.
17. Ботвинник, М. Откуда есть пошел Букварь / Марат Ботвинник. — Минск: Вышэйшая школа, 1983. — 198 с.
18. Яршоў, А. І. Куцеінскі «Буквар» Спірыдона Собаля // Адукацыя на Віцебшчыне: Гісторыя і сучаснасць. Матэрыялы рэсп. навук.-практ. канферэнцыі (Віцебск, 30—31 сакавіка 2010 г.) / Віцебскі дзярж. ун-т імя П. М. Машэрава. — Віцебск: УА «ВДУ імя П. М. Машэрава», 2010. — С. 23—26.
19. Вайнштейн, О. Л. Россия и тридцатилетняя война (1618—1648 гг.): Очерки из истории внешней политики Московского государства в пер. пол. XVII в. / проф. О. Л. Вайнштейн. — [М.-Л.]: ОГИЗ-Госполитиздат, 1947. — 216 с.
20. Laucevičius E. Popierius Lietuvoje XV — XVIII a. [T. I, II] / E. Laucevičius. — Vilnius: Mintis, 1961.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 27.04.2012*

**Я. С. Мальчэўскі,**
*галоўны спецыяліст*
*аддзела кантролю і справаводства*
*Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці,*
*аспірант гістфака БДУ,*
*магістр гістарычных навук;*
e-mail: jmalcheuski@tut.by

# ЭКСПЕРТЫЗА КАШТОЎНАСЦІ ПАТЭНТАВЫХ ДАКУМЕНТАЎ

Да цяперашняга часу пытанні экспертызы каштоўнасці патэнтавых дакументаў айчынным архівазнаўствам практычна не разглядаліся. Дастаткова вялікая ўвага беларускімі, савецкімі і расійскімі даследчыкамі надавалася і працягвае надавацца пытанням гісторыі і тэорыі экспертызы каштоўнасці дакументаў [1—7], складання пералікаў дакументаў з указаннем тэрмінаў захоўвання [8, 9], экспертызы каштоўнасці электронных дакументаў і інфармацыйных рэсурсаў [10—12], аднак публікацыі па дадзеных пытаннях не адлюстроўваюць спецыфікі экспертызы каштоўнасці патэнтавай дакументацыі. Асобна можна адзначыць кандыдацкую дысертацыю В. Д. Ярошкінай [13], у якой аўтар прапанавала арганізацыйна-метадычную схему экспертызы каштоўнасці патэнтавых дакументаў і крытэрыі іх ацэнкі. Нягледзячы на высокі тэарэтычны ўзровень і практычную значнасць дысертацыі, высновы, зробленыя В. Д. Ярошкінай, патрабуюць перагляду і дапрацоўкі з улікам развіцця заканадаўства аб прамысловай уласнасці і патэнтавай справе, дасягненняў навукі архівазнаўства.

У дачыненні да аб’ектаў прамысловай уласнасці (далей — АПУ) у айчынным заканадаўстве замацаваны рэгістрацыйны прынцып аховы. У адпаведнасці з гэтым прынцыпам выключнае права на той ці іншы патэнтаздольны вынік інтэлектуальнай дзейнасці ўзнікае толькі пры ўмове дзяржаўнай рэгістрацыі і выдачы ахоўнага дакумента, які пацвярджае правы на адпаведны АПУ. Для дзяржаўнай рэгістрацыі і атрымання ахоўнага дакумента на АПУ зацікаўленая асоба падае ў патэнтавы орган, функцыі якога ў Рэспубліцы Беларусь ажыццяўляе Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці, адпаведную заяўку (камплект устаноўленых заканадаўствам дакументаў). Па заяўцы, якая паступіла ў патэнтавы орган, праводзіцца экспертыза і прымаецца рашэнне аб выдачы ахоўнага дакумента на АПУ (рэгістрацыі АПУ) або аб адмове ў выдачы ахоўнага дакумента (рэгістрацыі АПУ). На аснове рашэння аб выдачы ахоўнага дакумента (рэгістрацыі АПУ) ажыццяўляецца рэгістрацыя аб’екта ў адпаведным дзяржаўным рэестры і выдача ахоўнага дакумента [14—18].

Агульныя крытэрыі экспертызы каштоўнасці апісаны Правіламі работы дзяржаўных архіваў Рэспублікі Беларусь [19, п. 118] і Асноўнымі правіламі работы архіваў цэнтральных і мясцовых органаў дзяржаўнай улады і кіравання, устаноў, арганізацый і прадпрыемстваў Рэспублікі Беларусь [20, п. 4.1].

Паводле палажэнняў дадзеных нарматыўных актаў ацэнка дакументаў правадзіцца ў адпаведнасці з крытэрыямі паходжання, зместу і вонкавых асаблівасцей.

Пры разглядзе магчымасці выкарыстання агульных крытэрыяў для экспертызы каштоўнасці патэнтавай дакументацыі, неабходна ўлічваць наступныя фактары: 1) ключавым суб'ектам патэнтавага справаводства выступае патэнтавы орган, які з'яўляецца адзіным афіцыйным рэцыпіентам першасных патэнтавых дакументаў (заявак на АПУ) і вытворцам другасных (дзяржаўных рэестраў, ахоўных дакументаў і афіцыйных выданняў); 2) арганізацыі-заяўнікі (уладальнікі АПУ) адносяцца ў асноўным да дзвюх катэгорый (навукова-даследчыя і адукацыйныя ўстановы, вытворчыя і гандлёвыя прадпрыемствы); 3) працэс дакументавання афармлення дзяржаўнай рэгістрацыі АПУ ў значнай ступені ўніфікаваны і жорстка рэгламентаваны.

Такім чынам, асноўнай крыніцай камплектавання Нацыянальнага архіўнага фонду Рэспублікі Беларусь патэнтавай дакументацыяй з'яўляецца патэнтавы орган, іншыя арганізацыі — крыніцы камплектавання з'яўляюцца аднастайнымі або падобнымі па сваім функцыянальна-мэтавым прызначэнні, а патэнтавыя дакументы практычна немагчыма падзяліць па вонкавых асаблівасцях. Гэта дазваляе зрабіць выснову аб абмежаванасці ўжывання крытэрыяў паходжання і вонкавых асаблівасцей пры экспертызе каштоўнасці патэнтавай дакументацыі. Асноўнымі крытэрыямі ацэнкі патэнтавых дакументаў, на наш погляд, з'яўляюцца крытэрыі зместу. Да крытэрыяў зместу адносяцца: значнасць інфармацыі, якая змяшчаецца ў дакуменце, від і разнавіднасць дакумента, паўторнасць інфармацыі дакумента ў іншых дакументах.

Для правядзення комплекснай ацэнкі патэнтавай дакументацыі таксама неабходна выкарыстанне спецыфічных крытэрыяў, якія раскрываюць змест агульных крытэрыяў. Правіламі работы з навукова-тэхнічнай дакументацыяй ва ўстановах, арганізацыях і на прадпрыемствах, зацверджаных пастановай Камітэта па архівах і справаводству пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 6 лістапада 2003 г. № 38 (далей — Правілы) і Правіламі работы з навукова-тэхнічнай дакументацыяй у дзяржаўных архівах Рэспублікі Беларусь (далей — Правілы дзяржархіваў) устаноўлены спецыфічныя крытэрыі экспертызы каштоўнасці навукова-тэхнічнай дакументацыі і яе асобных відаў. На аснове палажэнняў дадзеных нарматыўных прававых актаў можна акрэсліць наступныя крытэрыі для вызначэння практычнай і гістарычнай каштоўнасці навукова-тэхнічнай дакументацыі, састаўляючай часткай якой з'яўляецца патэнтавая дакументацыя: 1) прынцыповая навізна, унікальнасць, арыгінальнасць рашэння праблемы, канструкцыі, тэхналогіі, праекта; 2) ступень адлюстравання ўзроўню навукі і тэхнікі, вытворчасці ў адпаведны перыяд развіцця грамадства; 3) значнасць праблемы, праекта, мадэлі канструкцыі, тэхналогіі на момант укаранення для развіцця канкрэтных галін і народнай гаспадаркі ў цэлым; 4) эканамічная эфектыўнасць укаранення вынікаў даследаван-

ня або тэхнічнай ідэі; 5) сацыяльная эфектыўнасць даследавання або распрацоўкі [21, 22]. Правіламі таксама вызначана, што дзяржаўнаму захоўванню падлягае навукова-тэхнічная дакументацыя на распрацоўкі і даследаванні, якія пераўзыходзяць сусветны ўзровень, выкананы ўпершыню ў свеце, у Рэспубліцы Беларусь, у галіне [21, п. 108.4].

Экспертызе каштоўнасці патэнтавай дакументацыі ў Правілах прысвечана глава 26.

У адпаведнасці з часткай 1 п. 129 Правілаў для дзяржаўнага захоўвання адбіраюцца заяўкі на вынаходствы (адкрыцці), па якіх прыняты рашэнні аб выдачы аўтарскага пасведчання (патэнта). Неабходна канстатаваць, што дадзеная норма патрабуе перапрацоўкі. Па-першае, беларускім заканадаўствам не прадугледжваецца выдача аўтарскіх пасведчанняў на вынаходствы, а адкрыцці ўжо на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў не ахоўваюцца і не рэгіструюцца ў якасці аб’ектаў інтэлектуальнай уласнасці, таму дадзенае палажэнне распаўсюджваецца толькі на заяўкі на выдачу патэнтаў на вынаходствы. Па-другое, для рэгістрацыі АПУ і атрымання ахоўнага дакумента пасля прыняцця станоўчага рашэння па заяўцы заяўніку неабходна прадставіць патэнтаваму органу дакумент аб аплаце адпаведнай патэнтавай пошліны. Калі ён гэта не робіць, прымаецца рашэнне аб адмове ў выдачы ахоўнага дакумента (рэгістрацыі аб’екта) [23—25]. Па-трэцяе, кожная заяўка на АПУ, якая паступіла ў патэнтавы орган, фарміруецца ў справу разам з дакументамі па яе разглядзе: запытамі і адказамі на іх, паведамленнямі, рашэннямі. Улічваючы гэта, для абазначэння комплексу дакументаў (спраў), якія ўключаюць заяўкі, у Правілах мэтазгодна выкарыстоўваць назву «заяўкі на выдачу патэнтаў на вынаходствы, па якіх выдадзены патэнты, і дакументы па іх разглядзе».

Часткай 2 п. 129 Правілаў пры экспертызе каштоўнасці заявак на вынаходствы са станоўчымі рашэннямі прадугледжваецца выкарыстанне крытэрыяў эфектыўнасці выкарыстання, грамадскага прызнання рашэння і аўтара, у чым не бачыцца неабходнасці, улічваючы, адбор на пастаяннае захоўванне дадзеных дакументаў у поўным аб’ёме паводле Правілаў.

У адпаведнасці з п. 130 Правілаў для дзяржаўнага захоўвання адбіраюцца таксама заяўкі на вынаходствы (адкрыцці), па якіх прыняты рашэнні аб адмове ў выдачы аўтарскага пасведчання (патэнта), калі ў заяўках ўтрымліваюцца рацыянальныя навукова-тэхнічныя рашэнні. Што маецца на ўвазе пад рацыянальнымі навукова-тэхнічнымі рашэннямі, у Правілах не раскрываецца. Якраз у адносінах да заявак дадзенай катэгорыі і дакументаў па іх разглядзе з’яўляецца абгрунтаваным выкарыстанне вышэйзгаданых крытэрыяў эфектыўнасці выкарыстання, грамадскага прызнання рашэння і аўтара. Цікава, што савецкім Пералікам тыпавых дакументаў, якія ўтвараюцца падчас дзейнасці дзяржкамітэтаў, міністэрстваў, ведамстваў і іншых устаноў, арганізацый, прадпрыемстваў, з указаннем тэрміну захоўвання 1989 г. (далей — Пера-

лік 1989) як для заявак са станоўчымі рашэннямі, так і для заявак з адмоўнымі рашэннямі, быў прадугледжаны пастаянны тэрмін захоўвання [26. с. 141].

Не закранаюцца ў Правілах пытанні экспертызы каштоўнасці адклікаsuccessиных заявак на вынаходствы і дакументаў па іх разглядзе. Арт. 18 Закона Рэспублікі Беларусь ад 16.12.2002 «Аб патэнтах на вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры» (далей — Закон) заяўніку прадстаўляецца права адклікаць заяўку да даты рэгістрацыі вынаходства. Хоць навукова-гістарычная каштоўнасць і практычная значнасць адкліканых заявак можа быць не меншая, чым заявак са станоўчымі рашэннямі. Для іх ацэнкі мэтазгодна ўжыванне тых жа крытэрыяў, што і для заявак на вынаходствы, па якіх прыняты рашэнні аб адмове ў выдачы патэнта.

На думку В. Д. Ярошкінай, каштоўнасць зместу заявачных дакументаў на вынаходства вызначаецца такімі крытэрыямі як значнасць дадзенага тэхнічнага рашэння задачы на дадзены адрэзак часу, прыярытэт вынаходства, навізна (сусветная), карыснасць, прамысловая дастасавальнасць, арыгінальнасць, значны эканамічны або іншы эфект [13, с. 18]. Аўтарам падкрэсліваецца, што гэтыя крытэрыі з’яўляюцца асноўнымі і для правядзення дзяржаўнай навукова-тэхнічнай патэнтавай экспертызы [13, с. 18].

Неабходна адзначыць, што рэалізацыя рэгістрацыйнага прынцыпу аховы шмат у чым абапіраецца на паняцце прыярытэту АПУ. Прыярытэт АПУ — гэта першынство ў часе, устаноўленае паводле заканадаўства. Паводле беларускага заканадаўства прыярытэт можа ўсталёўвацца па даце падачы заяўкі або па даце больш ранняй, чым дата падачы заяўкі [14—17]. Прыярытэт з’яўляецца не крытэрыем экспертызы, а сродкам вызначэння адпаведнасці меркаванага АПУ ўмовам ахоўваздольнасці.

Паводле арт. 2 Закона вынаходства можна вызначыць як рашэнне ў любой галіне тэхнікі, якое адносіцца да прадукта або спосабу. Умовамі патэнтаздольнасці вынаходства з’яўляюцца навізна, вынаходніцкі ўзровень і прамысловая дастасавальнасць [14, арт. 2]. У Законе раскрываецца змест гэтых умоў. Вынаходства з’яўляецца новым, калі яно не з’яўляецца часткай узроўню тэхнікі. Вынаходніцкі ўзровень пазначае тое, што вынаходства для адмыслоўца відавочным чынам не вынікае з узроўню тэхнікі. Пры гэтым узровень тэхнікі ўключае любыя звесткі, якія сталі агульнадаступнымі ў свеце да даты прыярытэту вынаходства. Вынаходства з’яўляецца прамыслова дастасавальным, калі яно можа быць выкарыстана ў прамысловасці, сельскай гаспадарцы, ахове здароўя і іншых сферах дзейнасці.

У Рэспубліцы Беларусь нарматыўна замацавана так званая праверачная сістэма аховы вынаходстваў, якая прадугледжвае праверку заяўленага вынаходства ўмовам патэнтаздольнасці. Паводле арт. 18 Закона экспертыза заявак на вынаходствы ўключае два этапы: папярэдняя экспертыза і патэнтавая экспертыза. Парадак правядзення экспертызы дэталёва рэгламентаваны Палажэннем аб парадку складання заяўкі на выдачу патэнта на вынаходства, пра-

вядзення па ёй экспертызы і вынясення рашэння па выніках экспертызы. У адпаведнасці з п. 276 Палажэння пры правядзенні папярэдняй экспертызы правяраюцца наяўнасць дакументаў, якія змяшчаюцца ў заяўцы, і выкананне ўстаноўленых патрабаванняў да іх, ці адносіцца заяўленае рашэнне да аб'ектаў, якія могуць быць прызнаны вынаходствамі, правільнасць выплаты ўстаноўленых патэнтавых пошлін, правільнасць класіфікацыі вынаходстваў па Міжнароднай патэнтавай класіфікацыі. Звесткі аб заяўцы на вынаходства, якая прайшла папярэднюю экспертызу са станоўчым вынікам, публікуюцца ў афіцыйным бюлетэні патэнтавага органа [23, п. 314]. Патэнтавая экспертыза заяўкі на вынаходства ўключае ўстанаўленне прыярытэту вынаходства, правядзенне інфармацыйнага пошуку ў дачыненні да вынаходства, ахарактарызаванага ў формуле, для вызначэння ўзроўню тэхнікі і праверку адпаведнасці крытэрыям патэнтаздольнасці заяўленага вынаходства [23, п. 330]. Такім чынам, падчас патэнтавай экспертызы ажыццяўляецца праверка навізны, вынаходніцкага ўзроўню і прамысловай дастасавальнасці, тэхнічнага рашэння, раскрытага ў дакументах заяўкі на вынаходства. Калі заяўленае рашэнне адпавядае ўмовам патэнтаздольнасці, прымаецца рашэнне аб выдачы патэнта.

Інфармацыйная каштоўнасць заявак на вынаходствы, па якіх выдадзены патэнты, таксама выяўляецца ў эканоміка-сацыяльным і тэхнічным значэнні адпаведных вынаходстваў. Навукоўцамі адзначаецца, што вынаходствы з'яўляюцца прыкладам сістэматызаваных ведаў, накіраваных на рашэнне вызначанай тэхнічнай праблемы [27, с. 15], рухаючай сілай эканамічнага і тэхналагічнага развіцця прадпрыемстваў [28, с. 401].

Пры ацэнцы заявак, па якіх былі прыняты рашэнні аб адмове і адклікаidных заявак, трэба ўлічваць: 1) адмоўныя рашэнні па заяўках маглі прымацца пасля прыняцця станоўчых, калі не былі прадстаўлены дакументы аб аплаце патэнтавых пошлін (на нашу думку, дадзеныя заяўкі падлягаюць пастаяннаму захоўванню, таму што яны паспяхова прайшлі патэнтавую экспертызу і адпавядаюць спецыфічным крытэрыям адбору навукова-тэхнічных дакументаў); 2) інфармацыйны пошук для вызначэння ўзроўню тэхнікі падчас патэнтавай экспертызы праводзіцца па ўсіх заяўках, звесткі аб якіх былі апублікаваны.

Заяўкі на вынаходствы з'яўляюцца важнымі крыніцамі інфармацыі па гісторыі і практыцы патэнтавай экспертызы як неад'емнага кампанета вынаходніцкай справы ў Беларусі.

Нічога не згадваецца ў Правілах пра экспертызу каштоўнасці заявак на карысныя мадэлі і дакументы па іх разглядзе.

Карысная мадэль — АПУ, па сутнасці, блізкі да вынаходства. У якасці карыснай мадэлі ахоўваецца тэхнічнае рашэнне, якое адносіцца да прылады і адпавядае ўмовам навізны і прамысловай дастасавальнасці [14, арт. 3]. Заканадаўствам прадугледжана явачная сістэма выдачы патэнтаў на карысныя мадэлі. Падчас правядзення экспертызы заяўкі на карысную мадэль правяраюцца наяўнасць неабходных дакументаў, выкананне ўстаноўленых патрабаванняў

да іх і разглядаецца пытанне аб тым, ці адносіцца заяўленая прапанова да аб'ектаў карыснай мадэлі [14, арт. 3]. Паводле Закона пры экспертызе заяўкі на карысную мадэль праверка адпаведнасці заяўленай карыснай мадэлі ўмовам патэнтаздольнасці не ажыццяўляецца.

У адпаведнасці з п. 131 Правілаў на дзяржаўнае захоўванне адбіраюцца скончаныя разглядам заяўкі на прамысловыя ўзоры, па якіх прыняты рашэнні аб выдачы пасведчання або патэнта. Як і п. 129, дадзенае палажэнне патрабуе перапрацоўкі: выключэння слова «пасведчання» (выдача пасведчанняў на прамысловыя ўзоры беларускім заканадаўствам не прадугледжана), замену назвы комплексу дакументаў «заяўкі на прамысловыя ўзоры, па якіх прыняты рашэнні аб выдачы патэнта» на назву «заяўкі на выдачу патэнтаў на прамысловыя ўзоры, па якіх выдадзены патэнты, і дакументы па іх разглядзе».

Правіламі ўстаноўлены крытэрыі экспертызы каштоўнасці заявак на прамысловыя ўзоры, па якіх прыняты адмоўныя рашэнні: 1) наяўнасць сярод аўтараў прамысловых узораў выдатных дзеячаў навукі і тэхнікі; 2) падача заявак вядучымі арганізацыямі ў галіне мастацкага канструявання; 3) наяўнасць у заяўках мастацка-канструктарскіх рашэнняў, высунутых на прысуджэнне дзяржаўных або імянных прэмій; 4) наяўнасць у заяўках арыгінальных мастацка-канструктарскіх рашэнняў, узнагароджаных дыпломамі, медалямі і прэміямі на выставах. Нічога не згадваецца пра экспертызу каштоўнасці адкліканых заявак на прамысловыя ўзоры, наяўнасць якіх прадугледжана заканадаўствам [14, арт. 24].

Прамысловы ўзор з'яўляецца не тэхнічным, а мастацкім або мастацка-канструктарскім рашэннем вырабу, які вызначае яго вонкавы выгляд [14, арт. 4]. Таму ўжыванне ў якасці крытэрыю экспертызы каштоўнасці заявак на прамысловыя ўзоры наяўнасці сярод аўтараў прамысловых узораў выдатных дзеячаў навукі і тэхнікі не абгрунтавана. Для ўліку крытэрыю аўтарскага прызнання можа выкарыстоўвацца наяўнасць сярод аўтараў прамысловых узораў выдатных дзеячаў мастацкага праектавання (дызайнераў).

Умовамі патэнтаздольнасці прамысловага ўзору з'яўляюцца навізна і арыгінальнасць. Прамысловы ўзор прызнаецца новым, калі ён невядомы са звестак, якія сталі агульнадаступнымі ў свеце да даты прыярытэту прамысловага ўзору; арыгінальным — калі асаблівасці вонкавага выгляду вырабу абумоўлены творчай працай яго аўтара (аўтараў) [14, арт. 4]. Як і ў адносінах да карыснай мадэлі, Законам прадугледжваецца толькі фармальная экспертыза заяўкі на прамысловы ўзор без праверкі адпаведнасці заяўленага прамысловага ўзору ўмовам патэнтаздольнасці.

Так як заяўкі на карысныя мадэлі і прамысловыя ўзоры змяшчаюць тэхнічныя і мастацка-канструктарскія рашэнні, яны ў значнай ступені адлюстроўваюць тэндэнцыі развіцця вынаходніцкай і дызайнерскай дзейнасці. Дадзеныя аб'екты валодаюць значным падабенствам з вынаходствамі, маюць пэўных стваральнікаў, і іх ахова ажыццяўляецца ў форме адзінага дакумен-

та — патэнта [29, с. 41]. З улікам гэтага, нягледзячы на тое, што праверка патэнтаздольнасці ў адносінах да карысных мадэляў і прамысловых узораў не праводзіцца, уяўляецца мэтазгодным: 1) пастаяннае захоўванне заявак на карысныя мадэлі і прамысловыя ўзоры, па якіх выдадзены патэнты, і дакументаў па іх разглядзе; 2) правядзенне экспертызы каштоўнасці заявак з адмоўнымі рашэннямі і адкліканых заявак, і дакументаў па іх разглядзе на аснове крытэрыяў, прапанаваных намі для экспертызы адпаведных заявак на вынаходствы.

Таксама ў Правілах не закранаюцца пытанні экспертызы каштоўнасці заявак на гатункі раслін, тапалогіі інтэгральных мікрасхем, таварныя знакі і знакі абслугоўвання, найменні месцаў паходжання тавараў і дакументаў па іх разглядзе.

Арт. 2 Закона «Аб патэнтах на гатункі раслін» ад 13.04.1995 устаноўлена, што гатунку расліны прадстаўляецца прававая ахова, калі ён валодае навізной, адрозненнем, аднастайнасцю і стабільнасцю. Экспертыза заяўкі на выдачу патэнта на гатунак расліны ўключае праверку патэнтаздольнасці гатунку [15, арт. 18].

Тапалогія інтэгральнай мікрасхемы — зафіксаванае на матэрыяльным носьбіце прасторава-геаметрычнае размяшчэнне сукупнасці элементаў інтэгральнай мікрасхемы і сувязяў паміж імі [16, арт. 1]. Заканадаўствам устаноўлены крытэрый ахоўздольнасці дадзенага аб’екта — арыгінальнасць [16, арт. 2]. Праверка ахоўздольнасці тапалогіі інтэгральнай мікрасхемы не праводзіцца [16, арт. 12].

Пры вызначэнні тэрміну захоўвання заявак на гатункі раслін і тапалогіі інтэгральных мікрасхем неабходна ўлічваць адносна невялікую колькасць пададзеных заявак на дадзеныя аб’екты [30] і спецыфіку іх інфармацыі. Разам з гэтым вялікае значэнне гатункаў раслін у развіцці сельскай гаспадаркі, а тапалогій інтэгральных мікрасхем — у развіцці мікраэлектронікі, прадвызначае пастаянны тэрмін захоўвання адпаведных заявак, па якіх выдадзены ахоўныя дакументы, і дакументаў па іх разглядзе.

У адрозненні ад вынаходстваў, карысных мадэляў, прамысловых ўзораў, гатункаў раслін, тапалогій інтэгральных мікрасхем таварныя знакі і знакі абслугоўвання, найменні месцаў паходжання тавараў такімі вынікамі інтэлектуальнай дзейнасці не з’яўляюцца, а адносяцца да сродкаў індывідуалізацыі тавараў і паслуг.

У арт. 1 Закона «Аб таварных знаках і знаках абслугоўвання» ад 05.02.1993 таварны знак або знак абслугоўвання (далей — таварны знак) вызначаецца як пазначэнне, якое спрыяе адрозненню тавараў або паслуг адной асобы ад аднастайных тавараў або паслуг іншых асоб. Такім чынам, асноўная функцыя таварнага знака — індывідуалізацыя тавараў і паслуг, а таксама іх вытворцаў на рынку, дзякуючы чаму спажывец атрымлівае магчымасць абраць сярод мноства аднастайных тавараў і паслуг тавары і паслугі

вызначаных вытворцаў з загадзя вядомымі яму ўласцівасцямі і якасцю. У якасці таварных знакаў рэгіструюцца пазначэнні, якія могуць быць прадстаўлены ў графічнай форме: славесныя, літарныя, лічбавыя, выяўленчыя, трохмерныя, уключаючы форму тавара або яго ўпакоўку, іншыя пазначэнні і іх камбінацыі [17, арт. 1].

Зарэгістраваныя таварныя знакі адыгрываюць важную ролю ў гандлі таварамі і паслугамі. Таварны знак дазваляе звярнуць увагу патэнцыяльных пакупнікоў на існаванне тавара або паслугі, адрозніваць іх ад аналагічных тавараў або паслуг, спрыяючы гэтым фарміраванню вызначанага іміджу і рэпутацыі ўладальніка таварнага знака на рынку. Таварныя знакі актыўна выкарыстоўваюцца ва ўсіх сферах эканомікі, і іх колькасць перавышае колькасць усіх астатніх АПУ разам узятых [30]. Па меркаванні В. І. Кудашова, рэгістрацыя таварных знакаў з’яўляецца карыснай крыніцай статыстычнай і эканамічнай інфармацыі для органаў дзяржаўнага кіравання [27, с. 88]. На наш погляд, заяўкі на таварныя знакі, па якіх выдадзены пасведчанні, і дакументы па іх разглядзе з’яўляюцца найважнейшымі крыніцамі інфармацыі як аб асобных арганізацыях гандлёва-прамысловага комплексу, так і аб развіцці рынку тавараў і паслуг у цэлым, і падлягаюць пастаяннаму захоўванню. У той жа час заяўкі, па якіх прыняты рашэнні аб адмове ў рэгістрацыі, адкліканыя заяўкі і дакументы па іх разглядзе не ўтрымліваюць тэхнічных, мастацка-канструктарскіх або генетычных рашэнняў, і не маюць сапраўднай або патэнцыяльнай навукова-гістарычнай каштоўнасці. Пасля страты практычнага значэння дадзеныя заяўкі падлягаюць знішчэнню.

Яшчэ адзін сродак індывідуалізацыі тавараў — найменне месца паходжання тавара — уяўляе сабой назву краіны, населенага пункта, мясцовасці або іншага геаграфічнага аб’екта і выкарыстоўваецца для пазначэння тавара, адмысловыя ўласцівасці якога выключна або галоўным чынам вызначаюцца характэрнымі для гэтага геаграфічнага аб’екта прыроднымі ўмовамі або іншымі фактарамі, або спалучэннем прыродных умоў і гэтых фактараў [18, арт. 1]. Улічваючы крайнюю нешматлікасць дадзеных аб’ектаў [30] і значэнне іх аховы для захавання традыцыйных вытворчасцей і здабычы, уяўляецца мэтазгодным пастаяннае захоўванне заявак на найменні месцаў паходжання тавараў, па якіх выдадзены пасведчанні, і дакументаў па іх разглядзе. Па аналогіі з таварнымі знакамі заяўкі на найменні, па якіх прыняты рашэнні аб адмове ў рэгістрацыі, адкліканыя заяўкі і дакументы па іх разглядзе не маюць сапраўднай або патэнцыяльнай навукова-гістарычнай каштоўнасці.

Дзяржаўныя рэестры АПУ з’яўляюцца рэспубліканскімі дзяржаўнымі інфармацыйнымі рэсурсамі і зарэгістраваны ў Дзяржаўным рэгістры інфармацыйных рэсурсаў Рэспублікі Беларусь. Пералікам 1989 г. быў устаноўлены пастаянны тэрмін захоўвання дзяржаўных рэестраў АПУ [26, с. 143]. Улічваючы тое, што дзяржаўныя рэестры з’яўляюцца сродкамі адзінага дзяржаўнага ўліку АПУ, фіксацыі і захоўвання інфармацыі аб усіх юрыдычна значных дзе-

яннях з імі, з'яўляецца цалкам абгрунтаваным пастаяннае захоўванне дзяржаўных рэестраў.

Вядзенне дзяржаўных рэестраў АПУ ажыццяўляецца ў папяровай і электроннай формах. Пры несупадзенні даных у папяровай і электроннай форме прыярытэт мае дакументаваная інфармацыя папяровай формы [31, с. 6]. Нягледзячы на дадзенае палажэнне, электронныя формы рэестраў дэ-факта з'яўляюцца першаснымі інфармацыйнымі рэсурсамі, таму што выступаюць крыніцай для аўтаматызаванага стварэння лістоў папяровых рэестраў. В. Л. Насевіч лічыць, што за кошт канцэнтрацыі ў адным рэсурсе і перакладу ў электронны выгляд дакументаваная інфармацыя набывае новую якасць, а яе каштоўнасць нашмат перавышае каштоўнасць разрозненай масы першасных дакументаў [10, с. 36].

Паводле п. 23.1 Пераліку тыпавых дакументаў 2007 г. электронныя інфармацыйныя рэсурсы, у тым ліку рэестры, якія ўключаны ў пералік дзяржаўных інфармацыйных рэсурсаў, падлягаюць пастаяннаму захоўванню [32]. Інструкцыяй па правядзенні экспертызы каштоўнасці і перадачы на дзяржаўнае захоўванне дакументаў у электронным выглядзе і інфармацыйных рэсурсаў для экспертызы каштоўнасці інфармацыйных рэсурсаў устаноўлены спецыфічныя крытэрыі ацэнкі: паўната камплектавання (суадносіны інфармацыі, наяўнай у складзе дадзенага інфармацыйнага рэсурсу, з агульным аб'ёмам інфармацыі, наяўнай у рэспубліцы па дадзеным класе прадметаў або з'яў); пэўнасць інфармацыі; унікальнасць, вызначаная сістэмай збору інфармацыі; сацыяльная значнасць [33]. Паводле дадзеных крытэрыяў і з улікам патрабаванняў Пераліку тыпавых дакументаў 2007 г. электронныя формы рэестраў павінны захоўвацца пастаянна разам з папяровымі аналагамі.

П. 132 Правілаў устаноўлена, што на дзяржаўнае захоўванне адбіраюцца ануляваныя пасведчанні (патэнты), дакументы на вынаходствы, па якіх выдадзены ліцэнзіі (ліцэнзійныя пашпарты, рэкламна-тэхнічныя апісанні аб тэхнічнай гатоўнасці, тэхнічна-эканамічныя разлікі).

Патэнты на вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, сарты раслін разам з апісаннямі, пасведчанні на тапалогіі інтэгральных мікрасхем, таварныя знакі і знакі абслугоўвання, найменні месцаў паходжання тавараў (ахоўныя дакументы) выдаюцца патэнтавым органам і захоўваюцца ўладальнікамі адпаведных АПУ. Дзейсныя пералікі тыпавых дакументаў з указаннем тэрмінаў захоўвання не вызначаюць тэрмінаў захоўвання ахоўных дакументаў. Паводле Пераліку 1989 г., які на сённяшні дзень не з'яўляецца абавязковым для выканання і мае рэкамендацыйны характар, патэнты і сведчанні на АПУ, з'яўляюцца дакументамі пастаяннага тэрміну захоўвання [26, с. 141].

Беларускім навукова-даследчым інстытутам дакументазнаўства і архіўнай справы сумесна з зацікаўленымі асобамі вядуцца работы па распрацоўцы Пераліку тыпавых дакументаў, якія ўтвараюцца ў навукова-тэхнічнай дзейнасці, з указаннем тэрмінаў захоўвання [34, с. 74]. Аднак, пакуль Пералік не

ўступіў у сілу, тэрмін захоўвання патэнтавых дакументаў вызначаецца экспертнай камісіяй арганізацыі. На падставе палажэнняў Пераліку 1989 г., і ўлічваючы навукова-гістарычную каштоўнасць ахоўных дакументаў, з'яўляецца мэтазгодным іх пастаяннае захоўванне.

На пастаяннае захоўванне ў дзяржаўны архіў ахоўныя дакументы павінны перадавацца ва ўстаноўленым камплекце і ўпарадкаваным стане з адпаведным навукова-даведачным апаратам арганізацыямі-ўладальнікамі адпаведных АПУ, якія з'яўляюцца крыніцамі камплектавання Нацыянальнага архіўнага фонду, пасля заканчэння іх дзеяння і ў межах устаноўленага заканадаўствам тэрміну ведамаснага захоўвання дакументаў.

Ліцэнзійныя дамовы, дамовы ўступкі, ліцэнзійныя пашпарты, рэкламна-тэхнічныя апісанні аб тэхнічнай гатоўнасці, тэхніча-эканамічныя разлікі не з'яўляюцца патэнтавымі дакументамі.

Састаўляючай часткай сістэмы патэнтавай дакументацыі з'яўляюцца афіцыйныя выданні патэнтавага органа. Да афіцыйных выданняў патэнтавага органа адносяцца: 1) афіцыйны бюлетэнь патэнтавага органа; 2) апісанні вынаходстваў, карысных мадэляў і сартоў раслін да патэнтаў; 3) бібліяграфічны паказальнік дзейсных у Беларусі патэнтаў на вынаходствы, карысныя мадэлі і прамысловыя ўзоры [35, п. 7].

Публікацыя патэнтавай інфармацыі ў форме афіцыйных выданняў суправаджае ўсе асноўныя этапы прававой аховы інтэлектуальнай уласнасці, і менавіта па гэтай прычыне афіцыйныя выданні патэнтавага органа з'яўляюцца важнымі крыніцамі інфармацыі аб зарэгістраваных у Беларусі АПУ. Разам з тым афіцыйныя выданні выпускаюцца значным тыражом, іх электронныя версіі выкладваюцца на афіцыйны сайт патэнтавага органа. Улічваючы дадзеныя акалічнасці, уяўляецца абгрунтаваным адбор на пастаяннае захоўванне толькі арыгінал-макетаў афіцыйных выданняў патэнтавага органа.

Разглядаючы асаблівасці правядзення экспертызы каштоўнасці розных відаў патэнтавых дакументаў, можна зрабіць наступныя высновы:

1. Падчас патэнтавай экспертызы фактычна ажыццяўляецца праверка адпаведнасці заявак на вынаходствы ўстаноўленым Правіламі спецыфічным крытэрыям ацэнкі навукова-тэхнічнай дакументацыі: прынцыповая навізна, унікальнасць рашэння праблемы, канструкцыі, тэхналогіі, ступень адлюстравання ўзроўню навукі і тэхнікі, вытворчасці ў адпаведны перыяд развіцця грамадства. Патэнтавая экспертыза з'яўляецца найважнейшым этапам экспертызы каштоўнасці заявак на вынаходствы, на аснове вынікаў якога пацвярджаецца або не пацвярджаецца навукова-гістарычная каштоўнасць і практычная значнасць і ажыццяўляецца асноўны адбор заявак пастаяннага захоўвання.

2. Заяўкі на АПУ, па якіх выдадзены ахоўныя дакументы, і дакументы па іх разглядзе, дзяржаўныя рэестры АПУ, ахоўныя дакументы і арыгінал-макеты афіцыйных выданняў патэнтавага органа маюць сапраўдную навукова-гістарычную каштоўнасць і падлягаюць пастаяннаму захоўванню.

3. Заяўкі на АПУ — вынікі інтэлектуальнай дзейнасці (вынаходствы, карысныя мадэлі, прамысловыя ўзоры, гатункі раслін, тапалогіі інтэгральных мікрасхем), па якіх прыняты адмоўныя рашэнні, адкліканыя заяўкі на дадзеныя аб'екты і дакументы па іх разглядзе маюць патэнцыяльную навукова-гістарычную каштоўнасць і падлягаюць экспертызе каштоўнасці ў патэнтавым органе. Таму для дакументаў дадзеных катэгорый з'яўляецца абгрунтаваным замацаванне адпаведных тэрмінаў захоўвання з адзнакамі ЭПК. Пры экспертызе каштоўнасці дакументаў дадзеных катэгорый мэтазгодна выкарыстоўваць спецыфічныя крытэрыі ацэнкі навукова-тэхнічнай дакументацыі і крытэрыі грамадскага прызнання рашэння і аўтара.

Рашэнне задачы па пабудове эфектыўнай сістэмы экспертызы каштоўнасці патэнтавых дакументаў павінна насіць комплексны характар. Па-першае, неабходна нарматыўна замацаваць тэрміны захоўвання патэнтавых дакументаў у адпаведным Пераліку тыпавых дакументаў. Па-другое, варта ўнесці адпаведныя змены і дапаўненні ў Правілы, прывесці іх у адпаведнасць з дзейсным нацыянальным заканадаўствам аб прамысловай уласнасці і вызначыць выразныя крытэрыі экспертызы каштоўнасці для ўсіх катэгорый патэнтавай дакументацыі.

Літаратура і крыніцы


1. Бурова, Е. М. История и современные тенденции развития экспертизы ценности документов / Е. М. Бурова. — М., 1985.
2. Автократов, В. Н. Теоретические проблемы отечественного архивоведения / В. Н. Автократов. — М.: РГГУ, 2001.
3. Алексеева, Е. В. Научные основы оценки и отбора документов / Е. В. Алексеева, Л. П. Афанасьева, Е. М. Бурова, Г. А. Осичкина // Делопроизводство. — 2003. — № 1. — С. 98—102.
4. Rybakou, Appraisal in the Republic of Belarus: Theory, Technique, Normative Regulation / A. Rybakou // Atlanti: Review for modern archival theory and practice. — Trieste, 2008. — Vol. 18. — P. 257—264.
5. Федосов, В. В. О взаимосвязях общей теории архивоведения и теории экспертизы ценности документов / В. В. Федосов // Беларускі археаграфічны штогоднік / Рэдкал.: Э. М. Савіцкі (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БелНДІДАС, 2011. — Вып. 12. — С. 62—69.
6. Белявский, А. М. О некоторых проблемах экспертизы ценности документов в контексте антропологического подхода / А. М. Белявский // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. / рэдкал.: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2011. — Вып. 6. — С. 159—167.
7. Белявский, А. М. Верификация теории экспертизы ценности документов / А. М. Белявский // Крыніцазнаўства і спецыяльныя гістарычныя дысцыпліны: навук. зб. / рэдкал: С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2012. — Вып. 7. — С. 170—180.

8. Жумарь, С. В. Проблемы и перспективы разработки перечней документов учреждений, организаций, предприятий Республики Беларусь с указанием сроков хранения / С. В. Жумарь // Архівы і справаводства. — 2000. — № 2. — С. 96—100.
9. Давыдова, Э. Н. О перспективах разработки перечней документов с указанием сроков хранения / Э. Н. Давыдова, А. Я. Рыбаков, П. А. Левчик // Архівы і справаводства. — 2000. — № 3. — С. 36—44.
10. Носевич, В. Л. Информационные ресурсы организаций как часть Национального архивного фонда / В. Л. Носевич // Архівы і справаводства. — 2008. — № 1. — С. 36—42.
11. Жук, О. Ю. Организация и порядок проведения экспертизы ценности электронных документов / О. Ю. Жук // Архівы і справаводства. — 2007. — № 6. — С. 37—40.
12. Тихонов, В. И. Применение традиционных методов в экспертизе ценности электронных документов / В. И. Тихонов // Отечественные архивы. — 2009. — № 3. — С. 37—46.
13. Ерошкина, О. Д. Патентная документация в СССР и экспертиза ценности: автореферат диссертации на соискание ученой степени кандидата исторических наук: 05.25.02 / О. Д. Ерошкина: ВНИИДАД. — М., 1988. — 22 с.
14. Закон Республики Беларусь «О патентах на изобретения, полезные модели, промышленные образцы» от 16.12.2002 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
15. Закон Республики Беларусь «О патентах на сорта растений» от 13.04.1995 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
16. Закон Республики Беларусь «О правовой охране топологий интегральных микросхем» от 07.12.1998 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
17. Закон Республики Беларусь «О товарных знаках и знаках обслуживания» от 05.02.1993 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
18. Закон Республики Беларусь «О географических указаниях» от 17.07.2002 // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
19. Правила работы государственных архивов Республики Беларусь (утверждены постановлением Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь от 25.11.2005 № 7) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
20. Основные правила работы архивов центральных и местных органов государственной власти и управления, учреждений, организаций и предприятий Республики Беларусь (утверждены решением коллегии Государственного комитета по архивам и делопроизводству Республики Беларусь 30.04.1997 № 5) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.

21. Правила работы с научно-технической документацией в учреждениях, организациях и на предприятиях (утверждены постановлением Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь от 06.11.2003 № 38) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
22. Правила работы с научно-технической документацией в государственных архивах Республики Беларусь (утверждены постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 14.03.2007 № 14) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
23. Положение о порядке составления заявки на выдачу патента на изобретение, проведения по ней экспертизы и вынесения решения по результатам экспертизы (утверждено постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 02.02.2011 № 119) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
24. Положение о порядке составления заявки на выдачу патента на полезную модель, проведения по ней экспертизы и вынесения решения по результатам экспертизы (утверждено постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 02.02.2011 № 120) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
25. Положение о порядке составления заявки на выдачу патента на промышленный образец, проведения по ней экспертизы и вынесения решения по результатам экспертизы (утверждено постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 02.02.2011 № 121) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
26. Перечень типовых документов, образующихся в деятельности госкомитетов, министерств, ведомств и других учреждений, организаций, предприятий, с указанием сроков хранения. — М.: ВНИИДАД, 1989. — 270 с.
27. Кудашов, В. И. Управление интеллектуальной собственностью, / В. И. Кудашов.— Минск: ИВЦ Минфина, 2007. — 360 с.
28. Судариков, С. А. Интеллектуальная собственность / С. А. Судариков. — М.: Издательство деловой и учебной литературы, 2007. — 800 с.
29. Мухопад, В. И. Интеллектуальная собственность в мировой экономике знаний / В. И. Мухопад. — М.: НИИ школьных технологий, 2009. — 256 с.
30. Национальный центр интеллектуальной собственности: Годовой отчет 2011 [Электронный ресурс]. — 2012. — Режим доступа: http://belgospatent.org.by/files/Report_2011.pdf — Дата доступа: 14.04.2012.
31. Временное положение о государственных реестрах объектов права промышленной собственности, лицензионных договоров, договоров уступки и договоров залога прав на объекты интеллектуальной собственности, договоров комплексной предпринимательской лицензии (франчайзинга) Республики Беларусь (утверждено приказом генерального директора Национального центра интеллектуальной собственности от 09.08.2011 № 67-а). Национальный центр интеллектуальной собственности. — Ном. дел 01-50. Дело 01-05.

32. Перечень типовых документов органов государственной власти и управления, организаций Республики Беларусь по оперативному и статистическому учету и отчетности, электронным информационным ресурсам, трудовым отношениям, социальной защите, работе с кадрами, образованию, таможенному контролю, материально-техническому обеспечению, административно-хозяйственной деятельности, делопроизводству, работе архивов организаций с указанием сроков хранения (утвержден постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 14.12.2006 № 82) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
33. Инструкция по проведению экспертизы ценности и передаче на государственное хранение документов в электронном виде и информационных ресурсов (утверждена постановлением Министерства юстиции Республики Беларусь от 30.06.2010 № 37) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронны рэсурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
34. Мальчевский, Е. С. Регистрация объектов промышленной собственности. Документационный аспект / Е. С. Мальчевский // Архівы і справаводства. — 2011. — № 1. — С. 68—75.
35. Положение об официальных изданиях Национального центра интеллектуальной собственности (утверждено Постановлением Государственного комитета по науке и технологиям Республики Беларусь от 26.09.2005 г. № 12) // Консультант плюс: Беларусь. Технология 3000 [Электронный ресурс] / ООО «ЮрСпектр», Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. — Минск, 2012.
*Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.05.2012*

**В. С. Іванова,**
*старшы выкладчык кафедры крыніцазнаўства*
*гістарычнага факультэта*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта;*
*тэл. +375 29 74 85 311;*
e-mail: ivanova_olga_s@mail.ru

# ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ АРХІЎНАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ Ў БЕЛАРУСІ

Праблема развіцця архіўнай тэрміналогіі з'яўляецца сёння адной з самых актуальных, што абмяркоўваецца на шматлікіх канферэнцыях і падчас камунікацыі даследчыкаў. Звязана гэта з фарміраваннем і развіццём нацыянальных школ архівазнаўства ў былых савецкіх рэспубліках, пачынаючы з 1990-х гг. Тэрміналогія складае своеасаблівы каркас навуковай дысцыпліны, падвяргаючыся пастаянным зменам. У гэтай сувязі ад тэарэтыкаў архівазнаўства патрабуецца перманентная рэфлексія наяўных трансфармацый. Працэс стварэння тэрмінасістэмы любой галіны ведаў умоўна можна падзяліць на некалькі этапаў. Першы этап звязаны з натуральным фарміраваннем тэрміналагічнай сістэмы асобнай галіны на аснове эмпірычнага досведу. На другім этапе (этап фіксацыі) узнікае неабходнасць растлумачыць створаныя тэрміны, зрабіць абагульненні шляхам стварэння невялікіх тэрміналагічных слоўнікаў у выглядзе дадаткаў да манаграфій, падручнікаў і іншых прац. Далей ідзе асноўны этап нармалізацыі тэрміналогіі, які праходзіць, як правіла, праз складанне грунтоўных тэрміналагічных слоўнікаў. Нарматыўнае ўжыванне тэрміна цвёрда фіксуецца пры стандартызацыі (кадыфікацыі), калі ажыццяўляецца выбар толькі аднаго тэрміна для кожнага паняцця і замацаванне яго ў спецыяльных дакументах.

Пачатак фарміравання беларускай архіўнай тэрміналогіі можна аднесці да XVI ст., калі ў Статуце 1588 г. (раздзел 4, арт. 14) для пазначэння месца захоўвання судовых актавых кніг выкарыстоўвалася паняцце «схованье книгъ судовых». Потым быў прыняты цэлы шэраг соймавых пастаноў аб забеспячэнні захаванасці і рэвізіі архіваў. Вынікі эвалюцыі тэрміналогіі былі ў пэўным сэнсе зафіксаваны ў пачатку XIX ст. у прадмове да археаграфічнай працы І. Грыгаровіча «Беларускі архіў старажытных грамат» (1824), дзе ўжываецца паняцце «архіў» як у значэнні зборніка дакументаў, неабходных для даследавання гісторыі Беларусі, так і ў значэнні месца, дзе захоўваюцца арыгіналы гэтых дакументаў. У 1872 г. архіварыус Віленскага архіва М. І. Гарбачэўскі ў адной са сваіх прац прысвяціў невялікі раздзел этымалогіі паняцця «архіў». Пад архівам разумелася сховішча афіцыйных папер, давалася таксама азначэнне паняцця «актавыя кнігі» і іх класіфікацыя [1, с. 1]. Яшчэ адна праца Гарбачэўскага, прысвечаная тлумачэнню нумізматычных, сфрагістычных, палеаграфічных, генеалагічных тэрмінаў, якія сустракаліся ў архіўных дакументах, стала выдатным дапаможнікам для гісторыкаў, аднак не ставіла задачу тлумачэння архівазнаўчых тэрмінаў [2].

Актыўнае развіццё непасрэдна беларускай тэрміналагічнай лексікі пачалося ў канцы XIX — пачатку XX ст., што звязана з масавым выданнем твораў літаратуры, падручнікаў, газет, часопісаў. Найбольшая тэрміналагічная актыўнасць назіралася ў 1920-я гг., у перыяд дзейнасці Тэрміналагічнай камісіі пры Інстытуце беларускай культуры, якая з 1922 па 1930 г. падрыхтавала 24 нарматыўныя двухмоўныя слоўнікі навуковай тэрміналогіі розных галін ведаў, якія задаволілі запатрабаванні адукацыйнай сістэмы ў беларускіх тэрмінах. Сярод слоўнікаў, якія ўпершыню нармавалі беларускамоўныя архівазнаўчыя тэрміны, можна адзначыць слоўнік па тэрміналогіі права і слоўнік бухгалтарскай тэрміналогіі [3]. Акрамя гэтага, у 1926 г. у складзе адпаведнага дапаможніка выйшаў у свет слоўнік справаводнай тэрміналогіі, дзе прысуднічала паняцце «архіў» [4, с. 92].

Т. Д. Либеровская принимала активное участие в различных научно-практических республиканских и областных архивных конференциях с докладами и сообщениями об использовании архивных документов. Готовила статьи для местной печати и научных изданий.

За свою трудовую деятельность Т. М. Либеровская неоднократно удостаивалась различных наград. Среди них — Грамота Верховного Совета БССР, Грамота МВД БССР, Почетная грамота ЦК профсоюзов работников госучреждений и Главного Архивного Управления при Совете Министров СССР и др.

Но не только профессиональными качествами отличалась Тамара Дмитриевна. Она была очень ярким человеком. Интеллигентная, образованная, безумно любящая свою профессию, она была душой любой компании. Сотрудники архива с удовольствием вспоминают, как великолепно она пела. И не просто песни, а многие арии из знаменитых опер и оперетт. Она была очень увлекающейся натурой. Много читала и в молодости мечтала стать профессиональной актрисой. И хоть эта мечта ее не сбылась, она в свободное время играла в любительском театре. Как вспоминает одна из сотрудниц архива: «Она для меня — как яркое пятно. Не красавица, а глаз не отвести. Всегда великолепно одетая, следящая за своей внешностью, очень улыбчивая и приветливая».

Тамара Дмитриевна обладала еще одним даром — была великолепным оратором. Не секрет, что лекции в советское время были обязанностью. И зачастую они были скучными, неинтересными. Но не лекции Тамары Дмитриевны. На ее лекции слушатели шли не по принуждению, а по желанию. Самый обыденный материал она умела преподнести интересно и ярко.

Кроме того, Тамара Дмитриевна обладала также способностью тонко чувствовать человека, определять его способности. Почти все, кого она в свое время повысила в должности, оправдали ее доверие, так же, как и она, всю свою жизнь отдали архиву. Умудренная опытом, она всегда могла дать дельный совет, за что пользовалась уважением всего коллектива. И в тоже время была человеком с переменчивым настроением: строгость, требовательность могла тут же у нее сменяться шуткой.

Одно у нее было неизменным — любовь и уважение к людям, к коллегам по работе и желание передать им хоть часть своего огромного багажа знаний.

И уйдя из жизни, Тамара Дмитриевна незримо присутствует в коллективе архивистов, так как имя ее вспоминают и те, кто с ней работал, и те, кто ее не знал лично, но до сих пор пользуется составленными ею справочниками, обзорами, каталогами.

— ◊ —

## ЧТОБЫ ПОМНИЛИ

*К 80-летию со дня рождения К. Ф. Плахотниковой*
*(18.02.1932—14.01.2002)*

18 февраля 2012 г. исполнилось бы 80 лет со дня рождения Плахотниковой Клавдии Федоровны, одному из высококлассных специалистов архивной отрасли, бывшему работнику Центрального государственного архива Октябрьской революции и социалистического строительства БССР (ЦГАОР БССР — ныне Национальный архив Республики Беларусь).

Клавдия Федоровна родилась в д. Кукановка Граждановского района Тамбовской области в семье военнослужащего. Свое детство она провела в Москве с матерью, затем переехала к отцу в Беларусь в г. Пружаны Брестской области, где успешно окончила русскую среднюю школу. В 1949 г. поступила в Минский юридический институт, после окончания которого в 1953 г. была направлена на работу в архивные органы МВД БССР. С этого момента и начался профессиональный путь Плахотниковой К. Ф. в архивной отрасли, которому она не изменила до выхода на заслуженный отдых. Клавдия Федоровна начала свою трудовую деятельность в архиве с должности научного сотрудника общих фондов, далее работала старшим научным сотрудником научно-публикаторской группы, а с июня 1961 г. — начальником отдела использования и публикации документальных материалов ЦГАОР БССР. С октября 1979 г. в связи с введением в центральные архивы новой штатной расстановки Плахотникова К. Ф. назначена заведующей отделом информации, публикации и научного использования документов ЦГАОР БССР.

Плахотникова Клавдия Федоровна была составителем сборников архивных документов: «Борьба за Советскую власть в Белоруссии», «Индустриализация БССР», «Революционные комитеты БССР (ноябрь 1918 — июль 1920 гг.)», «Документы обличают», «Народное образование в БССР», «Завер-

шение коллективизации сельского хозяйства и организационно-хозяйственное управление колхозов Белорусской ССР (1933 — июнь 1941 гг.)» и др. В 1984 г. на межотраслевой тематической выставке «Использование государственного архивного фонда СССР для дальнейшего развития советской культуры», которая проходила в Москве на ВДНХ СССР, за подготовку сборника «Народное образование в БССР» Плахотникова К. Ф. награждена серебряной медалью выставки. Клавдия Федоровна принимала активное участие в конференциях по вопросам архивного дела, археографии и архивоведения.

Руководство отрасли высоко оценило заслуги Клавдии Федоровны за личные успехи, успехи коллектива, который она возглавляла. Она была награждена медалью «За доблестный труд», Почетной грамотой Главного архивного управления при Совете Министров СССР и ЦК профсоюза, Почетной грамотой Верховного Совета БССР, знаком «Отличник архивного дела СССР».

Работая в архиве, Плахотникова К. Ф. пользовалась заслуженным уважением и авторитетом у своих коллег по работе. Последние годы своей трудовой деятельности Плахотникова К. Ф. исполняла обязанности заместителя директора архива.

Клавдия Федоровна — это один из немногих работников отрасли, имевших запись в трудовой книжке, где единственным местом работы значилась только одна организация — Центральный государственный архив Октябрьской революции и социалистического строительства БССР. 35 лет она отдала честному служению архивной отрасли и одному архиву. Она была простым и порядочным человеком, воспитала двоих сыновей, имела четверых внуков. Такой она и запомнилась работникам архива.

Источники и литература

1. НАРБ. — Ф. 250. — Оп. 4. — Д. 251.
2. Архівісты Беларусі: Біябібліяграфічны даведнік. — Мінск: БелНДІДАС, 2006. — С. 181.
3. Наша история. Национальный архив Республики Беларусь. 1927—2007 гг. — Минск: НАРБ, 2007. — С. 110 .

*Коллектив Национального архива Республики Беларусь*

— ◊ —

***О. В. Бирюкова***

## Т. А. ВОРОБЬЕВА

*(к 80-летию со дня рождения)*

Есть люди, встреча с которыми надолго остается в памяти. И хотя с Тамарой Анатольевной Воробьевой я проработала не очень долго, но в моей памяти она осталась как очень позитивный человек, грамотный, знающий и, главное, любящий свое дело. Всегда в хорошем настроении, с доброжелательной улыбкой, Тамара Анатольевна умела найти подход к любому человеку,

будь он коллега по работе или человек из мира науки, с которым ей приходилось решать возникающие вопросы.

Тамара Анатольевна Воробьева (урожденная Щукина) родилась 17 ноября 1932 г. в Азербайджане, в семье рабочих. После окончания Помашнянской железнодорожной СШ № 19 (Кировоградская область, Украина) в 1950 г. поступила в Московский государственный историко-архивный институт. На четвертом курсе Тамара Анатольевна вышла замуж за А. В. Воробьева и после окончания института вместе с мужем была направлена на работу в Минск.

С августа 1955 г. по апрель 1965 г. Т. А. Воробьева работает в Государственном архиве Минской области, где занимает должности научного сотрудника, с июля 1959 г. — старшего научного сотрудника, а с января 1964 г. Тамару Анатольевну назначают начальником отдела использования и публикации документов архива.

После перевода Центрального государственного исторического архива БССР из Могилева в Минск в апреле 1965 г. Т. А. Воробьеву направляют на работу в этот архив, где она возглавила отдел использования и публикации документов. Это время она вспоминала с особой теплотой, потому что работа была интересной, она увлекала и, как говорила Тамара Анатольевна, она иногда даже забывала про время. Благодаря ее поисковой работе в архиве в научный оборот было введено значительное количество ранее неизвестных документов по истории Минска, социально-экономическому положению населения Беларуси и т. д. На основе выявленных документов она подготовила и опубликовала в периодической печати сотни статей, провела десятки теле- и радиопередач.

С апреля 1975 г. Т. А. Воробьеву переводят на работу в Главное архивное управление при Совете Министров БССР на должность начальника научно-издательского отдела, а с 1981 по 1988 г. она — начальник отдела организационно-методического и научно-справочного аппарата. С 1988 г. — на пенсии.

Прекрасный организатор, профессионал своего дела, Тамара Анатольевна внесла весомый вклад в развитие архивного дела в Беларуси. Она являлась редактором издававшихся Главархивом сборников документов, путеводителей по архивам, справочников. Была членом коллегии, активно участвовала в работе Научного совета и методической комиссии Главархива. Особенно запомнились выступления Тамары Анатольевны на коллегиях, рабочих заседаниях, собраниях коллектива. Всегда четко, лаконично, со знанием дела, она могла убеждать, увлекать, помогать, даже критика с ее стороны не выглядела обидной.

За заслуги перед архивной отраслью Воробьева Т. А. награждена орденом «Знак почета» (1981 г.), медалями «За доблестный труд в ознаменование

100-летия со дня рождения В. И. Ленина» (1984 г.), грамотой Верховного Совета БССР (1972 г.), знаком «Отличник архивного дела СССР» (1986 г.).

Воробьева Т. А. была замечательной хозяйкой, любящей женой, мамой и бабушкой. Могла бесконечно долго рассказывать о внучке, которую безмерно любила. И еще запомнились знаменитые пироги Тамары Анатольевны, которыми она потчевала своих коллег по работе по поводу различных юбилеев и праздников. Даже уже находясь на заслуженном отдыхе, Тамара Анатольевна передавала нам свои пироги через мужа — Александра Васильевича Воробьева, работавшего после Тамары Анатольевны начальником отдела организационно-методического и научно-справочного аппарата.

Умерла Тамара Анатольевна Воробьева 26 января 1999 г. В тот день у нас проходила итоговая коллегия. И это в определенной степени символично, потому что Тамара Анатольевна за время работы в Главархиве подготовила и провела не одну итоговую коллегию. На той, «последней», о ней вспомнили и почтили ее память.

—◊—

## ПАМЯЦІ ТАВАРЫША

28 лістапада 2011 г. пайшоў з жыцця Уладзімір Васільевіч Фядосаў — дырэктар (1997—2005), намеснік дырэктара (2005—2011) Беларускага навукова-даследчага інстытута дакументазнаўства і архіўнай справы.

Уладзімір Васільевіч нарадзіўся ў 1950 г. у в. Вялікая Выдрэя Ліёзненскага р-на Віцебскай вобл. у сям'і рабочых. Пасля заканчэння 8 класаў Выдрэйскай школы паступіў у прафесійна-тэхнічнае вучылішча № 37 г. Віцебска, пасля заканчэння якога працаваў слесарам-інструментальшчыкам на Віцебскім заводзе радыёдэталей і адначасова вучыўся ў школе працоўнай моладзі, пасля заканчэння якой у 1968 г. паступіў у Ленінградскае вышэйшае ваенна-палітычнае вучылішча войск проціпаветранай абароны. Пасля заканчэння вучылішча У. В. Фядосаў з 1972 г. служыў ва Узброеных Сілах СССР (з 1991 г. — Рэспублікі Беларусь). У 1982 г. ён скончыў Ваенна-палітычную акадэмію імя У. І. Леніна, у 1988 г. — аспірантуру пры Беларускім дзяржаўным інстытуце народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава. Абараніў кандыдацкую дысертацыю па эканоміцы. Да 1997 г. У. В. Фядосаў працаваў выкладчыкам, намеснікам начальніка, прафесарам кафедры сацыяльных навук у Мінскім вышэйшым інжынерным зенітна-ракетным вучылішчы, у Ваеннай акадэміі Рэспублікі Беларусь. Быў звольнены ў запас у званні палкоўніка, але не пакінуў навукова-педагагічную дзейнасць, узначаліў ведамасную навуковую арганізацыю.

У. В. Фядосаў узначаліў БелНДІДАС, калі інстытут знаходзіўся на этапе станаўлення, пошуку свайго месца ў сістэме дзяржаўных архіўных устаноў, вырашэння вельмі актуальных для 1990-х гг. пытанняў фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

Увесь перыяд работы ў архіўнай галіне Уладзімір Васільевіч імкнуўся дасканала авалодаць тэарэтычнымі ведамі і спецыфікай практычнай дзейнасці

архіваў, распрацоўваў навуковую праблематыку, у якой мог быць максімальна карысным. Яго манаграфія «Эканоміка архіўнай справы», выдадзеная ў 2007 г., і да цяперашняга часу застаецца адзінай у адпаведнай галіне даследаванняў у Беларусі. Ён з'яўляецца аўтарам больш чым 60 навуковых, нарматыўна-метадычных прац па пытаннях выкладання грамадскіх навук, умоў працы, архівазнаўства.

Намаганні Уладзіміра Васільевіча не прайшлі безвынікова, менавіта ў час яго кіраўніцтва былі рэалізаваны шматлікія важныя праекты інстытута. Самы актыўны ўдзел ён прыняў у стварэнні і арганізацыі дзейнасці галіновай Археаграфічнай камісіі, стаяў ля вытокаў «Беларускага археаграфічнага штогодніка», з'яўляючыся нязменным членам яго рэдакцыйнай калегіі. У многім дзякуючы намаганням У. В. Фядосава пры БелНДІДАС у 1999 г. была адкрыта аспірантура для падрыхтоўкі навуковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі па спецыяльнасцях 05.25.02 — дакументалістыка, дакументазнаўства, архівазнаўства (гістарычныя навукі) і 07.00.09 — гістарыяграфія, крыніцазнаўства і метады гістарычнага даследавання (гістарычныя навукі).

Уладзімір Васільевіч быў чалавекам сапраўды адданым той справе, якой займаўся. БелНДІДАС стаў для яго, вобразна кажучы, «другім домам», «любімым дзіцём», ён да апошняга дня шчыра перажываў за лёс інстытута, за яго імідж.

За доблесную службу ва ўзброеных сілах У. В. Фядосаў адзначан шэрагам ваенных узнагарод. За работу ў архіўнай галіне ён узнагароджан Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь і нагрудным знакам «Ганаровы архівіст Беларусі».

У памяці ўсіх, хто ведаў Уладзіміра Васільевіча, назаўсёды застанецца яго вобраз, які ўвасобіў у сябе незвычайную чалавечую дабрыню, жыццярадаснасць, аптымізм, уменне трымаць слова, вобраз Прыстойнага чалавека з вялікай літары.

*Калектыў БелНДІДАС і рэдакцыйнай калегіі БАШ*

# РЭЗЮМЭ

**У. І. Адамушка, М. В. Бябенін**. Аб Законе Рэспублікі Беларусь «Аб архіўнай справе і справаводстве ў Рэспубліцы Беларусь».

У аналізуемым у артыкуле Законе сістэматызаваны заканадаўчыя нормы па прававым рэгуляванні ў галіне архіўнай справы і справаводства і зняты ўсе існаваўшыя ў гэтым пытанні супярэчнасці. У Законе таксама ўлічаны сучасныя тэндэнцыі развіцця грамадства, і яго рэалізацыя будзе садзейнічаць удасканальванню архіўнай справы і справаводства і самае галоўнае — адпавядаць інтарэсам грамадзян нашай краіны, а таксама інтарэсам замежных грамадзян і асоб без грамадзянства, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

**Т. І. Седлярэвіч**. 90 гадоў гісторыі архіўных органаў і ўстаноў Рэспублікі Беларусь.

У 2012 г. архіўныя органы і ўстановы Рэспублікі Беларусь адзначаюць сваё 90-годдзе. На працягу ўсяго гэтага часу яны няўхільна ажыццяўлялі палітыку дзяржавы ў галіне архіўнай справы і справаводства, якая накіравана на забеспячэнне карыстальнікаў рэтраспектыўнай інфармацыяй, неабходнай для вырашэння задач палітычнага, эканамічнага і культурнага развіцця краіны, стабільнага і ўстойлівага развіцця грамадства.

У артыкуле, прымеркаваным да юбілею архіўных органаў і ўстаноў краіны, робіцца экскурс у гісторыю архіўнай справы ў Рэспубліцы Беларусь. Разглядаюцца асноўныя этапы гісторыі архіўных органаў і ўстаноў Рэспублікі Беларусь з 1922 г. і да нашых дзён, навацыі, якія ўносіліся кожным з гэтых перыядаў у іх гісторыю. Даецца кароткая аналітычная інфармацыя аб сённяшнім стане архіўнай справы ў Рэспубліцы Беларусь.

**Э. М. Савіцкі**. Прававыя асновы дзейнасці органаў мясцовага кіравання і самакіравання ў Рэспубліцы Беларусь *(80-я гады XX — пачатак XXI ст.)*.

У артыкуле ў гісторыка-архівазнаўчым аспекце прасочваецца працэс станаўлення і развіцця прававой базы дзейнасці мясцовых прадстаўнічых і распарадчых органаў, інстытутаў непасрэднай дэмакратыі за 20 гадоў пасля здабыцця Рэспублікай Беларусь дзяржаўнага суверэнітэту. Аналізуюцца савецкія канстытуцыі і Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, законы аб мясцовым кіраванні і самакіраванні, акты Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь, кодэксы Рэспублікі Беларусь і іншыя дакументы, асобнымі нормамі якіх рэгулююцца некаторыя пытанні мясцовых органаў улады.

**Л. М. Захарава**. Узаемадзеянне Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь з міжнароднымі арганізацыямі вышэйшых кантрольных органаў.

Раскрываецца значэнне фінансавага кантролю ў вырашэнні сацыяльна-эканамічных задач. Адлюстроўваецца дзейнасць Камітэта дзяржаўнага кантролю Рэспублікі Беларусь як паўнапраўнага члена міжнародных арганізацый фінансавага кантролю, такіх, як ІНТАСАІ, ЕЎРАСАІ, Савета кіраўнікоў вышэйшых органаў фінансавага кантролю дзяржаў — удзельніц СНД і іншых, іх роля ў выпрацоўцы міжнародных стандартаў кантрольнай дзейнасці, барацьбе з легалізацыяй даходаў, атрыманых злачынным шляхам, парушэннямі падатковага, бюджэтнага заканадаўства суб`ектамі гаспадарання.

**А. А. Вайтовіч**. Прававыя крыніцы па гісторыі развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Артыкул прысвечаны аналізу асноўных прававых актаў як крыніц па гісторыі развіцця сістэмы вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Разглядаюцца вядучыя тэн-

дэнцыі развіцця вышэйшай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь за перыяд 1991—2010 гг. Абраная аўтарам тэма даследавання актуальная ў аспекце ажыццяўляемых пераўтварэнняў у сістэме менеджменту якасці адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

**У. Н. Сідарцоў**. Зараджэнне і станаўленне кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ (1992—2001 гг.).

У артыкуле разглядаюцца фактары, якія вызначылі стварэнне кафедры крыніцазнаўства. Канцэнтруецца ўвага на плённай творчай рабоце заснавальнікаў кафедры, на яе дасягненнях у фарміраванні новых напрамкаў у развіцці беларускай гістарычнай навукі і арганізацыі новых вучэбных дысцыплін у рэспубліцы. Робіцца выснова, што дасягненнямі кафедры ў першым дзесяцігоддзі закладзены моцны фундамент для яе паспяховай дзейнасці ў наступныя гады.

**М. Ю. Герасімовіч**. Фонд Брэсцкага абласнога камітэта былой КПБ як крыніца па гісторыі Брэстчыны (1939—1991 гг.).

У артыкуле аналізуюцца склад і змест дакументальных матэрыялаў фонду 1-п Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці за 1939—1991 гг., якія адкладаліся ў працэсе дзейнасці Брэсцкага абкама КПБ. Дадзены звесткі аб арганізацыі працы і структуры абкама, прыводзіцца класіфікацыя дакументаў, у якіх сканцэнтравана інфармацыя, што адлюстроўвае літаральна ўсе аспекты гісторыі Брэстчыны другой паловы XX ст.

**С. В. Кулінок**. Апытальныя лісты і пратаколы гутарак як крыніца па гісторыі партызанскай разведкі ў 1941—1943 гг. *(па матэрыялах фонду 1450 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь)*.

Артыкул прысвечаны малавывучаным дакументам па гісторыі партызанскага руху — апытальным лістам і пратаколам гутарак. Аўтар даследаваў прычыны ўзнікнення дадзенага віду дакументацыі, яго ўнутраную структуру і інфарматыўнасць, вызначыў станоўчыя бакі і недахопы адзначанай крыніцы па гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а таксама яе месца сярод іншых дакументаў па гісторыі партызанскай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі БССР.

**В. М. Матох**. Фільтрацыйныя справы і трафейныя дакументы на былых ваеннапалонных і рэпатрыіраваных савецкіх грамадзян як гістарычная крыніца *(па матэрыялах фонду 1717 Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці)*.

Аўтар аналізуе склад і змест дакументаў фільтрацыйных спраў, перспектывы іх вывучэння, паказвае магчымыя метады іх выкарыстання ў гістарычных даследаваннях. Паказана каштоўнасць дакументаў фонду 1717 як крыніцы вялікага аб’ёму разнапланавай інфармацыі генеалагічнага, сацыяльна-эканамічнага і гістарычнага характару па перыядзе Другой сусветнай вайны і нацысцкай акупацыі Беларусі — аб становішчы на акупіраваных нацыстамі тэрыторыях СССР, сацыяльна-эканамічнай палітыцы нацысцкай Германіі, прымусовай дэпартацыі насельніцтва акупіраваных тэрыторый, выкарыстанні прымусовай працы ў Еўропе падчас Другой сусветнай вайны, аб лёсах ваеннапалонных, аб працы органаў дзяржбяспекі савецкай дзяржавы, аб пытаннях памяці пра Другую сусветную вайну ў Еўропе і Беларусі, уплыве наступстваў Другой сусветнай вайны на міжнародныя зносіны ў другой палове XX — пачатку XXI ст. Многія дакументы фонду маюць музейную і дэманстрацыйную каштоўнасць.

**А. М. Таратута**. Справаводства мясцовых судовых і пракурорскіх органаў, якія дзейнічалі на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гг.

Артыкул прысвечаны характарыстыцы асобных відаў дакументаў, якія ствараліся ў дзейнасці судовых органаў і пракуратуры, устанаўленню нормаў і патрабаванняў да іх

афармлення, а таксама аналізу спецыфікі працы канцылярскай службы судовых органаў і пракуратуры, найбольш значных напрамкаў яе дзейнасці.

Справы судовай вытворчасці прадстаўляюць сабой вельмі каштоўную інфармацыю з пункту погляду як дакументазнаўцаў, так і гісторыкаў. І калі для першых такія справы — гэта падрабязнейшая крыніца па вывучэнні парадку вядзення, фарміравання, выкарыстання і захоўвання інфармацыі ў судах, то для гісторыкаў справа судовай вытворчасці — гэта заўсёды скарб, які дазваляе прасачыць лёс асобнага чалавека праз прызму мінулых дзесяцігоддзяў.

**С. С. Рудовіч**. Мінскі Савет дэпутатаў: пачатак шляху (1917—1920 гг.).

У артыкуле, прымеркаваным да 95-й гадавіны з часу ўтварэння Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў, разглядаецца працэс яго ўтварэння і асноўныя напрамкі дзейнасці ў перыяд рэвалюцыі і грамадзянскай вайны. Акцэнтуецца ўвага на працэдуры выбрання Савета першых пяці скліканняў, яго партыйным складзе. Паказана трансфармацыя Мінскага Савета з грамадска-палітычнага фарміравання ў дзяржаўны орган. Закранаецца пытанне аб узаемаадносінах Савета з беларускім нацыянальным рухам. У дадатках да артыкула друкуюцца матэрыялы першага нумара «Известий [Минского] Совета рабочих депутатов» ад 5 сакавіка 1917 г. і іншыя малавядомыя крыніцы.

**А. А. Лашкевіч**. Віцебскае губернскае жандарскае ўпраўленне напярэдадні і ў час рэвалюцыі 1905—1907 гг. *(па матэрыялах фонду Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)*.

У артыкуле разгледжаны асноўныя накірункі дзейнасці Віцебскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў 1905—1907 гг. На канкрэтных прыкладах адлюстравана яго праца па нейтралізацыі рэвалюцыйнага падполля і сацыяльнага пратэсту. Асаблівая ўвага ўдзелена падзеям 1905—1907 гг.

**А. М. Лукашэвіч**. Расійскае аператыўнае планаванне (студзень—сакавік 1812 г.): па матэрыялах Расійскага дзяржаўнага ваенна-гістарычнага архіва.

У артыкуле аналізуюцца дакументы расійскага аператыўнага планавання канца 1811 — пачатку 1812 г. Адзначаецца, што ў адпаведнасці з планамі вясной 1812 г. расійскія войскі павінны былі ўступіць на тэрыторыю Прусіі і Княства Варшаўскага. Пры гэтым у плануемых варыянтах прадугледжвалася не простае разбурэнне тэрыторыі верагоднага праціўніка, а разгром яго арміі, захоп Варшавы і ўзяцце пад свой кантроль лініі Віслы. Непазбежным вынікам ажыццяўлення падобнага аператыўнага плана павінна было стаць абвяшчэнне «Польскага Каралеўства». У цэлым, змены ў раскладзе палітычных сіл у Еўропе да пачатку красавіка 1812 г. прадвызначылі адмову Расіі ад правядзення наступальнай аперацыі з мэтай «змены ўрадаў».

**П. А. Некрашэвіч**. Удзел генералаў Асобнага Літоўскага корпуса ў вайне 1812 г.: па даных пісьмовых крыніц.

Артыкул прысвечаны ўдзелу ў вайне 1812 г. генералаў Асобнага Літоўскага корпуса (1817—1831). Дадзеная вайсковая адзінка камплектавалася рэкрутамі з заходніх губерняў і была раскватаравана на тэрыторыі Валынскай, Гродзенскай і Мінскай губерняў, а таксама Беластоцкай вобласці. Аналізуецца роля генералаў у перамозе расійскай арміі над Напалеонам, прафесійныя і асабістыя якасці, уплыў кампаній 1812—1814 гг. на іх далейшую вайсковую кар'еру. Вылучаюцца прынцыпы, якімі кіраваўся расійскі ўрад, фарміруючы вышэйшы афіцэрскі склад Асобнага Літоўскага корпуса. Нададзена ўвага ўзроўню адукацыі генералаў корпуса, а таксама іх сувязі з тайнымі таварыствамі Расійскай імперыі.

**А. М. Латушкін**. Дакументальныя страты Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў у пачатку XIX ст. (справа К. Квяткоўскага).

У артыкуле разглядаецца праблема дакументальных страт Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў і, у прыватнасці, выпадак незаконнага прысваення манускрыптаў і кніг з нясвіжскага замка бібліятэкарам Дамініка Радзівіла К. Квяткоўскім (1804—1810 гг.). Аўтарам устаноўлена месца сучаснага захоўвання асноўнага комплексу рукапісаў — Бібліятэка Польскай акадэміі навук у г. Курніку, выяўлены крыніцы, якія даюць магчымасць узнавіць гісторыю пераходу іх на захоўванне ў дадзеную ўстанову, вызначыць склад комплексу, высветліць прававыя аспекты справы. Прыводзіцца спіс выяўленых дакументаў.

**Л. І. Масяйчук**. Крыніцы па гісторыі семінарскай адукацыі ўніяцкага духавенства ў Беларусі (1743—1839 гг.).

Артыкул прысвечаны аналізу крыніц, якія закранаюць гісторыю эвалюцыі семінарскай духоўнай адукацыі ўніяцкага святарства ў Беларусі ў 1743—1839 гг. Вылучаюцца дзве асноўныя групы крыніц: апублікаваныя (заканадаўчыя і нарматыўныя акты, а таксама дакументы ўласнага паходжання) і архіўныя матэрыялы. Адзначаецца, што асноўная крыніцазнаўчая база па дадзенай тэме захоўваецца ў расійскіх гістарычных архівах і з'яўляецца дастаткова поўнай і markдробязнай. Падкрэсліваецца, што ўвядзенне ў навуковы абарот аналізуемых у артыкуле крыніц дасць магчымасць правесці не толькі рэканструкцыю асобных навучальных устаноў, але і прасачыць этапы станаўлення і развіцця семінарскай духоўнай уніяцкай адукацыі.

**В. В. Урублеўскі**. Візіты ўніяцкіх храмаў як крыніца для рэканструкцыі штодзённасці сялянства Беларусі другой паловы XVIII ст. *(па матэрыялах НГАБ)*.

Па матэрыялах НГАБ як крыніцы па гісторыі прыватнай, грамадскай і гаспадарчай штодзённасці сялянскага насельніцтва даследуюцца візіты (акты апісання) уніяцкіх храмаў другой паловы XVIII ст. Праводзіцца агляд гістарыяграфіі, адзначаецца крыніцазнаўчая каштоўнасць візітаў.

**Г. М. Брэгер, Л. А. Лінская**. Архіў Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра (дакументы 436—532 за 1733—1746 гг.).

Чарговая публікацыя дакументаў Архіва Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра за 1733—1746 гг. асвятляе гісторыю манастыроў і цэркваў Слуцкай праваслаўнай архімандрыі, складанасці існавання праваслаўнай царквы ў ВКЛ у гэты перыяд, узаемаадносіны святароў і іерархаў розных канфесій і свецкіх асоб, сацыяльна-эканамічную гісторыю паселішчаў рэгіёна.

**Ю. М. Лаўрык**. Кнігавыдавецкая дзейнасць Спірыдона Собаля ў Куцейне.

Даследуецца кнігавыдавецкая дзейнасць Спірыдона Собаля ў Куцейне і разглядаюцца пытанні, недастаткова распрацаваныя ў літаратуры. Асаблівая ўвага нададзена праблеме Собалевых выданняў з несапраўднымі выходнымі данымі, адносна паходжання якіх у літаратуры да апошняга моманту не было адназначнага меркавання. На падставе аналізу звестак, якія прысутнічаюць на тытульных аркушах гэтых выданняў, а таксама вывучэння паперы, аўтар робіць спробу высветліць іх сапраўднае месца выхаду. Даводзіцца, што выдадзены каля 1632 г. «Актоіх» з несапраўднымі выходнымі звесткамі быў выпушчаны Собалем менавіта ў Куцейне (а не ў Буйнічах, як дапускалася гісторыкамі), у той час як абодва выданні «Ліманара» ўбачылі свет яшчэ ў Кіеве ў 1628 і 1629 гг.

**Я. С. Мальчэўскі**. Экспертыза каштоўнасці патэнтавых дакументаў.

Артыкул прысвечаны даследаванню асаблівасцей экспертызы каштоўнасці патэнтавых дакументаў у Рэспубліцы Беларусь. Разглядаюцца магчымасці выкарыстання агульных і спецыфічных крытэрыяў ацэнкі дакументаў у адносінах да патэнтавых дакументаў. На аснове аналізу заканадаўства ў сферы прамысловай уласнасці аўтарам вызначаюцца крытэрыі і парадак экспертызы каштоўнасці розных катэгорый заявак на аб'екты прамысловай уласнасці. Вылучаюцца віды патэнтавых дакументаў, якія маюць навукова-гістарычную каштоўнасць і падлягаюць пастаяннаму захоўванню.

**В. С. Іванова**. Праблемы развіцця архіўнай тэрміналогіі ў Беларусі.

У артыкуле вылучаны асноўныя тэндэнцыі ў складванні архіўнай тэрміналогіі ў Беларусі на этапах фарміравання, нармалізацыі і стандартызацыі. На сучасным этапе развіцця архіўнай тэрміналогіі вызначаецца шэраг тэндэнцый і праблем да вырашэння: недастатковае выкарыстанне сучасных навуковых распрацовак пры правядзенні стандартызацыі, імкненне да жорсткага (стандартызаванага) ужывання тэрмінаў за межамі афіцыйнай дакументацыі і архіўнай практыкі, фактычная адсутнасць комплексных навуковых даследаванняў, якія б спрыялі асэнсаванню і карэкціроўцы існуючай архіўнай тэрмінасістэмы, моцны ўплыў дакументазнаўчых падыходаў на развіццё архіўнай тэрміналогіі.

**Д. А. Сіняк**. Падыходы да камплектавання архіваў каледжаў і ўніверсітэтаў у ЗША і Вялікабрытаніі.

У артыкуле на аснове аналізу амерыканскіх і брытанскіх крыніц па тэорыі і метадыцы камплектавання архіваў каледжаў і ўніверсітэтаў ЗША і Вялікабрытаніі вылучаюцца падыходы да ўстанаўлення палітыкі камплектавання архіваў дадзеных устаноў, вызначэння складу дакументаў, якія прымаюцца на захоўванне ў іх архівы, парадку доступу да архіўных дакументаў. Аналізуюцца агульныя пытанні тэорыі і практыкі экспертызы каштоўнасці дакументаў і камплектавання архіваў, якія знайшлі адлюстраванне ў англамоўных крыніцах.

**У. М. Буцько**. Вусная гісторыя і архівы: амерыканскі вопыт.

У артыкуле паказаны досвед працы архіваў і бібліятэк ЗША ў галіне вуснай гісторыі. Аўтар даследуе ўплыў архівістаў на працэс інстытуалізацыі вуснай гісторыі. Разглядаюцца першыя праекты па ёй, якія насілі ярка выражаны архіўны характар. Асаблівае месца ў артыкуле аўтар адводзіць характарыстыцы змен, якія адбыліся ў працэсе збору і прэзентацыі матэрыялаў вуснай гісторыі пад уплывам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі канца XX — пачатку XXI ст.

**Л. Л. Леўчанка**. Фарміраванне сістэмы архіўнай адукацыі ў ЗША: навукоўцы, дыскусіі, вынікі.

Асветлены ідэі, меркаванні, дыскусіі амерыканскіх навукоўцаў-архівістаў па пытанні выкладання архіўных дысцыплін у вышэйшых навучальных установах ЗША, спробы стварэння архіўных курсаў і інстытутаў, змаганне амерыканскіх архівістаў за адкрыццё самастойных факультэтаў архіўнай справы ва ўніверсітэтах. Разгледжана дзейнасць камітэтаў па адукацыі Таварыства амерыканскіх архівістаў. Адлюстраваны розныя погляды амерыканскіх навукоўцаў на месца і метады выкладання архівазнаўчых дысцыплін: гістарычныя факультэты і метады выкладання гісторыі або бібліятэчныя школы і метады бібліятэказнаўства. Нададзена ўвага пытанню правядзення сертыфікацыі і дзейнасці Акадэміі сертыфікаваных архівістаў. Ахарактарызаваны мэты архіўнай адукацыі ў ЗША, устаноўленыя Таварыствам амерыканскіх архівістаў. Звернута

ўвага на міждысцыплінарны характар архіўнай адукацыі ў ЗША і яго неадрыўнасць ад практычнай базы — архіўных устаноў.

**Т. Д. Гярновіч**. ІўПератэн «Адміністрацыя і тры ўзросты архіваў».

Упершыню публікуецца пераклад на рускую мову артыкула ІваПератэна «Адміністрацыя і тры ўзросты архіваў», апублікаванага на французскай мове ў 1961 г. і стаўшага фундаментам для сучаснай тэорыі французскага архівазнаўства. У працы ІваПератэна абгрунтавана, што ўжыванне прынцыпу павагі фонду залежыць ад розных упраўленняў дакументам падчас трох «узростаў», перыядаў жыцця архіва.

**А. І. Раздорскі**. Матэрыялы па гісторыі Беларусі ў асноўным зборы рукапіснай кнігі Аддзела рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі.

У артыкуле прадстаўлены агляд дакументаў XVI—XIX стст. па гісторыі Беларусі, якія захоўваюцца ў складзе фонду «Асноўны збор рукапіснай кнігі» Аддзела рукапісаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Сярод іх пісцовыя кнігі Полацкага павета, даклад генерала Ф. Боўра імператрыцы Кацярыне II аб аглядзе межаў беларускіх губерняў, нарыс з жыцця сялян Віцебскай губерні Альхімовіча, матэрыялы для справаздачы магілёўскага губернатара А. П. Беклямішава, Атлас Магілёўскай і Полацкай губерняў (1777 г.).

**У. В. Мальцаў**. Псеўданім як крытэрый ідэнтычнасці беларускай сцэны.

У навуковы ўжытак ўводзяцца раней невядомыя псеўданімы, якімі карысталіся дзеячы беларускай сцэны ў 1917—1920-х гг. Вызначэнне грамадзянскіх прозвішчаў носьбітаў псеўданімаў немагчыма без спасылкі на рукапісныя і друкаваныя крыніцы інфармацыі, якія складаюцца ў самастойныя для кожнай персаналіі групы дакументаў. Сукупнасць іх дазваляе праводзіць ідэнтыфікацыю з прымяненнем метадаў сумежных галіновых дысцыплін — гістарычнага дакументазнаўства, мастацтвазнаўства і лінгвістыкі. Сцэнічны псеўданім з’яўляецца спецыфічнай моўнай адзінкай, і ў мэтавым адборы слоў, лексіцы, якая выкарыстоўвалася артыстамі для стварэння «мастацкага імя», праяўляюцца характэрныя асаблівасці беларускага тэатра.

**І. М. Шпілеўская**. Штатны расклад Мінскай губерні 1796 г.

Публікуецца першы штатны расклад губернскіх і павятовых устаноў Мінскай губерні ў канцы XVIII ст.

**П.-М. Бергер**. Успаміны Фрыдрыха Людвіга Вайнбергера пра напалеонаўскі паход на Расію ў 1812 г.

Фрыдрых Людвіг Вайнбергер (1794—1869) быў маладым салдатам гарнізона Кёнігсберга, Усходняя Прусія. У чэрвені 1812 г. 400 прускіх артылерыстаў былі ўключаны Напалеонам у склад свайго Вялікага войска, прызначанага для ўварвання ў Расію. Адзін з 12 салдат з усяго атрада, якія выжылі, Вайнбергер вярнуўся дадому з рускага палону ў сакавіку 1813 г. У сваіх мемуарах ён апісаў ўражанні, вынесеныя падчас наступу, баёў, знаходжання на захопленай тэрыторыі, адступлення з Масквы, да якіх дадаў даты, імёны і ваенныя факты. Рукапіс памерам у 78 старонак, як можна меркаваць, быў завершаны каля 1849 г., яго мэта была ў тым, каб служыць асновай вусных аповедаў. Рукапіс захоўваўся ў сям’і на працягу шматлікіх пакаленняў. Гэта, верагодна, адзіная крыніца, якая захавалася і сведчыць пра тое, што ў рускай кампаніі Напалеона прускія салдаты дайшлі да Масквы.

**Я. К. Анішчанка**. Дакументы пра высяленне яўрэяў Беларусі ў гарады ў 1823 г.

Аўтар друкуе два арыгінальныя лісты беларускіх кагалаў адносна ўрадавых планаў па яўрэйскім пытанні на тэрыторыі Заходніх губерняў Расійскай імперыі ў 1823 г.

**В. С. Пазднякоў**. Дакументы пра дзейнасць папяровай «фабрыкі» графаў Завішаў у в. Ніз Ігуменскага павета (першая палова XIX ст.).

Публікуюцца два дакументы 1830-х гг. пра дзейнасць папяровай «фабрыкі» графаў Завішаў у в. Ніз Ігуменскага павета (першая палова XIX ст.).

# РЕЗЮМЕ

**В. И. Адамушко, Н. В. Бебенин**. О Законе Республики Беларусь «Об архивном деле и делопроизводстве в Республике Беларусь».

В анализируемом в статье Законе систематизированы законодательные нормы по правовому регулированию в сфере архивного дела и делопроизводства и сняты имевшиеся в этом вопросе противоречия. В Законе также учтены современные тенденции развития общества, и его реализация будет содействовать совершенствованию архивного дела и делопроизводства и самое главное — отвечать интересам граждан нашей страны, а также интересам иностранных граждан и лиц без гражданства, постоянно проживающих на территории Республики Беларусь.

**Т. И. Седляревич**. 90 лет истории архивных органов и учреждений Республики Беларусь.

В 2012 г. архивные органы и учреждения Республики Беларусь отмечают свое 90-летие. На протяжении всего этого времени они неукоснительно осуществляли политику государства в сфере архивного дела и делопроизводства, которая направлена на обеспечение потребителей ретроспективной информацией, необходимой для решения задач политического, экономического и культурного развития страны, стабильного и устойчивого развития общества.

В статье, приуроченной к юбилею архивных органов и учреждений страны, делается экскурс в историю архивного дела в Республике Беларусь. Рассматриваются основные этапы истории архивных органов и учреждений Республики Беларусь с 1922 г. и до наших дней, новации, вносимые каждым из этих периодов в их историю. Дается краткая аналитическая информация о сегодняшнем состоянии архивного дела в Республике Беларусь.

**Э. М. Савицкий**. Правовые основы деятельности органов местного управления и самоуправления в Республике Беларусь *(80-е годы XX — начало XXI в.)*.

В статье в историко-архивоведческом аспекте прослеживается процесс становления и развития правовой базы деятельности местных представительных и распорядительных органов, институтов непосредственной демократии за 20 лет после обретения Республикой Беларусь государственного суверенитета. Анализируются советские конституции и Конституция Республики Беларусь, законы о местном управлении и самоуправлении, акты Президента Республики Беларусь, постановления Совета Министров Республики Беларусь, кодексы Республики Беларусь и другие документы, отдельными нормами которых регулируются некоторые вопросы местных органов власти.

**Л. М. Захарова**. Взаимодействие Комитета государственного контроля Республики Беларусь с международными организациями высших контрольных органов.

Раскрывается значение финансового контроля в решении социально-экономических задач. Отражается деятельность Комитета государственного контроля Республики Беларусь как полноправного члена международных организаций финансового контроля, таких, как ИНТОСАИ, ЕВРОСАИ, Совета руководителей высших органов финансового контроля государств — участников СНГ и других, их роль в выработке международных стандартов контрольной деятельности, борьбе с легализацией доходов, полученных преступным путем, нарушениями налогового, бюджетного законодательства субъектами хозяйствования.

**А. А. Войтович**. Правовые источники по истории развития системы высшего образования в Республике Беларусь.

Статья посвящена анализу основных правовых актов как источников по истории развития системы высшего образования в Республике Беларусь. Рассматриваются ведущие тенденции развития вузовского образования в Республике Беларусь в период 1991—2010 гг. Избранная автором тема исследования актуальна в аспекте осуществляемых преобразований в системе менеджмента качества образования в Республике Беларусь.

**В. Н. Сидорцов**. Зарождение и становление кафедры источниковедения исторического факультета БГУ (1992—2001 гг.).

В статье рассматриваются факторы, определившие создание кафедры источниковедения. Концентрируется внимание на плодотворной творческой работе основателей кафедры, на ее достижениях в формировании новых направлений в развитии белорусской исторической науки и организации новых учебных дисциплин в республике. Делается вывод, что достижениями кафедры в первом десятилетии заложен прочный фундамент для ее успешной деятельности в последующие годы.

**М. Ю. Герасимович**. Фонд Брестского областного комитета бывшей КПБ как источник по истории Брестчины (1939—1991 гг.).

В статье анализируется состав и содержание документальных материалов фонда 1-п Государственного архива Брестской области за 1939—1991 гг., отложившихся в процессе деятельности Брестского обкома КПБ. Даны сведения об организации работы и структуре обкома, приводится классификация документов, в которых сосредоточена информация, отражающая буквально все аспекты истории Брестчины второй половины XX в.

**С. В. Кулинок**. Опросные листы и протоколы бесед как источник по истории партизанской разведки в 1941—1943 гг. *(по материалам фонда 1450 Национального архива Республики Беларусь)*.

Статья посвящена малоизученным документам по истории партизанского движения — опросным листам и протоколам бесед. Автор исследовал причины появления данного вида документации, его внутреннюю структуру и информативность, определил достоинства и недостатки указанного источника по истории Великой Отечественной войны, а также его место среди других документов по истории партизанской борьбы на оккупированной территории БССР.

**В. М. Матох**. Фильтрационные дела и трофейные документы на бывших военнопленных и репатриированных советских граждан как исторический источник *(по материалам фонда 1717 Государственного архива Минской области)*.

Автор анализирует состав и содержание документов фильтрационных дел, перспективы их изучения, описывает возможные методы их использования в исторических исследованиях. Показана ценность документов фонда 1717 как источника большого объема разноплановой информации генеалогического, социально-экономического и исторического характера по периоду Второй мировой войны и нацистской оккупации Беларуси—о положении на оккупированных нацистами территориях СССР, социально-экономической политике нацистской Германии, принудительной депортации населения оккупированных территорий, использовании принудительного труда в Европе в годы Второй мировой войны, о судьбах военнопленных, о работе органов госбезопасности советского государства, о вопросах памяти о Второй мировой войне в Европе и Беларуси, влиянии последствий Второй мировой войны на международные отношения

во второй половине XX — начале XXI в. Многие документы фонда имеют музейную и демонстрационную ценность.

**А. Н. Таратута**. Делопроизводство местных судебных и прокурорских органов, действовавших на территории Западной Беларуси в 1921—1939 гг.

Статья посвящена характеристике отдельных видов документов, которые создавались в деятельности судебных органов и прокуратуры, установлению норм и требований к их оформлению, а также анализу специфики работы канцелярской службы судебных органов и прокуратуры, наиболее значительных направлений ее деятельности.

Дела судебного производства представляют собой очень ценную информацию с точки зрения как документоведов, так и историков. И если для первых такие дела — это подробнейший источник по изучению порядка ведения, формирования, использования и хранения информации в судах, то для историков дела судебного производства — это всегда клад, который позволяет проследить судьбу отдельного человека через призму прошедших десятилетий.

**С. С. Рудович**. Минский Совет депутатов: начало пути (1917—1920 гг.).

В статье, приуроченной к 95-й годовщине со времени образования Минского городского Совета депутатов, рассматривается процесс его создания и основные направления деятельности в период революции и гражданской войны. Акцентируется внимание на процедуре избрания Совета первых пяти созывов, его партийном составе. Показана трансформация Минского Совета из общественно-политического формирования в государственный орган. Затрагивается вопрос о взаимоотношениях Совета с белорусским национальным движением. В приложениях к статье печатаются материалы первого номера «Известий [Минского] Совета рабочих депутатов» от 5 марта 1917 г. и другие малоизвестные источники.

**А. А. Лашкевич**. Витебское губернское жандармское управление накануне и во время революции 1905—1907 гг. *(по материалам фонда Национального исторического архива Беларуси)*.

В статье рассмотрены основные направления деятельности Витебского губернского жандармского управления в 1905—1907 гг. На конкретных примерах отражена его работа по нейтрализации революционного подполья и социального протеста. Особое внимание уделено событиям 1905—1907 гг.

**А. М. Лукашевич**. Российское оперативное планирование (январь—март 1812 г.): по материалам Российского государственного военно-исторического архива.

В статье анализируются документы российского оперативного планирования конца 1811 — начала 1812 г. Отмечается, что согласно планам весной 1812 г. российские войска должны были вступить на территорию Пруссии и Княжества Варшавского. При этом в предлагаемых вариантах предусматривалось не простое разорение территории вероятного противника с последующим отступлением, а уничтожение его армии, захват Варшавы и взятие под свой контроль линии Вислы. Безусловно, неизбежным следствием осуществления подобного оперативного плана стало бы провозглашение «Польского Королевства». В целом, изменения в расстановке политических сил в Европе к апрелю 1812 г. предопределили отказ России от проведения наступательной операции с целью «смены правительств».

**Ф. А. Некрашевич**. Участие генералов Отдельного Литовского корпуса в войне 1812 г.: по данным письменных источников.

Статья посвящена участию в войне 1812 г. генералов Отдельного Литовского корпуса (1817—1831). Данное воинское формирование комплектовалось уроженцами западных губерний и было расквартировано на территории Волынской, Гродненской и Минской губерний, а также Белостокской области. Анализируются роль генералов в победе российской армии над Наполеоном, профессиональные и личные качества, влияние кампаний 1812—1814 гг. на их дальнейшую военную карьеру. Выделяются принципы, которыми руководствовалось российское правительство, формируя высший офицерский состав корпуса. Уделено внимание уровню образованности генералов корпуса, а также их связи с тайными обществами Российской империи.

**А. Н. Латушкин**. Документальные потери Несвижского архива князей Радзивиллов в начале XIX в. (дело К. Квятковского).

В статье рассматривается проблема документальных потерь Несвижского архива князей Радзивиллов и, в частности, случай незаконного присвоения манускриптов и книг из несвижского замка библиотекарем Доминика Радзивилла К. Квятковским (1804—1810 гг.). Автором установлено место современного хранения основного комплекса рукописей — Библиотека Польской академии наук в г. Курнике, выявлены источники, позволяющие воссоздать историю перехода их на хранение в данное учреждение, определить состав комплекса, выяснить правовые аспекты дела. Приводится список обнаруженных документов.

**Л. И. Мосейчук**. Источники по истории семинарского образования униатского духовенства в Беларуси (1743—1839 гг.).

В статье анализируются источники, касающиеся истории эволюции семинарского униатского духовного образования в Беларуси в 1743—1839 гг. Выделяются две основные группы источников: опубликованные (законодательные и нормативные акты, а также документы личного происхождения) и архивные материалы. Отмечается, что основная источниковедческая база по данной теме сосредоточена в российских исторических архивах и является довольно обширной и разноплановой. Подчеркивается, что введение в научный оборот анализируемых в статье источников позволит провести реконструкцию не только отдельно взятых учебных заведений, но и проследить этапы становления и развития семинарского духовного униатского образования.

**В. В. Врублевский**. Визиты униатских храмов как источник для реконструкции повседневности крестьянства Беларуси второй половины XVIII в. *(по материалам НИАБ)*.

По материалам Национального исторического архива Беларуси (НИАБ) как источника по истории частной, общественной и хозяйственной повседневной жизни крестьянского населения исследуются визиты (акты описания) униатских храмов второй половины XVIII в. Проводится обзор историографии, отмечается источниковедческая ценность визитов.

**Г. М. Брегер, Л. А. Линская**. Архив Слуцкого Тройчанского Свято-Троицкого монастыря (документы 436—532 за 1733—1746 гг.).

Очередная публикация документов Архива Слуцкого Тройчанского Свято-Троицкого монастыря за 1733—1746 гг. освещает историю монастырей и церквей Слуцкой православной архимандрии, проблемы деятельности православной церкви в ВКЛ в данный период, взаимоотношения священников и иерархов разных конфессий и светских лиц, социально-экономическую историю поселений региона.
